ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

№3 (1002), САКАВІК, 2017
Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

Палітыка, эканоміка, культура

ISSN 0320-7544



# СВЕЖЫ ПОДЫХ ВЯСНЫ

INTERNATIONAL

The Minsk Times

Socio-political Weekly

Пра падзеі ў Беларусі і свеце

Штотыднёвік, які чытаюць у арыгінале

Не спазніцеся аформіць падпіску

Індэксы: ведамасны — 637302, індывідуальны — 63730

# ЗМЕСТ




**6** **Рух дакладна па раскладзе**

**8** **Паспець за прагрэсам** Адкрыцці, стварэнне новых тэхналогій перастаюць быць штучным таварам. Дзякуючы злуччэнню навукі і практыкі, дзяржаўнаму стымуляванню такога саюза фактычна кожная галіна мае свае бясспрэчныя дасягненні




**10** **Формула захавання энергіі**

**14** **Гульня па правілах** Шматкроп'е ў перагаворах аб далучэнні Беларусі да Сусветнай гандлёвай арганізацыі нарэшце змянілася коскай

**16** **Аднаўляльны рэсурс інтарэсаў** Размова з Кіраўніком Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Беларусі Уладзімірам Аўгусцінскім

**22** **Капіталы ў інвестыцыйнай гавані**

**26** **Калі стратэгіі супадаюць...**

**28** **Зазірнуць глыбей у нетры** Што часцей, акрамя нафты і алмазаў, знаходзяць беларускія геолагі

**30** **Дронам зверху бачна шмат** Да канца года ў Мінску пачнецца масавая вытворчасць квадракоптэраў

**34** **Маслам экспарт не сапсуеш** Паводле дадзеных Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН, Беларусь — адна з самых паспяховых краін у свеце па забеспячэнні харчовай бяспекі

**40** **Тэатр вывучае сябе** Ці патрэбна сёння тэатральная крытыка? Наколькі прэстыжная прафесія тэатразнаўцы? І што такое тэатразнаўчая навука? Пра гэта наша гутарка з кандыдатам мастацтвазнаўства, тэатральным крытыкам Тамарай Гаробчанка

**48** **Дарогі вядуць у Оршу** Старажытнаму гораду амаль дзесяць стагоддзяў. Ён стаіць на Дняпры, у які ўпадае рака Аршыца




**Беларусь. Belarus**

Штомесячны часопіс

**№ 3 (1002), сакавік, 2017**
Выдаецца з 1930 года.

**Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 8.**
Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:**
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия", ААТ "Белзнешэканамбанк"

**Рэдактар**
Віктар Харкоў

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Дызайн і вёрстка:**
Вадзім Кандрашоў
Надзея Панкратава

**"Беларусь.Belarus"** выходзіць на беларускай, англійскай, іспанскай, кітайскай і польскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **"Беларусь. Belarus"** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

**Выдавец:**
Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия".
Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а,
220013, Мінск.

Часопіс надрукаваны ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". Паліграфічная ліцэнзія №02330/106 ад 30.04.2004.
Пр-т Незалежнасці, 79,
г. Мінск, Беларусь, 220013

Падпісана ў друк 22.03.17 г.
Выпуск у свет 28.03.17 г.

Афсетны друк. Папера крэйдаваная. Фармат 60x90 1/8. Друкаваных аркушаў 7. Гарнітура Міньён.

**Заказ № 797**
**Агульны тыраж** — 2341 экз.
(на беларускай мове — 183)

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Кісялёва, 11, г. Мінск,
Беларусь, 220029.
Тэл.: +375 (17) 290-62-24,
+375 (17) 290-66-45.
Тэл./факс: +375 (17) 290-68-31.

**E-mail:** belmag@sb.by

**Падпісны індэкс** — 74820.
**Цана дамоўная.**

© **"Беларусь. Belarus"**, 2017

# Такі зменлівы свет

У свеце не стабільна. Гэта — не ўзятая з галавы выснова, а факт. Гэта міжнародная рэальнасць нават не апошніх гадоў, а цэлых дзесяцігоддзяў. І ў гэтай рэальнасці трэба мець свае выверaныя правілы паводзінаў. З папраўкай на сённяшні час, яго асаблівасці і выклікі.

У гэтай сувязі прыкметнай падзеяй стала выступленне Аляксандра Лукашэнкі на нарадзе аб актуальных пытаннях развіцця краіны, дзе нараўне з абмеркаваннем чыста ўнутрыпалітычных праблем была, без перабольшання, абазначана новая беларуская знешнепалітычная дактрына. А вынікае яна з таго сусветнага раскладу, калі на змену глабальным інтэграцыйным працэсам прыходзіць усведамленне першаснасці нацыянальных інтарэсаў. Такое заключэнне робіць Прэзідэнт Беларусі. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, новыя падыходы абумоўлены тымі зменамі ў сусветнай эканоміцы і палітыцы, якія адбываюцца апошнім часам. Усё выразней выяўляюцца новыя тэндэнцыі ў многіх краінах, пачынаючы з ЗША і Еўропы. Іх сутнасць і заключаецца ў тым, што на змену глабальным інтэграцыйным працэсам прыходзіць усведамленне першаснасці нацыянальных інтарэсаў. “Калі па-народнаму гаварыць, свет нацыяналізуецца”, — гаворыць беларускі Прэзідэнт.



У чым гэта выяўляецца? У эканамічнай сферы — у імкненні абараніць унутраныя рынкі, развіваць вытворчасць на сваіх тэрыторыях, абмяжоўваючы доступ канкурэнтам. У палітыцы ўвага больш канцэнтруецца на ўнутраных праблемах, якія набываюць усё большую вастрыню і напружанасць, пра што сведчыць усплёск пратэстных настрояў у грамадстве і рост папулярнасці правых партый і палітыкаў. “Вы бачыце, што адбываецца ў Германіі, асабліва рэльефна гэта адлюстравана ў Францыі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў”, — прыводзіць прыклады Аляксандр Лукашэнка.

Беларусі, безумоўна, трэба ўлічваць новыя міжнародныя тэндэнцыі і аператыўна на іх рэагаваць. Прэзідэнт адзначае, што праглядаюцца як станоўчыя, так і негатыўныя аспекты гэтых тэндэнцый. У цэлым арыентацыя на прыярытэтнасць нацыянальных інтарэсаў адпавядае нашым памкненням. Тут мы ідзём у рэчышчы сусветных тэндэнцый. Аднак негатыўны бок такога працэсу заключаецца ў тым, што цяпер сур’ёзна пагаршаюцца магчымасці выхаду айчыннай прадукцыі і паслуг на рынкі іншых краін, якія ўводзяць усё новыя бар’еры. І што насцярожвае, часам нават дружалюбныя, блізкія краіны гэтым таксама не грэбуюць. Вось чаму трэба смялей знаходзіць шляхі пераадолення такіх перашкод. Пры гэтым важна максімальна захоўваць традыцыйныя гандлёва-эканамічныя сувязі, шукаць новыя нішы для беларускага экспарту.

Сур’ёзныя, але своечасовыя задачы для краіны ў зменлівым глабальным свеце. Ад іх вырашэння ў значнай ступені будзе залежаць яе будучыня.

Як, зрэшты, і ад рэалізацыі іншых прынцыповых мер у кантэксце таго ж міжнароднага супрацоўніцтва. Напрыклад, агульнавядома, што Германія працяглы час была адным з вядучых гандлёва-эканамічных, як, уласна, і інвестыцыйных, партнёраў Беларусі ў Еўропе. Патэнцыйна ў такім статусе гэтая краіна разглядаецца і сёння. Нават пры ўсёй зменлівай сучаснай кан’юктурнасці інтарэсаў. Але патэнцыйны рэсурс прагматычнага супрацоўніцтва дзвюх краін захоўваецца. Пацверджаннем таму акцэнты, якія расстаўлены ў публікацыі пад назвай ***“Аднаўляльны рэсурс інтарэсаў”***.

Дарэчы, калі прадоўжыць аналогіі з Германіяй, то варта ўлічыць, што ў гэтай краіне прыярытэт даўно аддаецца прадпрымальніцтву — нямецкая эканоміка “куецца” амаль чатырма мільёнамі кампаній.

У Беларусі ў недзяржаўным сектары занята больш як мільён чалавек, гэта значыць практычна кожны чацвёрты работнік. Тым важней улічваць лепшы сусветны досвед, у законах, указах і пастановах. Усё гэта важны крок да развіцця добрасумленнай і справядлівай канкурэнцыі. Што яшчэ трэба зрабіць для фарміравання канкурэнтнай сферы — пра гэта таксама гаворыцца на старонках гэтага выпуску часопіса. Чытайце.

**ВІКТАР ХАРКОЎ**


БЕЛТА

# Ордэны і генеральскія пагоны ва ўзнагароду

**Упершыню два мерапрыемствы былі арганічна злучаныя ў адно. У мінулыя гады ўзнагароджанне ваеннаслужачых, як правіла, было прымеркавана да 23 лютага. Жанчын ушаноўвалі бліжэй да 8 Сакавіка. Але, як трапна адзначыў Аляксандр Лукашэнка, для каго яшчэ нясуць сваю ратную службу мужчыны, калі не для сваіх жонак і маці? Прыгожае атрымалася мерапрыемства ў сваёй бездакорнай логіцы, высновай яркасці і душэўнай цеплыні.**

У ліку ўзнагароджаных — 21 мама з вялікай літары. Жанчыны, якія нарадзілі і выхавалі пяцярых і больш дзяцей, удастоены ордэнаў Маці.

Што ні маці, то свая гісторыя. Светлая і жыццесцвярджальная. Хіба не гонар для мужчыны несці ім у дар мірнае неба над галавой?

Пра тое, што кожны на сваім пасту зробіць усё для мірнага жыцця сваіх блізкіх, можа сказаць, напэўна, кожны адказны мужчына. Прэзідэнт звярнуў увагу на галоўнае:

— Толькі пад мірным небам можна будаваць шчаслівае жыццё, выхоўваць дзяцей, рэалізоўваць свае таленты і здольнасці.

Узнагароджаным жанчынам Аляксандр Лукашэнка адрасаваў такія словы:

— Вы проста малайцы, вы выконваеце галоўную сваю місію. І гэта мэта ўсёй маёй палітыкі — у Беларусі павінна быць не менш за 20 мільёнаў чалавек. Вось тады мы будзем магутныя як ніколі і ніхто ў наш бок коса глядзець не будзе.

А ваенным Галоўнакамандуючы нагадаў:

— Напэўна, самая пачэсная справа — гэта атрымаць генеральскія пагоны ў прысутнасці нашых жанчын. Калі не для жанчын мы гэта ўсё робім, то для каго?

## Для бяспекі варта ўсё прадугледзець

**Беларусь прадоўжыць цеснае ўзаемадзеянне з МАГАТЭ**

Намеснік Міністра замежных спраў Валянцін Рыбакоў падчас удзелу беларускай дэлегацыі ў сесіі Савета кіраўнікоў МАГАТЭ, якая прайшла ў Вене, у сваім выступленні па пункце парадку дня "Агляд ядзернай бяспекі — 2017" адзначыў асаблівую ролю супрацоўніцтва з МАГАТЭ для ўдасканалення інфраструктуры ядзернай бяспекі ў краіне, у тым ліку, у кантэксце будаўніцтва БелАЭС. Намеснік Міністра падкрэсліў, што Беларусь прадоўжыць практыку цеснага ўзаемадзеяння з агенцтвам па пытаннях ядзернай бяспекі.

## Спакой як важнейшая каштоўнасць

**Свет мяняецца. На змену глабальным інтэграцыйным працэсам прыходзіць усведамленне першаснасці нацыянальных інтарэсаў. Пра гэта Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе аб актуальных пытаннях развіцця краіны.**

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, нарада была абумоўлена тымі зменамі ў сусветнай эканоміцы і палітыцы, якія адбываюцца апошнім часам. У эканамічнай сферы гэта праяўляецца ў імкненні абараніць унутраныя рынкі, развіваць вытворчасць на сваіх тэрыторыях, абмяжоўваючы доступ канкурэнтам. У палітыцы ўвага больш канцэнтруецца на ўнутраных праблемах, якія набываюць усё большую вастрыню і напружанасць, пра што сведчыць усплёск пратэстных настрояў у грамадстве і рост папулярнасці правых партый і палітыкаў. "Вы бачыце, што адбываецца ў Германіі, асабліва рэльефна гэта адлюстравана ў Францыі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў", — прывёў прыклады Аляксандр Лукашэнка. "Беларусь — краіна адкрытая, экспартна арыентаваная. Таму нам трэба ўлічваць новыя тэндэнцыі і аператыўна на іх рэагаваць".

Як тэндэнцыі адбіваюцца на нашай эканоміцы? Прэзідэнт адзначыў, што прагледаюцца як станоўчыя, так і негатыўныя аспекты. "У цэлым арыентацыя на прыярытэтнасць нацыянальных інтарэсаў адпавядае і нашым памкненням — гэта факт. Тут мы ідзём у рэчышчы сусветных тэндэнцый", — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Аднак негатыўны бок такога працэсу, на думку Прэзідэнта Беларусі, заключаецца ў тым, што цяпер сур'ёзна пагаршаюцца магчымасці выхаду нашай прадукцыі і паслуг на рынкі іншых краін, якія ўводзяць усё новыя бар'еры.

# Канкрэтны вынік сяброўскага ўзаемадзеяння

## Адбыўся афіцыйны візіт Прэзідэнта Грузіі Георгія Маргвелашвілі ў Беларусь

У красавіку 2015 года падчас візіту Прэзідэнта Беларусі ў Грузію кіраўнікі дзвюх краін вызначылі бліжэйшую мэту для развіцця дзелавога ўзаемадзеяння — тавараабарот у 200 мільёнаў долараў. Двухбаковы гандаль на той момант быў больш чым сціплы, і вызначаны арыенцір бачыўся даволі значным. Работа Аляксандра Лукашэнкі ў Тбілісі, а затым у Батумі, правядзенне сумеснага бізнес-форуму сталі каталізатарам узаемных памкненняў да супрацоўніцтва. Тавараабарот прыкметна пайшоў у рост: за мінулы год прыбавіў 63 працэнты. Для перыяду глабальнай эканамічнай нестабільнасці, калі падаюць усе рынкі свету, гэта вельмі вялікі паказчык. Але ўсё ж да дасягнення абазначанай мэты пройдзена прыкладна палова шляху. Аляксандр Лукашэнка сказаў пра гэта, прымаючы ў Палацы Незалежнасці Прэзідэнта Грузіі. Тэмп узяты добры. Афіцыйны візіт у адказ Георгія Маргвелашвілі павінен адыграць не меншую стымулюючую ролю для ўмацавання сфарміраванай пазітыўнай тэндэнцыі.

Яшчэ на перагаворах у Тбілісі было відаць, што паміж прэзідэнтамі дзвюх краін усталяваліся даволі цёплыя і даверныя адносіны. Яны адкрыта абмяркоўвалі існуючыя праблемы. Як унутраныя, так і вядзення двухбаковага дыялогу ў кантэксце працэсаў, якія адбываюцца на сусветнай арэне. Адкрытасць гутаркі Аляксандр Лукашэнка адзначаў пасля перагавораў у вузкім фармаце і гэтым разам. Перш чым выйсці да членаў дэлегацый, кіраўнікі дзвюх краін гаварылі сам-насам больш за тры гадзіны. І да фармату пашыранага ўжо ў асноўным вызначыліся з напрамкамі супрацоўніцтва, якія трэба развіваць.

Напэўна, самае вялікае поле для сумеснай работы — грузінская сельская гаспадарка. Тут спрыяльны клімат, урадлівая зямля, працавітыя людзі. Не хапае тэхнічнага і тэхналагічнага падмацавання жадання больш эфектыўна працаваць на зямлі. Георгій Маргвелашвілі праблем не ўтойваў. Каля 50 працэнтаў насельніцтва краіны лічыцца занятым у сельскай гаспадарцы. Але гэта афіцыйная статыстыка, якая, на жаль, адрозніваецца ад рэалій. У адваротным выпадку аграрны сектар даваў бы не 9 працэнтаў ВУП краіны, а значна больш. І імпарт харчавання Грузіяй не быў бы такім важкім, як цяпер. Вось на ўхіленне гэтага дысбалансу сёння і нацэльваецца кіраўніцтва краіны.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў калегу: усім, што грузінскія сябры ўбачаць у Беларусі для сябе карысным, мы адназначна падзелімся. Гэта і досвед

> Аляксандр Лукашэнка:
>
> ***Грузія з'яўляецца важным і перспектыўным партнёрам Беларусі ў Закаўказзі. Дыпламатычныя адносіны паміж нашымі краінамі, усталяваныя больш за дваццаць гадоў таму, адрозніваюцца высокай ступенню даверу і ўзаемаразумення. Наша ўзаемадзеянне набрала добрыя абароты па ўсіх напрамках. Мы маем намер і ў далейшым актыўна працаваць з роднай і дружалюбнай нам Грузіяй***

стварэння і арганізацыі работы высокаэфектыўных сельскагаспадарчых вытворчасцяў, і тэхнічнае забеспячэнне іх функцыянавання. Тут маецца на ўвазе нарошчванне паставак неабходнай сельскагаспадарчай тэхнікі з наступным стварэннем яе зборачных вытворчасцяў і сэрвісных цэнтраў на месцы. Мэтазгодна задумацца і пра су-


БЕЛТА

Георгій Маргвелашвілі і Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы ў Мінску

месную перапрацоўку дарункаў паўднёвых палёў. Прэзідэнт сказаў, што для гэтага будуць стварацца самыя выгадныя ўмовы для дзейнасці грузінскага бізнесу ў нашай краіне. А ў Грузіі беларускія спецыялісты гатовыя ўдзельнічаць у праектах мадэрнізацыі ліфтавага абсталявання жылых дамоў, будаўніцтве лядовай арэны і біятлоннага стадыёна на гарналыжным курорце “Бакурыяні”, абнаўленні парку камунальнай тэхнікі, шыць форму і пастаўляць харчаванне сілавым структурам.

Пунктаў супадзення інтарэсаў шмат. Прэзідэнт Грузіі сказаў, што ўсе напрамкі, пра якія гаварыў яго беларускі калега, для Тбілісі цікавыя. А дух міждзяржаўнага дыялогу становіцца гарантыяй паспяховай рэалізацыі задуманага.

Ва ўзаемадзеяння Мінска і Тбілісі ёсць адна яркая і відавочная асаблівасць. У знешнепалітычным кантэксце нашы краіны выбралі для сябе за галоўныя розныя вектары. Грузія робіць асноўную стаўку на еўрапейскую інтэграцыю, мы — на еўразійскую. Але, як відаць, гэта нікольki не перашкаджае весці прадметны дыялог аб двухбаковым супрацоўніцтве. І ў гэтым самы пераканаўчы доказ важнага тэзіса, на які падчас перагавораў звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Дзве краіны не сябруюць супраць кагосьці. Аднак, маючы ўласныя нацыянальныя інтарэсы, дзейнічаюць адпаведным чынам. Нікому не перашкаджаючы. Паважаючы выбар адзін аднаго. Разумеючы і прызнаючы разнастайнасць шляхоў развіцця і выключнасць суверэннага права дзяржаў на выбар для сябе найбольш прыдатнага. Калі ў аснове міждзяржаўнага дыялогу ляжаць узаемнае разуменне і павага, развіццё яго, можна не сумнявацца, заўсёды будзе змястоўным.

Відавочным стала выснова, што супрацоўніцтва Беларусі і Грузіі набрала добрыя абароты па ўсіх напрамках. Пра гэта Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ па выніках перагавораў з Прэзідэнтам Грузіі Георгіем Маргвелашвілі.

“Грузія з’яўляецца важным і перспектыўным партнёрам Беларусі ў Закаўказзі. Дыпламатычныя адносіны паміж нашымі краінамі, усталяваныя больш за дваццаць гадоў таму, адрозніваюцца высокай ступенню даверу і ўзаемаразумення, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Наша ўзаемадзеянне набрала добрыя абароты па ўсіх напрамках. Мы маем намер і ў далейшым актыўна працаваць з роднай і дружалюбнай нам Грузіяй”.

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што адкрыццё беларускага пасольства ў Тбілісі, якое адбылося ў снежні мінулага года, будзе спрыяць далейшаму ўмацаванню супрацоўніцтва. “Апошнім часам адзначаецца актывізацыя кантактаў па лініі ўрадаў, рэгіёнаў, прадпрыемстваў. Практычна кожны месяц адбываецца ўзаемны абмен дэлегацыямі па самых розных напрамках. І, галоўнае, такое цеснае ўзаемадзеянне дае сёння канкрэтны вынік у гандлёва-эканамічнай сферы”, — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў гатоўнасць беларускага боку да далейшага развіцця супрацоўніцтва з Грузіяй па шырокім коле напрамкаў. У іх ліку сфера АПК, праектаванне і будаўніцтва спартыўных аб’ектаў, пастаўкі рознай беларускай тэхнікі і прадукцыі лёгкай прамысловасці, стварэнне сумесных прадпрыемстваў, развіццё ўзаемадзеяння ў гуманітарнай сферы і турызме. “Вы ніколі не былі для нас чужымі і не будзеце. Усё, што мы можам рабіць, увесь наш досвед да вашых паслуг”, — заявіў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу Прэзідэнт Грузіі адзначыў, што на перагаворах бакі разгледзелі цэлы шэраг пытанняў, якія накіраваны на інтэнсіфікацыю беларуска-грузінскіх узаемаадносінаў. Гэта, у прыватнасці, сферы гандлю, супрацоўніцтва ў турызме, сферах культуры, адукацыі ды іншых галінах.

“Мяне радуе, што Беларусь і ў будучыні будзе паглыбляць узаемаадносіны з Грузіяй і выкарыстоўваць увесь той патэнцыял, які існуе паміж нашымі народамі, каб забяспечыць рост дабрабыту”, — падкрэсліў Прэзідэнт Грузіі.

Георгій Маргвелашвілі таксама падзякаваў беларускаму боку за ўстойлівую падтрымку Грузіі і запэўніў, што двухбаковыя адносіны будуць паглыбляцца і ў будучыні.

Васіль **Харытонаў**

# Рух дакладна па раскладзе



Зборка цягнікоў для Грузіі

**Апошнія два гады для ЗАТ "Штадлер Мінск" наўрад ці былі лёгкімі: знешнія крызісы адбіліся на прадпрыемстве даволі моцна. Замежныя заказчыкі часткова адмаўляліся ад сваіх абавязацельстваў, вытворчыя магутнасці былі загружаны на 30-40 працэнтаў. Тым не менш кампанія знайшла рашэнні, якія далі магчымасць захаваць усіх супрацоўнікаў і дыверсіфікаваць экспарт. Новы, 2017 год на сучасным прадпрыемстве ў Фаніпалі сустрэлі з аптымізмам: ёсць новыя заказы, колькасць працоўных месцаў будзе расці, а сярэдняя зарплата ўжо істотна перавышае пяцьсот долараў у эквіваленце.**

Пераход на няпоўны працоўны дзень, скарачэнні штату — да такіх непапулярных мер у 2015-2016 гадах звярталіся многія вытворцы, каб знізіць выдаткі. На заводзе ў Фаніпалі хоць і перажывалі складаны час, калі магутнасці былі загружаны на трэць, такім рэцэптам не скарысталіся. Цяпер тут занята 440 чалавек, у бягучым годзе іх агульная колькасць перавысіць 500.

Дырэктар "Штадлер Мінск" Філіп Брунер расказаў пра стратэгію кампаніі:

— Мы знайшлі людзям работу ў іншых краінах: на 2-6 месяцаў адпраўлялі беларускіх супрацоўнікаў на заводы канцэрна Stadler Rail Group у Германіі, Польшчы, Венгрыі. Другі крок — дыверсіфікацыя заказу, гэта даволі спецыфічная мера. Цяпер мы выконваем тут нарвежскі праект: збіраем кузаў, часткова робім афарбоўку і мантаж, а далейшую дапрацоўку прадоўжаць ужо на заводах у Еўропе. Акрамя гэтага, вырабляем элементы для нямецкіх партнёраў. Усё гэта дае магчымасць загрузіць вытворчасць.

Сёння на "Штадлер Мінск" працягваюць работу над электрацягнікамі для расійскага "Аэраэкспрэса". Нагадаем, у свой час кампанія заказала 25 цягнікоў, аднак з-за дэвальвацыі расійскага рубля не змагла справіцца з абавязацельствамі і скараціла заказ да 11 саставаў. Пяць з іх ужо знаходзяцца ў Маскве.

— Некаторыя пытанні яшчэ трэба вырашыць, але кліент плаціць — а гэта вельмі важна, гэта вялікі поспех для нашага супрацоўніцтва, — гаворыць Філіп Брунер.

Цяпер асноўны заказ — 23 трохсекцыйныя трамваі з серыі "Мяцеліца" для Санкт-Пецярбурга. Пакуль гэта толькі першая серыя, на прадпрыемстве спадзяюцца, што з'явяцца і дадатковыя праекты. А вось што датычыцца супрацоўніцтва з Расійскай чыгункай, якая запланавала сур'ёзныя абнаўленні інфраструктуры, Філіп Брунер прызнаецца:

— У нас ёсць канкурэнтны прадукт, які мы можам прапанаваць па добрай цане, мы гатовыя папрацаваць таксама над чым-небудзь новым, гатовыя ўдзельнічаць у тэндарах. Але варта разумець: расійскі рынак даволі закрыты для еўрапейскіх вытворцаў, нават калі прадпрыемства і знаходзіцца ў Беларусі.

А вось з іншым партнёрам — Беларускай чыгункай — супрацоўніцтва прадоўжыцца. Нядаўна ішла размова пра пастаўку двух дадатковых цягнікоў, іх павінны заказаць ужо сёлета, яшчэ тры цягнікі — у 2018-м.

— Пакуль ідзе работа над папяровымі пытаннямі, але мы лічым, што заказ будзе рэалізаваны, мы гатовыя зрабіць добрую прапанову, — дадае Брунер.



Дарэчы, пра добрую прапанову. Часцяком усё ўпіраецца ў грошы, і асноўная прычына, па якой заказчыкі не спяшаюцца набываць прадукцыю “Штадлер Мінск”, — даволі высокая цана. Аднак на заводзе лічаць: яна апраўданая. Прадукцыя, тэрмін службы якой 30-50 гадоў, не може быць таннай.

— Мы гатовыя знізіць цану не на шкоду якасці, — гаворыць Філіп Брунер, — але трэба разумець: чым таннейшая атрымліваецца прадукцыя, тым даражэйшае абходзіцца тэхабслугоўванне і капітальны рамонт. А гэта ўсё адчуваюць і пасажыры. Таму наш сакрэт — як знайсці з кліентам самае аптымальнае рашэнне. Прапаноўваем канкурэнтныя цэны, і, напрыклад, тэндар на пастаўку цягнікоў для Мінскага метрапалітэна мы выйгралі за кошт цаны. Наогул, кошт непасрэдна залежыць ад тэхнічнай складанасці і характарыстык заказу.

Калі гаварыць пра беларускі складнік у агульным аб’ёме гатовай прадукцыі “Штадлер Мінск”, ён пакуль не вельмі вялікі. Паміж тым “Белкамунмаш” з’яўляецца пастаўшчыком асобных элементаў кузава для трамвая “Мяцеліца”. На прадпрыемстве прызнаюцца, што гатовыя працаваць з любым пастаўшчыком. І радуе той факт, што беларускія вытворцы гатовыя прапаноўваць канкурэнтаздольную прадукцыю не толькі па цане, але і па якасці, а таксама тэрмінах пастаўкі.

— Мы даём магчымасць “Белкамунмашу” прапанаваць прадукт і для нашага заказу для Мінскага метро, але хочам, каб адносіны былі рынкавымі, — дадае Брунер.

Паліна **Канога**

## Сказана



**■ Паводле слоў дырэктара кампаніі Філіпа Брунера, высокія прафесійныя кампетэнцыі дазваляюць супрацоўнікам атрымліваць добры даход. Веданне замежных моў, сертыфікаты, якія даюць права работы на вытворчасці з еўрапейскімі нормамі, высокая прадукцыйнасць працы супрацоўнікаў даюць магчымасць зарабіць.**

# Паспець за прагрэсам

**Адкрыцці, стварэнне новых тэхналогій перастаюць быць адзінкавым таварам. Дзякуючы злучэнню навукі і практыкі, дзяржаўнаму стымуляванню такога саюза фактычна кожная галіна мае свае бясспрэчныя дасягненні. І дзе тыя дакладныя шалі, што адназначна пакажуць, якія з іх больш каштоўныя для краіны? Усе неабходныя. Але ўсё ж вылучыць і падтрымаць асабліва прыкметныя вынікі — вельмі важна.**

Знаёмства Прэзідэнта з работамі, прадстаўленымі на суісканне дзяржпрэмій, адбылося ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры трансплантацыі органаў і тканак.

Месца выбрана не выпадкова. Калектыў, узначалены Алегам Румо, прызнаны ў тым ліку і навуковай супольнасцю, фаварыт гэтага спаборніцтва. Але гэта ніколькі не прыніжае важнасці распрацовак у іншых галінах. У тым і складанасць выбару. На самай справе, як супаставіць трансплантацыю з нафтаздабычай? Пра работу спецыялістаў "БелНДПІнафта" скажу толькі ў дзвюх лічбах. Патрачана на яе 27 тысяч долараў, а эфект ужо перавысіў 57 мільёнаў, і ў практыку яна ўкараняецца ўсё шырэй.

Напэўна, даўжэй за ўсё Аляксандр Лукашэнка затрымаўся ля стэнда Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, знаёмячыся з вынікамі археалагічных даследаванняў. А яны пераканаўча даказваюць, што вытокі беларускай дзяржаўнасці сягаюць не менш чым у IX стагоддзе. Нашы продкі на полацкай зямлі закладвалі асновы жыцця для будучых пакаленняў без старонняй дапамогі, па ўласным мудрым разуменні. Наколькі важнае гучанне гэтае адкрыццё мае сёння — і гаварыць лішні раз не прыходзіцца. Менавіта таму Прэзідэнт раіць новыя веды ўключыць і ў адукацыйны працэс. Бо яны адкрываюць больш шырокія далягляды разумення таго, хто мы і адкуль ідзём.

Сувязь, тэхніка, селекцыя, будаўніцтва, мікраэлектроніка... Пра кожны з прадстаўленых на імправізаванай выставе праект можна напісаць паўнацэнны навукова-папулярны нарыс. Прыслухоўваючыся да зносінаў Прэзідэнта з навукоўцамі і вытворцамі, у блакноце я пазначыў некалькі тэзісаў, якія падаліся найбольш важнымі. Аляксандр Лукашэнка адназначна патрабуе персаналізацыі дасягненняў. Не размываць заслугу даследавання на вялікі калектыў на чале з менеджарам. У кожнага адкрыцця ёсць імя і прозвішча. Гэта значыць чалавек, які вылучыў ідэю першапачаткова і натхніў на яе ажыццяўленне астатніх. Сваёй Адміністрацыі і Ураду Прэзідэнт даручыў уважліва прааналізаваць работу па тэмах, ужо адзначаных дзяржпрэміямі раней. Ці працягваюць яны даваць вынік? Ці не згубіліся? Ну а цяпер і ў будучыні галоўнае — аб'ектыўнасць ацэнак. Плюс стварэнне сістэмы заахвочвання тых, хто на прэмію прэтэндаваў, але саступіў лідарам у малым. Каштоўнасць іх дасягненняў відавочная, і людзі павінны гэта адчуваць. Тым больш кожнае з іх у канчатковым выніку служыць усяму грамадству.

Гэтая лінія выразна ўлоўлівалася падчас другой часткі мерапрыемства — знаёмства Аляксандра Лукашэнкі з работай РНПЦ. Калі шчыра, цэнтр — і яго дзецішча. Алег Румо некалі вылучыў ідэю, здолеў яе прафесійна



ЮРЫЙ МАЗАЛЕЎСКІ

У Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры трансплантацыі органаў і тканак

развіць, але было б гэта магчыма без прамой падтрымкі Прэзідэнта? Пытанне. Але ж колькі было дыскусій: ці варта пры досыць абмежаваных магчымасцях трансплантагогіі для масавага прымянення? Праведзеныя тры з паловай тысячы перасадак — адказ. Зрэшты, тут кожны выпадак унікальны. Вось па калідоры прабег хлапчук, быццам з маторчыкам. Пару месяцаў ад роду ён меў няшмат шанцаў на жыццё з прыроджаным цырозам печані. Сёння, праз год, бацькі ледзь паспяваюць за шустрым малышом. У Марыны Ананіч таксама была складаная прыроджаная хвароба. Шанц на паўнацэннае жыццё дала перасадка ныркі і печані. Ды яшчэ якое паўнацэннае. Марына — шчаслівая маці трохмесячнага Ягора. Ліяне Буйнавец быў год і восем, калі, атруціўшыся белай паганкай, яна фактычна засталася без печані. Цяпер першакласніца адчувае сябе такой жа шчаслівай дзяўчынкай, як і яе аднагодкі. А з Мікалаем Сяргеенкавым Аляксандр Лукашэнка сустрэўся ўжо ў другі раз. Упершыню пры адкрыцці цэнтра, калі аднагадоваму малышу зрабілі першую ў Беларусі роднасную перасадку печані. Падрослы пацыент адчувае сябе добра, але сароміецца. А ў клініку прыехаў з плюшавым мядзведзем, падораным Прэзідэнтам пры першай сустрэчы. Гэта яго шчаслівы талісман.

Слава пра беларускіх трансплантолагаў ужо выйшла за межы краіны. Вось у адной палаце пацыенты з Казахстана і Украіны. Кумарбеку Каравулаву першую перасадку зрабілі на радзіме. Няўдала. У Мінску сітуацыю паправілі. А ў Івана Працэнкі і зусім не было магчымасці зрабіць патрэбную аперацыю дома. У Беларусі, ён лічыць, у свой 41 год нарадзіўся другі раз...

Гледзячы ў шчаслівыя вочы пацыентаў, якія атрымалі шанц жыць, бацькоў выратаваных дзяцей, разумееш, што нездарма трансплантагогіі было нададзена столькі ўвагі на дзяржаўным узроўні. А які гэта магутны імпульс для развіцця медыцыны ў цэлым. Некаторыя распрацоўкі РНПЦ ужо знаходзяць прымяненне ў масавай клінічнай практыцы. А наогул, гэта навука будучыні. Навукоўцы ва ўсім свеце сёння працуюць над праблемай вырошчвання цэлых органаў. Падаецца фантастыкай? Так і складаныя перасадкі ў Беларусі яшчэ некалькі гадоў назад бачыліся нерэальнай казкай.

Навуковы прагрэс па планеце не ідзе — ляціць на шалёнай хуткасці. І айчынная навука ад гэтай гонкі зусім не адстае. Парукай таму прадстаўленыя работы на суісканне Дзяржаўных прэмій. Развітая навуковая сфера — важны элемент моцнай дзяржавы, якая робіць такім усё грамадства. Так што ў некаторым сэнсе і ў дасягненнях Алега Румо ёсць уклад кожнага грамадзяніна краіны, хто сумленна працуе, плаціць падаткі і сваім адказным стаўленнем да гэтай сваёй місіі робіць краіну больш моцнай.

Дзмітрый **Крат**



# Формула захавання энергіі

**Бываючы ў камандзіроўках, усё часцей бачу ў рэгіёнах новыя ветраўстаноўкі. Іх вялізныя лопасці, якія верцяцца, кідаюцца ў вочы здалёк. Цяпер ствараюцца новыя ветрапаркі на Гродзеншчыне і Міншчыне. Ды і сонечных электрастанцый у нас становіцца ўсё больш. Але ўсё гэта кропля — не, нават не ў моры — у акіяне. У Еўропе лідарам па выкарыстанні аднаўляльнай энергетыкі лічыцца Данія. Там больш за 40 працэнтаў усёй электраэнергіі генерыруецца толькі за кошт ветру. Што ж нам перашкаджае рухацца хутчэй? Якія планы на бліжэйшую будучыню? Гэтыя пытанні абмяркоўвалі за “круглым сталом” парламентарыі, прадстаўнікі міністэрстваў, навукоўцы.**



НАДЗЕЯ ПАНКРАТАВА

Многія даволі скептычна ацэньваюць развіццё аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ) у нашай краіне. Маўляў, і вятроў у нас няма, і сонца свеціць мала. Але разлікі спецыялістаў бясспрэчныя. Патэнцыйная эфектыўнасць выкарыстання сонечных батарэй у Беларусі амаль на 20 працэнтаў вышэйшая, чым у Германіі, Бельгіі, Даніі, Вялікабрытаніі. І вецер у нас ёсць. Проста чалавек мяркуе пра яго сілу з узроўню зямлі. А для ветраэнергетыкі важныя замеры на вышыні ад 50 да 150 метраў. І там карціна зусім іншая. Аказваецца, па ўзроўні ветравога патэнцыялу Беларусь набліжаецца да Польшчы ды іншых краін ЕС. Аднак па магутнасці ветравых установак мы адстаём ад палякаў у сто з лішнім разоў.

Адсутнасць уласных інавацыйных распрацовак і механізма субсідавання з боку дзяржавы не садзейнічае пашырэнню АКЭ. У нас, напэўна, не цалкам ацанілі ролю той жа ветраэнергетыкі. Таму квота на яе развіццё ў 2017-2019 гадах складае ўсяго 11 МВт. Гэтага відавочна недастаткова для прыцягнення буйных інвестыцый. Спасылкі на дарагоўлю праектаў, іх працяглую акупляльнасць няслушныя.

— Лічбы гавораць самі за сябе. Калі ў 2004 годзе ў праекты аднаўляльнай энергетыкі дзяржавы інвеставалі 60-70 мільярдаў долараў, то сёння выйшлі ўжо на 300-350 мільярдаў. Гэта вядзе да развіцця тэхналогій і патаннення кошту такой энергіі, — робіць выснову старшыня парламенцкай Камісіі па прамысловасці, ПЭК, транспарту і сувязі Андрэй Рыбак. — Прычым з улікам патэнцыялу нашай навукі

*Тэхнічны патэнцыял развіцця аднаўляльных крыніц энергіі ў Беларусі ацэньваецца ў **80** мільёнаў тон умоўнага паліва, што перавышае агульны аб'ём спажывання энергарэсурсаў у краіне. Да 2020 года доля вытворчасці энергіі з аднаўляльных крыніц павінна скласці не менш за шэсць працэнтаў*

і машынабудавання мы маглі б самі распрацоўваць многія рэчы, рабіць абсталяванне, сілавыя ўстаноўкі ды экспартаваць іх. Гэта вельмі вялікія грошы і вялікія магчымасці.

Дэпутата падтрымаў начальнік упраўлення Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей Заўялаў:

— У краіне амаль 400 тысяч гектараў плошчаў, якія могуць быць заняты пад сонечныя станцыі. Так, гэта дарага, але тэхналогіі за дзесяць гадоў настолькі зрабілі крок наперад, што акупляльнасць гэтых установак знізілася з 15 да 5 гадоў. Гэта дазваляе нам адмовіцца ад павышаных каэфіцыентаў, якія краіна плаціць інвестарам за ўкараненне АКЭ. Яны могуць быць акупляльныя і пры больш нізкіх тарыфах.

Выканаўчы дырэктар асацыяцыі "Аднаўляльная энергетыка" Уладзімір Нісцюк паставіў у аснову пытанне экалогіі:

— Напрыклад, толькі адзін ветрагенератар магутнасцю 1 МВт дае магчымасць штогод скарачаць выкіды вуглякіслага газу на 1.800 тон. Увесь свет ідзе па гэтым шляху, мы толькі стартавалі. І калі дзяржава, бізнес, навука, грамадзянскае грамадства разам будуць вырашаць гэтую задачу, мы яе вырашым.

Яўген **Кананові**ч

# Паляванне за тэхналогіямі

**Тая краіна, якая сёння атрымае поспех у інавацыях, заўтра можа разлічваць на якасны рост эканомікі. У гэтым і заключаецца асаблівая значнасць зацверджанай Прэзідэнтам Дзяржпраграмы інавацыйнага развіцця краіны на 2016-2020 гады**

Цікавая навіна абляцела ўсе сусветныя інфармагенцтвы. Федэральны суд Даласа абавязаў Facebook заплаціць паўмільярда долараў па справе аб крадзяжы тэхналогій. Іск падала адна з кампаній, якая сцвярджае, што яе раннія распрацоўкі былі скапіраваны Oculus для вытворчасці акуляраў віртуальнай рэальнасці. Цікавая тут не столькі сума штрафу. Сам па сабе той факт, што такая салідная сусветная карпарацыя, як Facebook, не супраць прысвоіць чужыя ідэі нават пад рызыкай апынуцца ў судзе, сведчыць пра тое, наколькі вялікая роля высокіх тэхналогій для паспяховай канкурэнцыі на рынку.

Стаўкі нерэальныя. Тая краіна, якая сёння атрымае поспех у інавацыях, заўтра можа разлічваць на якасны рост эканомікі. У гэтым і заключаецца асаблівая значнасць зацверджанай Прэзідэнтам Дзяржпраграмы інавацыйнага развіцця краіны на 2016-2020 гады.

— У аснове нашай эканамічнай стратэгіі павінна быць паскоранае развіццё высокатэхналагічных сектараў. Гэта інфармацыйна-камунікацыйныя і авіякасмічныя тэхналогіі, атамная энергетыка, бія- і нанаіндустрыя, фармацэўтыка, прыборабудаванне і электронная прамысловасць. І ўсе перспектыўныя распрацоўкі трэба неадкладна ўкараняць у вытворчасць, — каменціруе эканаміст Аляксей Бяляеў. — У свеце ўжо пачалася Чацвёртая прамысловая рэвалюцыя. Яе асноўныя элементы — робататэхніка, аўтаматызацыя сферы паслуг, 3D-прынтынг, лічбавая індустрыя. Беларусь традыцыйна моцная ў IT-сферы, і тут нам ні ў якім разе нельга здаваць пазіцыі. Усё гэта забяспечыць імпульс іншым галінам эканомікі.

*Дзякуючы Дзяржпраграме краіна атрымае да 2020 года звыш **70** высокадаходных вытворчасцяў, арыентаваных на экспарт, і каля дзевяці тысяч новых працоўных месцаў*

Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях расказаў пра найбольш значныя праекты новай дзяржпраграмы. Сярод іх вытворчасць оптаэлектроннай тэхнікі на базе цеплавізійных, лазерных сістэм Мінскага завода імя Вавілава, укараненне новых тэхналогій вытворчасці мікрасхем на "Інтэграле", выраб малалітражных дызельных рухавікоў на Мінскім маторным заводзе і будаўніцтва акумулятарнага завода ў Брэсцкай вобласці, узвядзенне новага азотнага комплексу на "Гродна Азот". У Інстытуце мікрабіялогіі з'явіцца доследна-прамысловая вытворчасць ферментаў для атрымання лекавых субстанцый і найноўшых дыягнастычных сродкаў. Гэта толькі частка задач, якія трэба вырашаць у бліжэйшыя гады.

# Прыярытэты для маладых



БЕЛТА

**Цяперашні год аб'яўлены ў нас Годам навукі. Галоўная мэта — павышэнне яе ролі ва ўсіх сферах жыцця краіны, фарміраванне міжнароднага іміджу Беларусі як краіны з высокім узроўнем інтэлектуальнага і чалавечага капіталу. Вялікія надзеі ўскладаюцца на новае пакаленне. Штогод толькі ў акадэмічную навуку прыходзіць да 400 "навабранцаў". Ці лёгка ў наш час быць маладымі навукоўцамі? Што неабходна зрабіць для таго, каб яны адчувалі сваю запатрабаванасць і працавалі з максімальнай аддачай?**

Пытанне аб тым, ці лёгка быць маладым у прынцыпе і навукоўцам у прыватнасці, рытарычнае. Вядома, у пачатку шляху заўсёды сустракаюцца цяжкасці. Пытанне ў тым, ці настроены ты на іх пераадоленне і наколькі сур'ёзна. Але ў тым, што гэта магчыма, я абсалютна ўпэўнены. У Нацыянальнай акадэміі навук 2200 маладых навукоўцаў — гэта больш за чвэрць навуковых кадраў. Такую колькасць, як вы разумееце, проста немагчыма ігнараваць або не ўлічваць іх інтарэсы. Падкрэслю, што многія маладыя навукоўцы займаюцца глыбокімі фундаментальнымі даследаваннямі на вельмі сур'ёзным узроўні, з'яўляюцца кіраўнікамі лабараторый, вядучымі навуковымі супрацоўнікамі інстытутаў.

Нельга адмаўляць, што ў сучасным свеце вялікае значэнне мае матэрыяльнае стымуляванне — усе без выключэння хочуць мець высокія зарплаты. Безумоўна, гэта вельмі важна і для маладых навукоўцаў. У сувязі з гэтым даводзіцца чуць нараканні аб тым, што, маўляў, у СССР навуковая галіна цалкам фінансавалася дзяржавай. Але важна разумець, што, па-першае, у вялікай краіны былі зусім іншыя магчымасці, а па-другое, сёння ўжо нідзе не існуе такой практыкі. Сучасны навуковец — не проста спецыяліст у той ці іншай галіне, а яшчэ і менеджар, чалавек, які дакладна арыентуецца ў прыярытэтных напрамках сусветных навуковых даследаванняў. І вось менавіта гэтых ведаў не хапае моладзі. На вялікі жаль, у ВНУ вучаць прадметам, але не таму, як працаваць.

Дапамагчы ў гэтым пытанні павінен унікальны праект "Малады навуковец "пад ключ", які Савет маладых навукоўцаў НАН пачне рэалізоўваць сёлета ў рамках больш маштабнага праекта — "Маладая акадэмія". Гэта будзе цыкл навучальных лекцый, якія дапамогуць учарашняму студэнту зразумець, як працуе навуковая сістэма на дзяржаўным узроўні, у якім напрамку асабіста ён можа і павінен рухацца. Важна даць моладзі інфармацыю пра ўладкаванне самой сістэмы навуковых даследаванняў, навуковыя прыярытэты краіны і НАН, сістэму дзяржаўнага фінансавання навуковых даследаванняў і навукова-тэхнічных работ. Прадугледжаны навучальныя семінары па напісанні артыкулаў, правільнай прэзентацыі работ і дасягненняў. Акрамя таго, пройдуць заняткі па тайм-менеджменце — як чалавеку, які толькі прыйшоў у аспірантуру, размеркаваць свой час, каб у тэрмін падрыхтаваць дысертацыю, каб не паўтараць чужыя памылкі, а ісці сваім шляхам. Абавязкова будзе курс лекцый, прысвечаных магчымасцям атрымання грантаў для кароткатэрміновых стажыровак, карыстання ўнікальным абсталяваннем, для выезду на міжнародныя навуковыя канферэнцыі і сімпозіумы, школы маладых навукоўцаў, каб можна было задзейнічаць "знешні фінансавы рэсурс" для падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі.

Як я ўжо гаварыў, цяпер навуковец (калі ён, вядома, хоча дасягнуць поспеху) павінен арыентавацца ў шматлікіх рэчах. Каб ён не займаўся тым, што цікава толькі яму, а працаваў па зацверджаных прыярытэтных напрамках, якія ёсць у нас у краіне і ў сусветнай навуцы. Каб разумеў, якія існуюць крыніцы фінансавання (унутрырэспубліканскія і знешнія)



і як іх можна выкарыстаць. Аднак важна не толькі даць інфармацыю, але і прадэманстраваць практычныя прыклады. Таму мы падключым не толькі старэйшых калег, якім ёсць што расказаць, але і маладых навукоўцаў, якія ўжо прайшлі пэўныя прыступкі — і паспяховай падрыхтоўкі публікацыі ў высокарэйтынгавых міжнародных часопісах, і атрымання грантаў на даследаванні.

Мне падаецца, што менавіта прыклад людзей, якія не моцна адрозніваюцца ва ўзросце, асабліва важны. Калі да цябе падыходзіць масціты акадэмік са словамі: "Упарта працуйце, малады чалавек, і заўтра вас чакае поспех", — можна падумаць, што гэта самае "заўтра" гарантавана наступіць толькі гадоў у 80. Але калі гэта будзе практычна равеснік — зусім іншы вынік. Ён скажа: "Я дамогся поспеху, знаходзячыся першапачаткова на такіх жа пазіцыях, як і ты". Галоўнае, каб учарашні студэнт зразумеў: грошы і поспех не падаюць з неба, яны дастаюцца цяжкай, упартай працай. Але поспех магчымы, і гэта ўжо можа быць заўтрашні дзень, а не нейкая аддаленая перспектыва.

У навуцы можна працаваць і мець пры гэтым жаданы матэрыяльны дастатак. Але проста падняўшы заработную плату або зрабіўшы яшчэ што-небудзь у тым жа духу, можна аказаць хіба што мядзведжую паслугу. Правільна гаворыцца: "Дай чалавеку рыбу, і ён будзе сыты адзін дзень. Навучы чалавека лавіць рыбу, і ён будзе сыты ўсё жыццё".

Андрэй **Іванец,**
старшыня Савета маладых навукоўцаў НАН,
кандыдат хімічных навук, дацэнт,
намеснік дырэктара па навуковай рабоце
Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі

# Прафесія застаецца прэстыжнай

**Каля 65 працэнтаў моладзі цікавяцца навукай і апошнімі навуковымі дасягненнямі. А кожны пяты калі-небудзь задумваўся пра кар'еру вучонага. Такія вынікі рэспубліканскага апытання, якое правяла маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў да Года навукі. Даследаваннем былі ахоплены 1,2 тысячы чалавек ва ўзросце ад 16 да 31 года, якія пражываюць у гарадах і сельскай мясцовасці.**

Удзельнікі апытання склалі своеасаблівы партрэт ідэальнага вучонага. На першым месцы такія якасці, як назіральнасць (66 працэнтаў), настойлівасць (51 працэнт) і ўменне канцэнтравацца на прадмеце вывучэння (50 працэнтаў). Больш за 40 працэнтаў апытаных упэўнены, што навуковец павінен быць арыгінальным і валодаць высокім узроўнем самаарганізацыі. Называліся і такія характарыстыкі, як крытычны падыход да рэчаў і незалежнасць у поглядах.

Самай важнай функцыяй навукі 65 працэнтаў рэспандэнтаў назвалі распрацоўку новых тэхналогій. Прычым кожны пяты з апытаных прымаў удзел у конкурсах навуковых ды інавацыйных праектаў.

Цікава, што сярод моладзі прафесія вучонага лічыцца больш прэстыжнай, чым прафесія ўрача, інжынера-механіка, юрыста, бухгалтара, повара, настаўніка, маркетолага і журналіста. Аднак у параўнанні з дзейнасцю пілотаў, ваеннаслужачых і IT-распрацоўшчыкаў навуковая праца выглядае менш прывабнай.

І яшчэ адзін важны момант. Удзельнікам даследавання прапаноўвалася ацаніць уласны ўзровень інфармаванасці пра беларускіх вучоных ды іх распрацоўкі. Сярэдняя ацэнка сярод усіх рэспандэнтаў — 4 балы з 10, што можа сведчыць пра нізкі ўзровень папулярызацыі беларускай навукі сярод моладзі. Пры гэтым рэспандэнты лічаць, што ўзровень развіцця навукі ў Беларусі вышэйшы, чым ва Украіне, Літве, Латвіі, Арменіі і Казахстане, але ніжэйшы, чым у Расіі, Польшчы, Вялікабрытаніі, ЗША.

Вось як пракаменціравала вынікі даследавання каардынатар рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу "100 ідэй для Беларусі" Кацярына Петрашкевіч:

— У цэлым кожны другі малады чалавек цікавіцца навукай і навуковымі дасягненнямі. Гэта добры паказчык, але пры гэтым, як відаць з вынікаў апытання, моладзь слаба разбіраецца ў беларускай навуцы. Значыць, неабходна больш працаваць над папулярызацыяй айчыннай навукі, у тым ліку праз сучасныя крэатыўныя формы. Гэта дапаможа не толькі прыцягваць маладыя кадры, але і развіваць пачуццё патрыятызму.

Аляксей **Фядосаў**




# Гульня па правілах

**Шматкроп'е ў перагаворах аб далучэнні Беларусі да Сусветнай гандлёвай арганізацыі нарэшце змянілася коскай. Восьмае пасяджэнне Рабочай групы ў Жэневе завяршылася прапановай з боку кіраўніцтва арганізацыі актывізаваць гэты працэс. Гэта значыць да канца 2017 года краіна цалкам можа далучыцца да элітнага гандлёвага блока, у які ўваходзяць 164 дзяржавы планеты.**

Гэтым летам споўніцца дваццаць гадоў з дня першага фармальнага пасяджэння рабочай групы па перагаворным працэсе па далучэнні да СГА. За гэты час здарылася многае: мяняліся палітычныя вектары, развіваліся эканоміка і сусветны гандаль, ствараліся новыя інтэграцыйныя саюзы. Сёння ўсе нашы партнёры па ЕАЭС з'яўляюцца членамі СГА, ды і мы самі ў пэўнай ступені дэ-факта ўжо з дзясятак гадоў жывём па стандартах арганізацыі. Пытанне далучэння можна лічыць вырашаным. Засталося вызначыцца, калі і на якіх умовах гэта адбудзецца. І вось гэта якраз самае складанае.

Акрамя пэўных "плюшак", якія мы, тэарэтычна, можам атрымаць, у краіне павінна быць праведзена каласальная падрыхтоўчая работа, сутнасць якой зводзіцца да таго, каб пры рэфармаванні захаваць і рэальны сектар эканомікі, і сацыяльную стабільнасць.

Асноўнае пытанне, якое хвалюе не толькі палітыкаў і эканамістаў, але і простых грамадзян, — якія магчымасці і пагрозы тоіць у сабе далучэнне нашай краіны да СГА.



Для адказу на яго, тлумачыць ***дырэктар Нацыянальнага цэнтра маркетынгу і кан'юнктуры цэн Валерый Садоха,*** варта разумець, што такая ацэнка павінна разглядацца на некалькі перыядаў:

— Калі мы гаворым пра кароткатэрміновы перыяд, то тут не варта чакаць якіх-небудзь істотных перамен. Плюсы і мінусы ўступлення ў СГА будуць праяўляцца на больш позніх этапах. У сярэднетэрміновым перыядзе ўступленне нашай краіны ў СГА запатрабуе пераўтварэнняў у прамысловасці: развіцця экспартнай канкурэнтаздольнасці галін і вытворчасцяў. У некаторых выпадках спатрэбіцца скарачэнне і перапрафіляванне неканкурэнтаздольных на сусветных рынках вытворчасцяў. Мяркую, што гэта будзе адносіцца да такіх галін, як машынабудаванне і металаапрацоўка, а таксама прамысловасць будаўнічых матэрыялаў.

Паміж тым, звяртае ўвагу эксперт, усе астатнія галіны могуць атрымаць істотныя перавагі. Што ж датычыцца радавога спажыўца, наўрад ці на першым этапе ён зможа

заўважыць якія-небудзь пазітыўныя ці негатыўныя змены. Хоць тут ёсць прамая залежнасць: калі большасць галін будуць адчуваць перавагі, то і работнікі прадпрыемстваў галіны змогуць адчуць гэта на ўзроўні зарплаты. Так, Сусветны банк нядаўна выступаў з ацэнкай, згодна з якой членства Беларусі ў СГА павінна прывесці да павелічэння рэальных даходаў на 8,2 працэнта.

На думку Валерыя Садохі, краіны — члены СГА становяцца больш празрыстымі для інвестраў з пункту гледжання ацэнкі іх заканадаўства, якое прыведзена ў адпаведнасць з патрабаваннямі пагадненняў СГА. У гэтым выпадку замежныя інвестары ахвотней прыходзяць у краіны, якія з'яўляюцца членамі глабальнай арганізацыі. Гэты фактар таксама можа мець ускосны ўплыў на павелічэнне колькасці працоўных месцаў і экспартнага патэнцыялу беларускіх прадпрыемстваў. У цэлым, гаворыць спецыяліст, стварэнне ўмоў для адкрытасці рынку і павелічэння канкурэнцыі на беларускім рынку можа прывесці да паніжэння цэн.



***Старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіслаў Шчэпаў*** нагадвае: у параўнанні з нашымі партнёрамі па ЕАЭС, якія ўступілі ў арганізацыю, Беларусь пакуль знаходзіцца ў няроўных умовах:

— Расія і Казахстан, у прыватнасці, прынялі на сябе абавязацельствы па паніжэнні мер тарыфнай абароны па многіх пазіцыях, мы вымушаны гэта ўлічваць. Бо цяпер на рынку ЕАЭС з'яўляецца імпартная прадукцыя па больш нізкіх цэнах. І калі такі ж асартымент вырабляюць нашы прадпрыемствы — канкурэнцыя ўзмацняецца, патэнцыйна зніжаюцца аб'ёмы вытворчасці і пагаршаюцца фінансавыя вынікі. Але такі мінус для вытворцы можа быць плюсам для спажыўца: знізяцца цэны на высокатэхналагічныя тавары, асартымент будзе шырэйшы.

На думку дэпутата, беларускім кампаніям трэба падрыхтавацца да канкурэнцыі, якая ўзрасце. І цешыць сябе тут не варта: калі мы акажамся да гэтага не гатовыя, рызыкуем атрымаць адмоўнае сальда знешняга гандлю. З другога боку, выхад на еўрапейскія рынкі можа стаць значна прасцейшым.

— Сёння Урад абавязаны не толькі пралічыць наступствы ўступлення Беларусі ў СГА, але таксама распрацаваць і прапанаваць кампенсацыйныя меры з улікам існуючых бюджэтных і тэхнічных магчымасцяў, — лічыць Уладзіслаў Шчэпаў.

Меркаванне бізнесу гучыць больш сурова: трэба рыхтавацца да абароны сваіх правоў.



— Галоўнае — навучыцца абараняць сябе ў судзе, — упэўнены ***старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір Карагін.*** — Бо ў краінах СГА канкурэнцыя набывае асаблівыя формы. У прыватнасці, любое прадпрыемства можа абвінаваціць вас у парушэнні нейкіх правілаў, у дэмпінгу. Гэта трэба ўмець парыраваць, адстойваць свае інтарэсы, удзельнічаць у працэдурах антыдэмпінгавых расследаванняў. Некаторыя гэтыя разборы доўжацца па 2-3 гады. Спатрэбіцца ўмацаванне галіновых і тэрытарыяльных бізнес-асацыяцый, таму што міністэрствы і Урад не могуць выступаць бокам, які абараняе прадпрыемствы.

***Сёння Урад абавязаны не толькі пралічыць наступствы ўступлення Беларусі ў СГА, але таксама распрацаваць і прапанаваць кампенсацыйныя меры з улікам існуючых бюджэтных і тэхнічных магчымасцяў***

Ёсць і яшчэ адна праблема. Тыя, хто ўступае ў СГА пазней, павінны прыняць правілы, якія агаворваюць тыя, хто раней уступіў.

— Таму выгадней было ўступаць аднымі з першых. Тады і адаптавацца лягчэй. Цяпер жа прыйдзецца рабіць мноства ўступак, — адзначае Уладзімір Карагін.



Зрэшты, некаторыя лічаць, што СГА — гэта атавізм. ***Прафесар кафедры эканомікі і ўпраўлення прадпрыемствамі АПК БДЭУ Міхаіл Жудро*** катэгарычны:

— СГА — гэта бабулька, ці, кажучы больш цывілізавана, проста клуб добрага тону ў бізнес-камунікацыях. Так, пэўную місію арганізацыя выканала. Але пасля 1999 года ў свеце вельмі многае змянілася, патрэбны іншыя платформы ўзаемадзеяння. Паглядзіце на краіны, якія далучыліся да СГА пасля 2000-2005 гадоў. Ні адна з іх — ні адна! — не паказала станоўчай дынамікі.



Няхай нават так, але СГА ахоплівае каля 96 працэнтаў сусветнага гандлю. І няўдзел у гэтым "клубе" мае не толькі эканамічны, але і іміджавы эфект. ***Эксперт па эканоміцы "Ліберальнага клуба" Антон Боўтачка***, наадварот, сцвярджае, што ўступленне ў СГА ўжо даўно павінна стаць прынцыповым для нашай краіны. Гэта, паводле яго слоў, дазваляе павысіць давер да эканамічных і палітычных інстытутаў у краіне.

— У той жа час уступленне ў СГА — гэта не вырашэнне праблем у эканоміцы, — перасцерагае эксперт. — Як паказвае практыка многіх краін, толькі ў выпадку гатоўнасці рэфармавання эканомікі, асабліва рэальнага сектара, можна атрымаць сур'ёзныя бонусы ад работы ў рамках арганізацыі. Для нас уступленне ў СГА не самамэта, а толькі адзін з інструментаў, якія даюць магчымасць ствараць спрыяльныя ўмовы для росту і развіцця эканомікі.

З гэтага пункту гледжання, на думку Антона Боўтачкі, у эканоміцы назіраюцца некаторыя зрухі. У прыватнасці, Урад прыняў план дзеянняў на пяцігодку, які шмат у чым мае даволі рыначныя рашэнні.

— Таму ўступленне Беларусі ў СГА да канца гэтага года цалкам рэальны праект.

Галіна **Кандрацьева**

# Аднаўляльны рэсурс інтарэсаў



**Германія працяглы час была адным з вядучых гандлёва-эканамічных, як, уласна, і інвестыцыйных, партнёраў Беларусі ў Еўропе. Патэнцыйна ў такім статусе гэтая краіна разглядаецца і сёння. Нават пры ўсёй зменлівай сучаснай кан'юктурнасці інтарэсаў. Але своеасаблівы аднаўляльны патэнцыйны рэсурс прагматычнага супрацоўніцтва дзвюх краін захоўваецца. Пацверджаннем таму стала і наша размова з Кіраўніком Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Беларусі Уладзімірам Аўгусцінскім.**

***— Прадстаўніцтва, якое Вы доўгі час узначальваеце, па сутнасці з'яўляецца своеасаблівым фарпостам усяго таго, што акумулюецца ў паняцці "нямецкая эканоміка". Але як, якім чынам Прадстаўніцтва ўплывае на інтэграцыю з краінай, дзе яно акрэдытавана?***

— Нягледзячы на сусветны фінансавы і эканамічны крызіс, крызіс Еўразоны, Германія застаецца адной з асноўных рухаючых сіл інтэграцыйнага працэсу ўнутры ЕС. У той жа час для Германіі, як і іншых краін з падобнай — несыравіннай — структурай эканомікі, характэрны высокія затраты на энергію, параўнальна высокія працоўныя выдаткі пры нарастаючым недахопе працоўнай сілы. Пры гэтым Германія па-ранейшаму з'яўляецца, паводле дадзеных апублікаванага ў чэрвені 2016 года кампаніяй Ernst&Young Еўрапейскага апытання прывабнасці (E&Y European attractiveness Survey 2016), самай прывабнай для інвестыцый краінай у Еўропе.

Сакрэт поспеху ў захаванні Германіяй такіх высокіх пазіцый нават у крызісны час — апора на інавацыі, правядзенне структурных рэформ і карэкціроўка прамысловай палітыкі. Аднак базай для гэтага з'яўляюцца тыя самыя краінавыя перавагі, пра якія мы пастаянна гаворым і ў дачыненні Беларусі: перш за ўсё, эканамічная і палітычная стабільнасць, мацнейшая эканоміка Еўропы высокатэхналагічная, добра дыверсіфікаваная і знаходзіцца ў пастаянным росце. Прыярытэт аддаецца прадпрымальніцтву — нямецкая эканоміка "куецца" амаль чатырма мільёнамі кампаній, якія рэалізуюць у тым ліку інавацыйны патэнцыял краіны. Дзякуючы бізнесу Германія стабільна займае 1-е месца ў свеце па аб'ёме экспарту тэхналагічнай прадукцыі. Першакласная інфраструктура — гэта ў першую чаргу датычыцца якасці дарог, аэрапортаў і чыгуначных сетак (ужо 3-ці год запар Германія ў гэтым плане — сусветны лідар згодна з публікуемым Сусветным банкам рэйтынгам Logistics Performance Index).

Гледзячы на гэтыя абагульненыя фактары, узнікае аналогія з Рэспублікай Беларусь. Гаворачы пра краінавыя перавагі Беларусі, мы таксама заўсёды згадваем:

- Выгаднае геаграфічнае і геапалітычнае становішча ў якасці шарніра паміж ЕС і ЕАЭС, высокі транзітны патэнцыял.
- Кіраўніцтвам краіны прадпрымаюцца намаганні па стварэнні спрыяльных рамачных умоў для гаспадарчай і інвестыцыйнай дзейнасці, па сутнасці сёння практычна ўся краіна з'яўляецца інвестыцыйнай пляцоўкай з прэферэнцыйнымі ўмовамі (малыя гарады і сельская мясцовасць, ПВТ, СЭЗы, Індустрыяльны парк).
- Улічваючы сітуацыю ў суседняй Украіне і санкцыйныя адносіны паміж Расіяй і ЕС, немагчыма не прызнаць фактар палітычнай стабільнасці ў краіне (з 2012 года паказчык "палітычная стабільнасць" традыцыйна знаходзіцца на першых пазіцыях фактаральнага зрэзу ў рамках праводзімых штогадовых апытанняў аб стане дзелавога клімату ў Рэспубліцы Беларусь).
- Такія фактары, як развітая інфраструктура і высокая кваліфікацыя кадраў на рынку працы, паводле ацэнак нямецкіх інвестараў, якія працуюць у Беларусі, таксама

традыцыйна ў топ-3 сярод найбольш спрыяльных.

- Нарэшце, ёсць цэлы шэраг сапраўды паспяховых прыкладаў дзейнасці ў краіне замежных, у тым ліку нямецкіх, кампаній, досвед якіх павінен маштабавацца і пашыраць агульную палітру па прадастаўленні магчымасцяў супрацоўніцтва.

Калі краінавыя перавагі Германіі і Беларусі падобныя, то чаму паміж інвестыцыйнай прывабнасцю абедзвюх краін такое значнае адрозненне? Справа ў падыходах да выкарыстання гэтых пераваг у якасці драйвераў эканамічнага росту. Германія, якая не валодае значнымі прыроднымі рэсурсамі, для рэалізацыі свайго прамысловага патэнцыялу зрабіла стаўку на інавацыі, падтрымку малога і сярэдняга бізнесу і яго экспартнага патэнцыялу, магутнае развіццё навукова-даследчай сферы, якая ў рамках розных формаў непасрэдным чынам уплывае на прамысловае развіццё.

***— Трэба адзначыць, што сёння працэс інтэграцыі дзвюх эканомік — нямецкай і беларускай — не такі актыўны, як, скажам, яшчэ дваццаць гадоў назад. Чаму? Вы, напэўна, ведаеце адказ на гэтае пытанне. Ці скажам так: у Вас, напэўна, ёсць сваё меркаванне.***

— Гістарычна склалася, што Беларусь ужо з'яўлялася месцам прыкладання інвестыцый. Быўшы зборачным цэхам былога СССР, Беларусь размяшчала на сваёй тэрыторыі шэраг канкурэнтаздольных на той час вытворчасцяў. Але мадэль, якая існавала апошнія 25 гадоў, засноўвалася толькі на патэнцыяле дзяржпрадпрыемстваў, які даўно сябе вычарпаў, і не дазваляла ўключаць рыначныя механізмы для стымулявання развіцця канкурэнцыі. Таму нават рэалізаваныя праекты па мадэрнізацыі паказалі невялікі эфект традыцыйных падыходаў — гэта аказалася толькі спробамі дагнаць развітыя краіны, якія стаялі ўжо перад новымі глабальнымі выклікамі, такімі як інтэнсіфікацыя ўсіх сфер грамадскага і эканамічнага развіцця, новая прамысловая рэвалюцыя, пошук новых магчымасцяў для забеспячэння эканамічна эфектыўнай абароны клімату і навакольнага асяроддзя. І на сённяшні дзень менавіта гэтыя выклікі і ляжаць у аснове фарміравання асноўных напрамкаў агульнаэканамічнай, а таксама — як яе складнікаў — прамысловай і інвестыцыйнай палітыкі Германіі. Думаецца, досвед гэтай краіны можа быць карысны і Беларусі. А менавіта. Сёння пры фарміраванні і рэалізацыі сваёй эканамічнай палітыкі Германія робіць стаўку на:

- павелічэнне дзяржаўных і стымуляванне прыватных — у першую чаргу ўнутраных — інвестыцый з мэтай далейшага развіцця інфраструктуры (ужо быўшы сусветным лідарам у гэтай сферы!), адукацыі і інавацый праз стварэнне стартапаў і прыцягненне венчурнага капіталу;
- забеспячэнне патрэбы эканомікі ў кадрах праз больш актыўнае ўцягванне ў працоўны працэс розных сацыяльных груп — у тым ліку людзей пенсійнага ўзросту, бежанцаў, маладых бацькоў, замежных спецыялістаў;
- эканамічна эфектыўнае энергазабеспячэнне, абарона клімату і навакольнага асяроддзя;
- адкрыццё новых рынкаў па-за Еўропай і пашырэнне экспартных шанцаў для прадпрыемстваў.

Гэтыя напрамкі дакладна паказваюць, як вядзецца работа па ўдасканаленні тых самых базавых краінавых пераваг у першую чаргу ў якасці рухаючых сіл эканамічнага росту і павелічэння дабрабыту краіны, і ўжо потым — як фактараў інвестыцыйнай прывабнасці.

У Беларусі ёсць таксама вялікі патэнцыял. Але яго важна як можна эфектыўней задзейнічаць.

***— Тым не менш, супрацоўніцтва па лініі беларускай і нямецкай эканомік усё ж працягваецца. Магчыма, не так эфектыўна, як хацелася б, але ўсё ж. Якія прыклады такога супрацоўніцтва вы маглі б прывесці?***

— Многія нямецкія кампаніі даўно прадстаўлены на беларускім рынку і добра вядомыя прафесіяналам як пастаўшчыкі высокатэхналагічнага,



Карысны дыялог: дырэктар "Роберт Бош" ТАА ў Мінску Уладзімір Рыбалоўлеў і старшыня БелГПП Уладзімір Улаховіч

сучаснага абсталявання і надзейныя партнёры ўжо даволі працяглы перыяд. Толькі адзін яркі прыклад. Дзясяткі гадоў прысутнічае на беларускім рынку такі нямецкі гігант, як Siemens.

У цяперашні час гэтая кампанія дзейнічае праз сваё бюро ў Мінску, прадстаўляючы свае прызнаныя ва ўсім свеце тэхналогіі, у тым ліку і ў сферы энергетыкі. Гэта канцэптуальныя рашэнні па праектаванні, будаўніцтве, рэканструкцыі ды эксплуатацыі электрастанцый, неабходныя кампаненты, сістэмы і абсталяванне для вытворчасці энергіі з розных відаў паліва, праграмнае забеспячэнне для кіравання сеткай, продажы электраэнергіі і кіравання электрабалансам.

У рамках гэтай дзейнасці кампаніяй Siemens рэалізаваны дзясяткі праектаў па ўстаноўцы і абслугоўванні генерыруючага абсталявання на беларускіх ГРЭС, ЦЭЦ, буйных прамысловых прадпрыемствах, такіх як “Гродна Азот”, “Беларуськалій”, “Гомельшкло”.

Кампанія ROBERT BOSCH работу на рынку Беларусі ўласным прадстаўніцтвам пачала ў 90-х гадах. Акрамя аўтамабільных і прамысловых тэхналогій, спажывецкіх тавараў Бош прапаноўвае і энергаэфектыўныя рашэнні, з’яўляючыся лідзіруючым пастаўшчыком тэрматэхнікі, сістэм бяспекі, буйнейшым вытворцам цеплавых помп.

З 2004 года ў Рэспубліцы Беларусь дзейнічае даччынае прадпрыемства канцэрна WILOSE — еўрапейскага лідара па вытворчасці энергазахавальнага помпавага абсталявання для водазабеспячэння, ацяплення, водаадвядзення і пажаратушэння.

У 2006 годзе ў Заслаўі адкрыўся завод будаўнічых матэрыялаў кампаніі Henkel Bautechnik, выпускаемых пад маркай Ceresit. Тэхналогіі, прапануемыя кампаніяй, закліканыя забяспечваць цеплавую ізаляцыю будынкаў.

Свой уклад у павышэнне энергаэфектыўнасці будаўніцтва ў Беларусі ўжо шмат гадоў уносіць і кампанія KNAUF.

Сучасныя IT-рашэнні для кіравання энергасістэмай на мікра- і макраўзроўнях прапаноўвае сусветна вядомы нямецкі ПЗ-распрацоўшчык SAP. Гэты спіс, безумоўна, можна яшчэ доўга працягваць.



На міжнароднай выставе BAU 2017 у Мюнхене

Даволі даўно на энергетычным рынку Беларусі прысутнічае і група кампаній RETHMANN, адзін з ключавых гульцоў на сусветным рынку водаачысткі, збору і перапрацоўкі другаснай сыравіны, лагістыкі і біяіндустрыі. Гэта праекты з удзелам кампаній SARIA Bio-Industries (завод па ўтылізацыі адходаў жывёльнага паходжання для прамысловага прымянення і вытворчасці альтэрнатыўнага гаручага і біядызельнага паліва, г. Бяроза) і REMONDIS (транспарціроўка і перапрацоўка камунальных адходаў у Мінску). У 2007-2008 гадах саксонскім прадпрыемствам LEHMANN Maschinenbau GmbH ужо рэалізаваны праект па будаўніцтве смеццесартавальнай устаноўкі на Наваполацкім біямехзаводзе бытавых другрэсурсаў. Пастаўкі абсталявання, а таксама будаўніча-мантажныя паслугі, кансультацыйная і інжынірынгавая падтрымка пры будаўніцтве біягазавых комплексаў ажыццяўляліся нямецкімі кампаніямі ў Мінскай і Магілёўскай абласцях.

У цяперашні час у працэсе рэалізацыі знаходзіцца пілотны праект першай у Беларусі дэманстрацыйнай зоны высокай энергаэфектыўнасці сістэмы комплекснага энергазабеспячэння аграгарадка “Таргуны” (Віцебская вобласць) з выкарыстаннем мясцовых і аднаўляльных энергарэсурсаў. Тэхнічнае суправаджэнне, перадпраектныя работы, вытворчасць і пастаўка абсталявання, суправаджэнне пры будаўніцтве, мантажы, пусканаладцы, сэрвісе ажыццяўляюцца нямецкай кампаніяй Viessmann.

Гэты спіс можна працягваць. Але сутнасць у іншым — трэба працягваць і актыўна развіваць супрацоўніцтва. Як я ўжо адзначаў, сакрэт поспеху ў захаванні Германіяй сваіх высокіх пазіцый нават у крызісны час — апора на інавацыі, правядзенне структурных рэформ сваёй даследча-інавацыйнай сістэмы і карэкціроўка прамысловай палітыкі. Аднак базай для гэтага з’яўляюцца тыя самыя краінавыя перавагі, пра якія мы пастаянна гаворым і ў дачыненні Беларусі. Гэтыя напрамкі выразна паказваюць, як вядзецца работа па ўдасканаленні тых самых базавых краінавых пераваг у першую чаргу ў якасці рухаючых сіл эканамічнага росту і павелічэння дабрабыту краіны, і ўжо потым — як фактараў інвестыцыйнай прывабнасці.

У Беларусі ёсць таксама вялікі патэнцыял стаць часткай ланцужка па стварэнні дабаўленай вартасці ў рамках глабальнага і рэгіянальнага падзелу працы. Важна знайсці тыя пункты росту, якія разам з гістарычна і геапалітычна дадзенымі краіне перавагамі ў звязцы са структурнымі рэформамі дазволяць зрабіць неабходны рывок. З улікам вышэйсказанага, вывучэнне досведу іншых краін і суаднясенне яго з патрэбамі і магчымасцямі для прымянення ў Беларусі — адна з важнейшых задач інстытутаў, якія адказваюць за рэалізацыю інвестыцыйнай палітыкі і стымуляванне знешнеэканамічнай дзейнасці.



На 9-ым Дне нямецкай эканомікі ў Мінску

***— Ці можна гаварыць, што намячаецца, няхай невыразная, але ўсё ж тэндэнцыя пэўнай актыўнасці ў дачыненні двюх эканомік: па лініі аднаўлення прадпрымальніцкіх сувязяў, рэалізацыі сумесных бізнес-праектаў, няхай нават вядзення якога-небудзь зацікаўленага дыялогу, які сведчыць, што перспектыва ёсць і яна абнадзейвае.***

— У пачатку 2016 ЕС зняў санкцыі ў дачыненні Беларусі, што, безумоўна, стала знакавай падзеяй. Актывізацыя афіцыйных кантактаў на розных узроўнях з боку ЕС і Германіі з РБ — гэта ўжо новая рэальнасць. Мы спадзяёмся, што гэта надасць новыя станоўчыя і канструктыўныя імпульсы двухбаковаму нямецка-беларускаму эканамічнаму супрацоўніцтву. Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі, якое летась адзначыла 15-годдзе сваёй дзейнасці ў якасці афіцыйнага інструмента знешнеэканамічнай палітыкі ФРГ, гатовае да актыўнага ўдзелу ў працэсе інтэнсіфікацыі двухбаковага беларуска-германскага супрацоўніцтва.

За мінулыя 15 гадоў работа Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Мінску прыпала на перыяды і ўздымаў, і спадаў у палітычных і эканамічных адносінах паміж Германіяй і Беларуссю. Задачай Прадстаўніцтва ўвесь гэты час было нават у тых складаных рамачных умовах, існуючых у краіне, ствараць для нямецкіх кампаній магчымасці для ўстанаўлення і пашырэння супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі, а таксама садзейнічаць беларускім кампаніям пры выхадзе на нямецкі рынак. Такая была місія, для выканання якой Нямецкі саюз прамыслова-гандлёвых палат ствараў Прадстаўніцтва. Такія былі і спадзяванні, якія Федэральнае міністэрства эканомікі і энергетыкі звязвала і будзе, я лічу, звязваць у далейшым з работай Прадстаўніцтва. Бо патрэба нямецкіх кампаній у добра арганізаванай падтрымцы пры ўваходжанні на беларускі рынак і пашырэнні сваёй дзейнасці на ім узрасце менавіта цяпер, калі Еўрапейскі саюз, а значыць, і Германія намерыліся апрабаваць новыя шляхі супрацоўніцтва з Беларуссю. Патэнцыял двухбаковага гандлю таварамі і паслугамі яшчэ далёка не вычарпаны, а на фоне нестабільнасці ў эканоміках Расіі і Украіны — двух важнейшых знешнегандлёвых партнёраў Беларусі — адкрываюцца новыя напрамкі для двухбаковага супрацоўніцтва з Германіяй і ЕС. Успомнім толькі пра магчымасці кааперацыі, у тым ліку, у сферах лагістыкі і энергетыкі, якія ўжо выкарыстоўваюцца нямецкімі і беларускімі прадпрыемствамі. Пры гэтым вельмі істотнай апорай для вытворчай кааперацыі з'яўляюцца праекты ў сферы прафесійнага навучання.

Толькі шляхам падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў можна забяспечыць захаванне добра аплатных працоўных месцаў у традыцыйных вузлавых сектарах беларускай прамысловасці і стварэнне новых працоўных месцаў у перспектыўных галінах будучыні. Толькі так можна павысіць экспартны патэнцыял беларускіх прадпрыемстваў, у чым сёння ёсць пільная патрэба. Федэральнае міністэрства эканомікі і энергетыкі Германіі прадастаўляе ў распараджэнне нямецкіх экспарцёраў і інвестараў свае інструменты стымулявання знешнеэканамічнай дзейнасці ў выглядзе гарантый па экспартных крэдытах (т. зв. пакрыццё Hermes) і інвестыцыйных гарантый. Акрамя таго, на працягу шэрага гадоў міністэрства паспяхова ажыццяўляе праграму павышэння кваліфікацыі спецыялістаў і кіраўнічых кадраў для малых і сярэдніх прадпрыемстваў Беларусі. Паралельна з гэтым міністэрства ўжо шмат гадоў фінансуе Нямецкую эканамічную групу ў Беларусі. Арыентаваная на попыт дзейнасць гэтай групы кансультантаў уносіць істотны ўклад у падтрымку стварэння адэкватных рамачных умоў для работы замежных прад-

## Факты

**■ Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі пачало сваю дзейнасць у 1995 годзе ў якасці Кантактнага бюро федэральнай зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія — Прадстаўніцтва прамыслова-гандлёвай палаты Бона. У 2000 годзе па рашэнні Федэральнага міністэрства эканомікі ФРГ і Нямецкага саюза прамыслова-гандлёвых палат яно было пераўтворана ў Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь. Афіцыйнае адкрыццё адбылося ў 2001 годзе. З гэтага часу Прадстаўніцтва ўваходзіць у сусветную сетку нямецкіх замежных гандлёвых палат. Па ўсім свеце дзейнічае больш за 130 бюро ў 90 краінах, асноўнай мэтай іх дзейнасці з'яўляецца падтрымка знешнеэканамічнай дзейнасці нямецкага бізнесу. Дзейнасць Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі накіравана на эфектыўнае развіццё і падтрымку гандлёва-эканамічных адносінаў паміж нямецкімі і беларускімі прадпрыемствамі.**

прыемстваў у краіне. Аднак поспех названых мерапрыемстваў быў бы немагчымы без узгодненай падтрымкі, якую аказвае нямецкім кампаніям у Беларусі "трохзор'е" ў складзе Пасольства ФРГ, Нямецка-беларускага эканамічнага клуба і Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі.

***— Якія акцыі, якія форумы, іншыя мерапрыемствы Прадстаўніцтва можа занесці сабе ў заслугу ў справе збліжэння дзвюх эканомік: нямецкай і беларускай?***

— Нам варта выкарыстаць шанц паставіць супрацоўніцтва паміж Германіяй і Беларуссю на новую аснову. Германіі патрэбны надзейныя партнёры ва Усходняй Еўропе, Беларусі патрэбна шырэйшая дыверсіфікацыя эканамічных сувязяў. Такую ролю можа адыграць, да прыкладу, Кітай. Але з улікам высокаразвітой тэхнічнай базы беларускай эканомікі гэтая роля яшчэ больш падыходзіць нямецкай эканоміцы і ўнутранаму еўрапейскаму рынку.

Ужо 15 гадоў Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі выступае кантактнай асобай для бізнесу, яно заклала асновы, якія даюць магчымасць кампаніям асвойваць беларускі рынак. У асобе Прадстаўніцтва яны маюць справу з дасведчаным партнёрам, каманда якога можа аказаць падтрымку прама ў Беларусі.

Хачу падкрэсліць, што без падтрымкі з боку краіны знаходжання эфектыўная работа нашага замежнага бюро была б немагчымая. Таму рашаючае значэнне мае тая акалічнасць, што органы ўлады аказваюць садзейнічанне, не ствараюцца перашкоды і можна працаваць у канструктыўнай атмасферы. І, вядома, яшчэ лепш, калі мы, як у выпадку правядзення Дзён беларускай эканомікі ў Берліне ды іншых гарадах, сумесна з беларускімі партнёрамі арганізуем мерапрыемствы і запускаем фарматы з перспектывай на прадаўжэнне. Гэтым забяспечваюцца пастаянства і давер.

Адначасова гэта павінна стаць для Прадстаўніцтва стымулам для далейшай інтэнсіўнай работы па пашырэнні эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. І, магчыма, вынікам усіх гэтых намаганняў у адзін, спадзяюся, не вельмі далёкі дзень стане пераўтварэнне Прадстаўніцтва ў Дэлегацыю, а затым і ў Германа-беларускую гандлёвую палату.



На міжнароднай выставе BAU 2017 былі прадстаўнікі з Беларусі

***— Што ў планах Прадстаўніцтва? Ці мяняе яно сваю дзейнасць з улікам сённяшняй сітуацыі ва ўзаемаадносінах дзвюх эканомік? Якія задачы бачыць перад сабою на бліжэйшы час?***

— На працягу ўсіх 15 гадоў Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі паспяхова вяло сваю дзейнасць. Гэта ўжо само па сабе немалое дасягненне. Іншыя краіны таксама спрабавалі стварыць у Беларусі ўласныя прадстаўніцтвы для ўзмацнення ролі кампаній і прадпрыемстваў, аднак я не чуў, каб гэтыя спробы ўвянчаліся асаблівым поспехам. Дарэчы, аб надзеі: перанясемся на імгненне ў часы стварэння ПНЭ. Якой была тады, у пачатку новага тысячагоддзя, 15 гадоў назад, эканамічная сітуацыя ў Беларусі? У той час Беларусь уваходзіла ў лік 25 самых хуткарослых эканомік свету! ВУП штогод павялічваўся на 5 працэнтаў, больш за тое: у перыяд 2004-2008 гадоў меў месца прырост ВУП у памеры каля ці нават звыш 10 працэнтаў. На працягу некаторага часу можна назіраць, што тагачасны прырост не ўдалося абярнуць ва ўстойлівы рост. Сітуацыя ў свеце стала значна складанейшай, з-за зніжэння цэн на нафту і прасядання традыцыйных рынкаў збыту беларуская эканоміка апынулася перад вялікімі праблемамі. З'яўляючыся адкрытай эканомікай з моцнай залежнасцю ад экспарту, Рэспубліка Беларусь застаецца таксама і краінай, на якой непасрэдна ці апасродкавана адбіваюцца ваганні сусветнай кан'юнктуры і фінансавыя крызісы.

Але 15 гадоў дзейнасці Прадстаўніцтва нямецкай эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь — гэта ўсё ж, спадзяюся, 15 гадоў эфектыўнага і дзейснага супрацоўніцтва па развіцці гандлёва-эканамічных адносінаў паміж Рэспублікай Беларусь і Германіяй. За гэтыя гады значна ўмацавана дагаворная і арганізацыйная база супрацоўніцтва паміж Беларускай гандлёва-прамысловай палатай і нямецкімі партнёрскімі арганізацыямі. Усё больш станоўчую дынаміку набывае рэалізацыя Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж БелГПП і Нямецкім саюзам гандлёва-прамысловых палат. На ўзроўні нацыянальных палат мы правялі ў 2013 і 2015 гадах такія знакавыя мерапрыемствы, як Дні беларускай эканомікі ў Берліне. Прымаючы да ўвагі станоўчую дынаміку развіцця супрацоўніцтва паміж БелГПП і Саюзам нямецкіх гандлёва-прамысловых палат, ёсць намер бакоў абнавіць Пагадненне, уключыўшы ў яго новыя ініцыятывы, што, несумненна, надасць чарговы імпульс узаемаадносінам паміж палатамі.

Уласна, у гэтым таксама ёсць наша работа — павышаць эфектыўнасць арганізацыі розных беларуска-нямецкіх дзелавых мерапрыемстваў. Упэўнены, што ў бачанні такой перспектывы заключаны вялікі патэнцыял несумненна выгаднага для абедзвюх краін супрацоўніцтва.

Уладзімір **Міхайлаў**




ЛІЗА ЦІМАШКОВА

# У ліку самых бяспечных краін свету

**Сёння ў грамадстве ідуць актыўныя, часам бурныя дыскусіі пра тое, як краіне жыць і развівацца далей. Тон гэтым развагам задала “Вялікая размова з Прэзідэнтам” з удзелам журналістаў, палітолагаў, эканамістаў, лідараў грамадскіх рухаў. І калі ўважліва прыгледзецца, прыслухацца, што хвалюе і турбуе беларусаў, то відаць: незалежна ад палітычных поглядаў, вераванняў і пераваг усіх аб’ядноўвае краіна, якую мы хочам зрабіць яшчэ больш багатай і камфортнай для жыцця.**

Дарэчы, адной з галоўных каштоўнасцяў, якая хвалюе ўсіх людзей, з’яўляецца бяспека. Рэсурс numbeo.com, вядомы ва ўсім свеце дзякуючы збору статыстыкі розных краін і гарадоў у самых розных сферах, прадставіў рэйтынг крымінагеннай абстаноўкі ў свеце. Беларусь апынулася ў першай дзясятцы самых бяспечных краін. Паводле дадзеных рэсурсу, індэкс бяспекі ў нашай краіне складае 77,74 пункта са 100 магчымых. У Катара, які ўзначальвае рэйтынг, гэты паказчык толькі крыху вышэйшы — 84,30. Усяго ў топ-10 апынуліся толькі чатыры еўрапейскія краіны: Беларусь, Аўстрыя, Данія і Грузія.

Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе, але ў іх — больш, чым статыстыка. Вельмі важна яшчэ і іх успрыманне. Не магу не звярнуцца яшчэ раз да пачатку “Вялікай размовы з Прэзідэнтам”, калі ён нагадаў пра падзеі ва Украіне і вялікай каштоўнасці жыцця ў спакойнай і зручнай для жыцця краіне. Мы такую дзяржаву маем. Прычым па ўсіх параметрах. Напрыклад, у падрабязнай статыстыцы гаворыцца, што ў беларускай сталіцы адзначаны найніжэйшы ўзровень небяспекі крадзяжу, разбою, грабяжу, нападзення на вуліцы, крадзяжоў машын... Таксама ў Мінску найменш верагодна можна пацярпець ад фізічных атак з-за колеру скуры ці рэлігійнай прыналежнасці. Адзначаецца, што з мінчанамі нічога не здарыцца падчас начной прагулкі...

Мы да гэтага прывыклі як да само сабою зразумелага. Але вось дадзеныя таго ж рэйтынга па суседніх краінах паказваюць зусім іншую рэальнасць. Тройка ўкраінскіх гарадоў — Харкаў, Кіеў і Львоў — увайшла ў дзясятку найбольш крымінальных мегаполісаў Усходняй Еўропы. На першай пазіцыі ў топе самых небяспечных з пункту гледжання злачыннасці ўсходнееўрапейскіх гарадоў знаходзіцца таксама Екацярынбург (Расійская Федэрацыя). У Заходняй Еўропе падобную тройку крымінальных аўтсайдараў складаюць Лунд (Швецыя), Неапаль (Італія) і Марсэль (Францыя).

...Ёсць пра што задумацца, калі мы гаворым і спрачаемся аб пошуках лепшай будучыні. Вядома, сёння перад намі стаіць нямала важных задач. Але іх будзе лягчэй вырашаць, маючы галоўнае — краіну, зручную для жыцця.

## Замежныя кірункі

### Беларуская чыгунка вызначыла напрамкі міжнароднага супрацоўніцтва

Упрыватнасці, будуць развівацца перавозкі ў зносінах Кітай — Беларусь — Кітай і супрацоўніцтва з рэзідэнтамі Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка “Вялікі камень” у транспартна-лагістычнай сферы і ў арганізацыі перавозак у міжнародных зносінах. Акрамя таго, будзе наладжана ўзаемадзеянне з правінцыямі Кітая па арганізацыі перавозак паскоранымі кантэйнернымі цягнікамі.

Вялікую ўвагу нададуць узаемадзеянню з чыгуначнымі кампаніямі Расіі, Казахстана, Літвы, Латвіі, Украіны, Польшчы, Германіі, Эстоніі. Мэта — прыцягненне дадатковых аб’ёмаў перавозак грузаў, развіццё пасажырскіх перавозак, правядзенне ўзгодненай і канкурэнтаздольнай тарыфнай палітыкі, прымяненне электронных юрыдычна значных перавозачных дакументаў пры арганізацыі перавозак у міжнародных зносінах, узгадненне сумесных дзеянняў, накіраваных на развіццё інфраструктуры прыгранічных чыгуначных участкаў на асноўных напрамках пасажыра- і грузапатокаў.

Таксама плануецца завяршэнне электрыфікацыі чыгуначнага напрамку Маладзечна — дзяржграніца — Н.Вільня і арганізацыя пасажырскіх перавозак па маршруце Мінск — Вільнюс з выкарыстаннем сучасных электрапаяздоў.

Прадстаўніцтвы Беларускай чыгункі ў Расіі, Казахстане і Польшчы будуць цесна ўзаемадзейнічаць з чыгункамі, грузаўладальнікамі, аператарамі рухомага саставу, перавозчыкамі і экспедытарскімі арганізацыямі для прыцягнення дадатковых аб’ёмаў перавозак.





ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

# Капіталы ў інвестыцыйнай гавані

**Сёлета колькасць рэзідэнтаў Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка "Вялікі камень" павінна павялічыцца мінімум удвая. Каля дзесяці кампаній ужо амаль гатовыя далучыцца да праекта. Для краіны гэта азначае фінансавы прыток не менш за 100 мільёнаў долараў.**

GREAT STONE
industrial park

Аднак, каб дасягнуць гэтай мэты, прыйдзецца ў чарговы раз перагледзець інвестыцыйнае заканадаўства. Якія выгоды абяцаюць будучым рэзідэнтам парка?

"Жамчужына Эканамічнага пояса Шаўковага шляху" — менавіта так каларытна называюць Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк "Вялікі камень" у рэкламных праспектах, якія раздаюцца інвестарам на міжнародных форумах. Але ў інвестыцыйным сэнсе яна, на жаль, пакуль належным чынам не блішчыць: далучацца да бізнес-праекта заходнія ды і кітайскія кампаніі асабліва не спяшаюцца. Аказваецца, у нас недастаткова прывабныя ўмовы. Нават пайшоўшы на беспрэцэндэнтныя меры па ўдасканаленні дзелавога клімату, наша краіна сур'ёзна прайграе партнёрам па ЕАЭС у частцы прадастаўляемых прэферэнцый для рэзідэнтаў індустрыяльных паркаў. Выправіць сітуацыю можа праект указа Прэзідэнта, які цяпер распрацоўваецца і які дасць зялёнае святло для патэнцыйных інвестараў, дапаможа стварыць сапраўды выгадныя ўмовы для рэзідэнтаў. Наш карэспандэнт адправілася ў Смалявіцкі раён, каб ацаніць, як ідуць будаўнічыя работы, а таксама больш падрабязна даведацца пра планы па лібералізацыі ўмоў для інвестараў.

## Шырокія праспекты

Яшчэ два з паловай гады назад на пляцоўцы за 25 кіламетраў ад Мінска былі палі ды балоты. Сёння тут угадваюцца рысы будучага міжнароднага экагорада. Цалкам завершаны работы па добраўпарадкаванні дарог ды інжынерных сетак у межах сямі вуліц стартавай зоны парка. Праспекты Мінскі і Пекінскі, вуліцы Рубінавая, Сапфіравая і Малахітавая сфарміравалі каркас горада. Практычна цалкам дабудавалі першы адміністрацыйны васьміпавярховы будынак і тыпавы вытворчы корпус. Чакаецца, што ў бліжэйшы час пачнецца іх унутранае аздабленне, а да сярэдзіны года тут ужо размесцяцца служба "Адно акно", офіс кіруючай кампаніі і першыя рэзідэнты парка.

— Асноўныя намаганні летась былі сканцэнтраваны на стварэнні інжынерна-транспартнай інфраструктуры стартавай зоны парка, — пачынае экскурсію першы намеснік гендырэктара СЗАТ "Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка" Кірыл Карацееў. — Цяпер усё гатова для таго, каб першыя рэзідэнты маглі прыступіць да будаўніцтва. На пляцоўцы ўжо ёсць газ, электрычнасць, вада. Акрамя таго, пачаліся пусканаладачныя работы па пляцоўках ачышчальных будынкаў дажджавых сцёкаў.

Каб даць магчымасць ацаніць увесь маштаб пабудаванай інфраструктуры, прывядзём такі прыклад: яе вытворчыя магутнасці ўжо цяпер адпавядаюць інжынерным сістэмам горада з насельніцтвам 50 тысяч чалавек. У далейшым горад будзе толькі расці. Сёлета на тэрыторыі парка пачнецца будаўніцтва аб'ектаў інжынерна-транспартнай інфраструктуры астатняй тэрыторыі першага этапу, плошча якога 850 га. Ужо ў першым квартале гэтага года кіруючая кампанія збіра-

***Чаканы эфект ад рэалізацыі праекта "Вялікі камень" да 2020 года павінен скласці ад 2 да 4,6 мільярда долараў. Пры гэтым ВУП нашай краіны ад прыросту інвестыцый павінен вырасці на 0,9-2,0 працэнты, экспарт — на 1,5-5,2 мільярда долараў у год***

## Даслоўна



**Пань ЮН, генеральны дырэктар ТАА "Бел Хуавэй Тэхналаджыс":**

*— Кітайская карпарацыя Huawei у пачатку 2014 года стала першым рэзідэнтам індустрыяльнага парка "Вялікі камень", зарэгістраваўшы ў ім кампанію "Бел Хуавэй Тэхналаджыс". Упэўнены, гэта яшчэ адзін дадатковы крок, які дорыць народам Беларусі і Кітая магчымасць стаць бліжэй адзін да аднаго. Асноўная ідэя нашай кампаніі — не продаж тавараў. Брэнд HUAWEI хоча зрабіць жыццё беларусаў лепшым, а краіну больш багатай і прагрэсіўнай.*

*Наша прысутнасць на рынку, у тым ліку і рэзідэнцтва ў парку "Вялікі камень", мае некалькі мэт. У іх ліку, у прыватнасці, садзейнічанне развіццю дружбы абедзвюх краін, дапамога мясцовым аператарам у павышэнні якасці сеткі перадачы дадзеных, паніжэнні расходаў на сувязь, павышэнні агульнага ўзроўню камунікацый. Да прыярытэтаў таксама адносяцца стварэнне працоўных месцаў (у мясцовым аддзяленні кампаніі больш за 75 працэнтаў работнікаў — беларусы), падтрымка навуковых даследаванняў, рэалізацыя стратэгіі ІКТ-трансфармацыі Урада, павелічэнне распаўсюджвання высакахуткаснага доступу ў інтэрнэт ды іншыя напрамкі.*

*Кампанія Huawei актыўна інвестуе ў падрыхтоўку будучых прафесіяналаў тэлекамунікацыйнай галіны і адкрывае навучальныя лабараторыі ды інавацыйныя інжынерна-адукацыйныя цэнтры на базе вядучых ВНУ Беларусі. Акрамя таго, мы хацелі б стварыць адкрытую, узаемавыгадную галіновую экасістэму, якая дасць канчатковым карыстальнікам магчымасць адчуць усе перавагі рэалізуемай канцэпцыі ROADS. Экасістэма адначасова стане і апорай па пашырэнні бізнесу аператараў, і стымулам лічбавай трансфармацыі вертыкальных галін. Прысутнасць карпарацыі Huawei спрыяе павышэнню інвестыцыйнай прывабнасці Беларусі.*

ецца распрацаваць праект забудовы адміністрацыйна-жылой зоны, пасля чаго плануецца пачаць будаўніцтва першых аб’ектаў жылой і сацыяльнай інфраструктуры. У 2017-м у парк будуць арганізаваны аўтобусныя маршруты са Смалявіч і Мінска.

Парк “Вялікі камень” задумваўся як унікальная пляцоўка для інвестараў, на якой размесцяцца высокатэхналагічныя вытворчасці, якія выпускаюць самую сучасную прадукцыю. Аднак чаргі жадаючых стаць рэзідэнтам парка пакуль не назіраецца: летась дагавор падпісала толькі адна кампанія. Сёння ў парку зарэгістравана 8 рэзідэнтаў, а таксама 12 кампаній, якія не маюць яшчэ гэтага статусу. Чаму ж інвестары пакуль не спяшаюцца займаць месцы на новай пляцоўцы?

## Усе аспекты канкурэнцыі

У жніўні мінулага года генеральны выканаўчы дырэктар парка “Вялікі камень” Ху Чжэн пералічваў прычыны, з-за якіх справа ідзе натужліва. Адна з іх — не самыя мяккія патрабаванні да рэзідэнтаў.

— Крытэрыі для інвестараў і рэзідэнтаў на стадыі стартапа варта змякчыць, а таксама пашырыць напрамкі іх дзейнасці. Інакш прыцягненне інвестыцый будзе вельмі праблематычным, — заявіў тады Ху Чжэн. Акрамя таго, неспрыяльнымі фактарамі ён назваў слабае інфармаванне аб праекце ў свеце і глабальныя праблемы ў эканоміцы.

У прыватнасці, ёсць і іншыя моманты. Напрыклад, наша краіна сёння прайграе канкурэнцыю за інвестараў партнёрам па ЕАЭС. Расія і Казахстан, напрыклад, прапаноўваюць кампаніям больш выгадныя ўмовы для работы: ПДВ ніжэйшы, чым у нас, бясплатнае прадастаўленне ўчасткаў з гатовай інфраструктурай, за якую інвестару плаціць са сваёй кішэні не давядзецца. А таму бізнес, які прывык лічыць грошы, усё гэта аналізуе і абыходзіць нашу краіну бокам. Нагадаем першапачатковыя патрабаванні для таго, каб стаць рэзідэнтам парка: інвестыцыі ў памеры не меншым за 5 мільёнаў долараў, а таксама прадпрыемства павінна прадстаўляць пэўныя віды дзейнасці — машынабудаванне, электроніку, біятэхналогіі, лагістыку, тонкую хімію, новыя матэрыялы, фармацэўтыку.

— На практыцы мы сутыкнуліся з пэўнымі нюансамі, якія патрабуюць карэкціровак, — прызнаецца Кірыл Карацееў. — Высокатэхналагічнае прадпрыемства не прыйдзе туды, дзе няма базавай інфраструктуры, дзе ніхто не працуе. Таму неабходна ўстанаўліваць больш гібкія патрабаванні. Перш за ўсё, гаворка ідзе пра дадатковыя перспектыўныя віды дзейнасці: пералік, у прыватнасці, будзе пашыраны ІТ-бізнесам, медыясферай, медыцынскімі паслугамі ды іншымі сегментамі. Акрамя таго, мы гатовыя прадастаўляць рэзідэнтам не проста зямельны ўчастак з інфраструктурай, а гатовае вытворчае памяшканне. Гэта паменшыць расходы інвестара.


ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

У Кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка таксама нагадваюць аб тым, што з гэтага года для рэзідэнтаў свабодных эканамічных зон (СЭЗ) інвестыцыйны парог зніжаецца з 1 мільёна еўра да 500 тысяч (пры ўмове інвеставання на працягу трох гадоў са дня заключэння дагавора). Зразумела, па дадзенай умове парк пакуль прайграе. Кітайскія партнёры звяртаюць на гэта ўвагу і просяць ліквідаваць такую канкурэнцыю хоць бы на ўнутраным рынку.

## Па сутнасці



**Алег ПЛАЎСКІ, намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта:**

*— Мінаблвыканкам з’яўляецца другім па велічыні акцыянерам індустрыяльнага парка “Вялікі камень”: ад імя краіны на будучыя этапы развіцця праекта плануецца ўкласці каля 37 мільёнаў долараў. Летась у парку актыўна стваралася інфраструктура, апошнія работы па ёй будуць завершаны на працягу 1-2 месяцаў. Цяпер першарадная задача — прыцягнуць інвестараў. Так, пэўныя складанасці ёсць, і мы разумеем, што працаваць над вырашэннем пытання трэба ўсёй краінай.*

*Але тут важна разумець вось што: разглядаючы патэнцыйных рэзідэнтаў, не варта размяньвацца на танныя прапановы. Сёння і ў вобласці, і ў краіне ў цэлым створана дастаткова пляцовак для рэалізацыі ардынарных ідэй. “Вялікі камень” ствараўся для інавацыйных праектаў, за кожнага інвестара, які прыходзіць з тэхналогіямі будучыні, мы трымаемся. Усё-такі індустрыяльны парк павінен быць перспектыўнай пляцоўкай, на якой будзе грунтавацца высокатэхналагічная вытворчасць.*

*Што датычыцца рэзідэнтаў, то на першапачатковым этапе акцэнт ставіўся на беларускіх і кітайскіх кампаніях. Але мы бачым, што вялікіх перспектыў толькі на двухбаковым супрацоўніцтве не будзе. Трэба, каб пляцоўка была прывабнай і для іншых інвестараў. Таму цяпер “Вялікі камень” актыўна рэкламуецца на міжнароднай арэне. Зацікаўленасць ужо праяўляюць і еўрапейскія кампаніі. У будучыні было б правільна, калі б рэзідэнты стварылі венчурны фонд і фінансавалі перспектыўныя распрацоўкі. Усе гэтыя фактары ў сукупнасці і дапамогуць стварыць тую інвестыцыйную прывабнасць, якая планавалася першапачаткова. Цяпер ужо прапрацоўваюцца захады па змякчэнні клімату для рэзідэнтаў, у тым ліку ў падатковай сферы. Пры гэтым асабліва важна, каб першапачатковыя правілы гульні заставаліся нязменнымі і стабільнымі.*


Сёння рэзідэнтамі парка з'яўляюцца 8 кампаній, яшчэ 12 юрасобаў зарэгістраваны, а 17 праектаў знаходзяцца на этапе бізнес-планавання

*З пачатку рэалізацыі праекта ў развіццё парка інвеставана каля* **235** *мільёнаў долараў, доля бюджэтных сродкаў склала каля* **5** *працэнтаў. Асваенне парка вядзецца паэтапна, 1-ы этап (плошча* **851** *га) падзелены на падэтапы, цяпер асвойваецца стартавая зона плошчай* **354** *га. Усяго прадугледжана 6 этапаў, з пачаткам асваення апошніх з іх у 2025-2030 гадах*

Яшчэ адзін момант, з-за якога зарэгістраваныя ў парку кампаніі не спяшаюцца пераходзіць у статус рэзідэнтаў: лічыльнік на прэферэнцыі (вызваленне ад падатку на прыбытак на першыя 10 гадоў і паніжэнне стаўкі на 50 працэнтаў на наступныя 10 гадоў) пачынае працаваць з моманту рэгістрацыі. Калі прадпрыемства пабудуюць за 2-3 гады, то гэта аўтаматычна адрэжа ад тэрміну карыстання прывілеямі салідны кавалак. Гэта стрымлівае патэнцыйных інвестараў ад падпісання дагавора аб рэзідэнцтве. "Спачатку пабудуем вытворчасць, а потым ужо ва ўрачыстай абстаноўцы і паперы станем падпісваць", — так разважаюць многія.

— У нашай рэчаіснасці гэты момант сябе не апраўдаў, — не скрывае Кірыл Карацееў. — Першапачаткова мы чакалі, што такі падыход будзе стымуляваць рэзідэнтаў будаваць магутнасці хутчэй. Але гэтага не адбылося: ад атрымання ўсіх тэхнічных умоў да выдачы дазволу на будаўніцтва праходзіць 1-2 гады. Думаю, тут павінна быць такая практыка, як у нашых СЭЗ, а таксама ў партнёраў у Расіі і Казахстане. Лічыльнік на льготы павінен уключацца з моманту ўзнікнення падатковай базы. Гэты прынцып з'яўляецца найбольш прывабным для праектаў, якія рэалізуюцца ў "чыстым полі".

## Плюшкі для інвестара

Для таго каб палегчыць умовы рэзідэнтам і павысіць інвестыцыйную прывабнасць парка, рыхтуецца праект указа Прэзідэнта. Яго распрацоўшчыкі прапісалі шырокі шэраг прэферэнцый і бонусаў, прыняцце якіх дапаможа прыцягнуць у краіну інвестыцыі, у першую чаргу прамыя замежныя.

Па частцы адміністрацыйнага напрамку прапаноўваецца ўкараніць службу "Адно акно" непасрэдна ў адміністрацыі парка, што дасць магчымасць пазбегнуць лішніх бюракратычных працэдур. Акрамя таго, прызнаюць у Кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка, патэнцыйных інвестараў адпужваюць зменлівае заканадаўства і ўмовы вядзення бізнесу. У гэтай сувязі неабходна закласці і ўзмацніць прынцып нязменнасці рэжыму работы парка.

— Зменлівыя ўмовы адпужваюць многіх інвестараў, асабліва еўрапейскіх, значна больш, чым, напрыклад, высокія падатковыя стаўкі, — тлумачыць Кірыл Карацееў. — Для рэзідэнтаў павінны быць нязменныя ўмовы. У розных краінах працуе так званая "дзядулева агаворка" — прынцып абароны інвестара ад змены заканадаўства прымаючага боку, які з'яўляецца гарантыяй непагаршэння рэжыму на ўвесь тэрмін рэалізацыі інвестпраекта.

У сферы мытнага рэгулявання кітайскі бок унёс сваю прапанову: стварыць у парку рэжым так званай бондавай зоны. Існуе юрыдычная магчымасць сумясціць тэрыторыю парка з Нацыянальным аэрапортам "Мінск" і карыстацца рознымі мытнымі прэферэнцыямі "партовай зоны". Акрамя гэтага, рэзідэнты разлічваюць на паслабленні ў сферы працоўных адносінаў і міграцыі. Паводле слоў Кірыла Карацеева, для патэнцыйных інвестараў і рэзідэнтаў было б няднрэнна ўвесці бязвізавы ўезд у краіну на тэрмін да 180 сутак у год:

— Пра гэтую ідэю мы думаем ужо даўно, кітайскія калегі яе падтрымліваюць. Пэўныя захады ў гэтым напрамку наша краіна ўжо зрабіла. У Беларусі ёсць досвед асаблівага рэжыму і на Аўгустоўскім канале, і ў Белавежскай пушчы. Плюс пяцідзённы бязвізавы рэжым, уведзены нядаўна. Але патэнцыйнаму інвестару гэтага часу не хопіць, і заходнія партнёры на гэта звяртаюць увагу. Для іх гэта сігнал адкрытасці. Акрамя таго, гэта дасць штуршок развіццю дзелавога турызму.

Другі немалаважны крок — зніжэнне кошту арэнды. У кіраўніцтве Кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка прызнаюцца, што не збіраюцца рабіць бізнес на зямлі: стаўкі ўжо ніжэйшыя за сабекошт зямельных участкаў. Аднак гэтага пакуль недастаткова, а таму заканадаўцу прапаноўваецца прадугледзець вызваленне рэзідэнтаў ад ПДВ на зямлю. Чакаецца, што дакумент прадставяць на разгляд ва Урад у гэтым месяцы. На думку Кірыла Карацеева, ужо праведзена вялікая работа над памылкамі і новыя правілы гульні павінны выклікаць усплёск цікавасці з боку замежных інвестараў.

**Ролю прыватнага сектара ў эканоміцы цяжка пераацаніць. У некаторых краінах яго доля ў ВУП перавышае 50 працэнтаў. У нас гэты паказчык удвая меншы, але ён увесь час расце. Сёння ў недзяржаўным сектары занята амаль 1,2 мільёна чалавек, гэта значыць практычна кожны чацвёрты работнік. Тым важней улічваць лепшы сусветны досвед у законах, указах і пастановах. Як бы пафасна гэта ні гучала, але, мяркуючы па ўсім, сёння мы становімся сведкамі выбудоўвання якасна новых адносінаў улады і бізнесу. Пацверджаннем таму стала і стварэнне рабочай групы па стымуляванні дзелавой актыўнасці. Яе дзейнасць — гэта дакладны сігнал гатоўнасці дзяржавы да спрашчэння праверак ды іх абмежавання, аптымізацыі нарматыўных патрабаванняў і адміністрацыйных працэдур. Усё гэта важны крок да развіцця добрасумленнай і справядлівай канкурэнцыі ў эканоміцы. Як паскорыць рух у гэтым напрамку, што яшчэ неабходна зрабіць для фарміравання канкурэнтнага асяроддзя і якая роля дзяржавы ў гэтым працэсе?**

# Калі стратэгіі супадаюць...

Калі мы параўноўваем умовы і тэмпы развіцця малога бізнесу ў Беларусі з іншымі дзяржавамі, трэба ўлічваць, што ў развітых краінах, асабліва ў ЗША, эканоміка вырастала на працягу амаль 200 гадоў менавіта з малых прадпрыемстваў. У нас жа эканоміка перабудоўваецца ўсяго толькі 20 гадоў, пачынаючы з прадпрыемстваў-гігантаў. А гэта, як гавораць у Адэсе, дзве вялікія розніцы. У краіне яшчэ не створаны ў поўнай меры механізмы для эфектыўнага ўзаемадзеяння прадпрымальнікаў з рынкамі, дзяржавай і паміж сабою. Адгэтуль многія праблемы і складанасці.

Калі ў заходніх краінах прыярытэтам было стварэнне новых працоўных месцаў шляхам росту малога бізнесу і канкурэнцыі, то ў нашых умовах дзяржаўным прыярытэтам застаецца захаванне існуючых працоўных месцаў на буйных прамысловых прадпрыемствах і пратэкцыянізм для вялікай сацыяльнай сферы. Прадпрыемствы Белнафтахіма, МАЗ, МТЗ, МЗКЦ, БелАЗ ды іншыя — не толькі асноўныя пастаўшчыкі валюты, але і гаранты сацыяльнай стабільнасці. Калі б яны перасталі існаваць, то пацягнулі б за сабою і эканоміку краіны, і ўсе ліберальныя пачаткі. Трансфармацыя эканомікі, як паказвае досвед Паўднёвай Карэі, Кітая ды іншых краін, патрабуе паступовасці, вялікіх намаганняў і рэсурсаў. Хуткі пераход да рынку, калі б ён быў у нашых умовах рэалізаваны, пагражаў бы вялікім беспрацоўем і сацыяльнай нестабільнасцю з-за падзення ўзроўню жыцця.


З пункту гледжання Барыса Паньшына

За гады незалежнасці многае змянілася ў малым бізнесе. Частка малых прадпрыемстваў моцна ўрасла ў эканоміку краіны. У такіх сектарах, як гандаль, аказанне бытавых і будаўнічых паслуг, транспарт, інфармацыя і кансалтынг, доля малога бізнесу, у тым ліку дзяржаўнага, складае ад 50 да 80 працэнтаў і адпавядае еўрапейскім паказчыкам. Паспяхова асвойваюцца сферы медыцыны, адукацыі, дашкольнага выхавання, навуковы бізнес.

Праблемы ўзнікаюць тады, калі глабальная палітыка дзяржавы не стыкуецца з тактычнымі інтарэсамі прыватнага біз-


BELTA

На прыватным прадпрыемстве па вытворчасці мэблі ў Баранавіцкім раёне

***За гады незалежнасці многае змянілася ў малым бізнесе. Частка малых прадпрыемстваў моцна ўрасла ў эканоміку краіны. У такіх сектарах, як гандаль, аказанне бытавых і будаўнічых паслуг, транспарт, інфармацыя і кансалтынг, доля малога бізнесу, у тым ліку дзяржаўнага, складае ад 50 да 80 працэнтаў і адпавядае еўрапейскім паказчыкам. Паспяхова асвойваюцца сферы медыцыны, адукацыі, дашкольнага выхавання, навуковы бізнес***

несу. Напрыклад, стратэгія напаўнення бюджэту абумовіла высокія стаўкі на арэнду і кошт крэдытаў. Стратэгія забеспячэння бяспекі прывяла да росту колькасці разнастайных правілаў і праверак па іх выкананні. Стратэгія па абароне ўнутранага рынку і захаванні працоўных месцаў на айчынных прадпрыемствах супярэчыць некантралюемаму імпарту шырспажыву, які завозяць прадпрымальнікі. Таму ўвесь гэты час дзяржава не тармазіла малы бізнес, а спрабавала ўбудаваць яго развіццё ў траекторыю агульнадзяржаўных задач.

Калі стратэгіі супадаюць, то развіццё ідзе хуткімі тэмпамі. Дзе ёсць стыкоўка, там прагрэс, разнастайнасць і канкурэнцыя бізнесаў. Яркі прыклад таму — Парк высокіх тэхналогій, калі стратэгія развіцця IT-бізнесу супала са стратэгіяй дзяржавы па замацаванні ў краіне высокакваліфікаваных праграмістаў. Той жа станоўчы досвед — у стварэнні прыватных медыцынскіх цэнтраў, аграсядзіб, аўтазаправак, кансалтынгавых кампаній. Цяпер у аснове вырашэння астатніх супярэчнасцяў дзяржава ўсё больш разлічвае на дыялог з прадпрымальнікамі, і прагрэс будзе куды больш значны.

Яшчэ адна складаная задача дзяржавы ва ўсіх краінах — забеспячэнне справядлівай канкурэнцыі і абароны ад манапалізму. Логіка прыватнага бізнесу такая, што ён пастаянна імкнецца да манаполіі. Спачатку ён просіць падтрымкі і пратэкцыянізму, запэўніваючы грамадства ў сваёй карыснасці, затым максімальна пашырае сферу дзейнасці, бязлітасна выцясняючы слабых канкурэнтаў. І тады прыхільнікі бязмежнай свабоды прадпрымальніцтва раптам становяцца відушчымі і просяць дапамогі дзяржорганаў. Наглядным прыкладам можа служыць канфлікт вытворцаў харчавання з гандлёвымі гіперсеткамі, доля якіх у розніцы дасягнула амаль 50 працэнтаў замест вызначанай законам квоты 20 працэнтаў. У розніцы гіперсеткі атрымалі такую сілу, што пачалі вымушаць пастаўшчыкоў рабіць усё большыя оптавыя зніжкі, парушаць тэрміны разлікаў за пастаўленую ў магазіны прадукцыю. У выніку вытворца атрымлівае з аднай адзінкі тавара менш за 10 капеек, у той час як гіперсетка ў 5-7 разоў больш. Каб выжыць, ён вымушаны ўвесь час павышаць оптавыя цэны, што прыводзіць да падаражэння прадуктаў для насельніцтва і стратнасці прадпрыемстваў. Калі ў адсутнасць дастатковага самакантролю і сацыяльнай адказнасці прыватнага бізнесу будзе аслаблены абгрунтаваны дзяржаўны нагляд, то ўсё будзе адбывацца па прынцыпе “здароў, граблі, мы па вас сумавалі”. Вось чаму працэсам лібералізацыі трэба надзейна кіраваць, накіроўваць яго ў канструктыўны бок, паказваць, як трэба дзейнічаць, і строга растлумачваць, як не трэба.

Барыс **Паньшын,**
прафесар эканамічнага факультэта БДУ



# Зазірнуць глыбей у нетры

## Што часцей, акрамя нафты і алмазаў, знаходзяць беларускія геолагі

НАДЗЕЯ ПАНКРАТАВА

*Мэтавы паказчык прыросту нафты —* **600** *тысяч тон у год*



Калі размова заходзіць пра карысныя выкапні, мы разводзім рукамі. Маўляў, чаго няма, таго няма — бедныя нашы нетры. Але геолагі супраць такой пастаноўкі пытання. Так, у нас няма ў лішку нафты і прыроднага газу, але прамысловыя запасы тых жа калійных соляў ацэньваюцца ні многа ні мала больш як у 7 мільярдаў тон!

Штогод у нас здабываюць 45-50 мільёнаў тон гэтага карыснага выкапня, а на экспарт ідзе 5-6 мільёнаў тон. Таму нядзіўна, што перад профільнымі арганізацыямі ставіцца задача па павышэнні ўзроўню геалагічнай вывучанасці патэнцыялу нашых нетраў і забеспячэнні патрэбы галін эканомікі ўласнай мінеральнай сыравінай.

Утрымліваць існуючыя паказчыкі і нарошчваць іх — такія задачы па нафце. Сёння мы здабываем 1,6 мільёна тон у год і ў 2016 годзе з гэтай задачай справіліся.

— Мэтавы паказчык прыросту запасаў нафты — каля 600 тысяч тон у год, ён за 2016 год выкананы на 124,7 працэнта, — гаворыць начальнік упраўлення па геалогіі Мінпрыроды Сяргей Мамчык. — Як мы гэтага дасягаем? Далучаем да гаспадарчага абароту

залежы з цяжкавымальнымі запасамі, працуем над пошукам і распрацоўкай новых. Напрыклад, запасы Паўднёва-Шацілкаўскага радовішча нафты на Гомельшчыне ацэньваюцца больш як у 100 мільёнаў долараў. Пры гэтым геолага-разведачныя работы каштавалі значна менш: бурэнне адной свідравіны абышлося ў суму каля 2-2,5 мільёна ў замежнай валюце. На перспектыву разглядаем яшчэ адно нафтавае радовішча Гомельшчыны — Вугальскае. Яго геалагічныя запасы ацэньваюцца прыкладна ў 1,7 мільёна тон нафты.

Паводле слоў выконваючага абавязкі намесніка генеральнага дырэктара "ВА "Беларуснафта" Пятра Поўжыка, у краіне выяўлена 82 радовішчы нафты, у распрацоўцы знаходзяцца каля 60 з іх. Абсталяванне, якое выкарыстоўвае прадпрыемства, самае сучаснае, у тым ліку беларускай вытворчасці. Напрыклад, буравыя ўстаноўкі глыбокага свідравання, якія выпускаюцца сумесна з італьянскай кампаніяй Drillmec.

— На 2017 год мы ставім перад сабою амбіцыйныя задачы і па павелічэнні палявых сейсмічных работ, і ў цэлым па прыросце запасаў, — гаворыць ён. — Тым не менш часцяком новыя адкрытыя радовішчы маюць недастаткова вялікі па-







тэнцыял і рэсурсавую базу, якая магла б кампенсаваць нам гадавыя патрэбы здабычы. Апошнім часам кампенсацыя гадавой здабычы нафты за кошт прыросту запасаў не перавышае 60-65 працэнтаў. Таму стаўка робіцца на інавацыі.

Такія інавацыі нашы навукоўцы ў садружнасці з навукоўцамі Расіі і ў рамках саюзных праграм геолагам прадастаўляюць. Так, у самы бліжэйшы час ім на дапамогу павінен прыйсці суперкамп'ютар "Скіф-геа", які ў аддаленым доступе зможа вырашыць цэлы шэраг задач, звязаных з геолагаразведкай. Паводле слоў намесніка генеральнага дырэктара Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Сяргея Круглікава, такі суперкамп'ютар зможа аператыўна ажыццяўляць разлікі, у тым ліку на радовішчах. І скараціць вырашэнне пэўных задач з 46-47 гадзін да 7-8 хвілін.

Зрэшты, эканоміка краіны сёння зацікаўлена не толькі ў нафце, але і ў такіх карысных выкапнях, як каменная соль, мел, пясок, пясчана-гравійныя сумесі. Пакуль яны здабываюцца пад патрэбы прадпрыемстваў, гаворыць Сяргей Мамчык. Але існуе пэўны рэзерв для выхаду на знешнія рынкі. І такія прыклады ёсць. У прыватнасці, за мінулы год экспарт шчэбню перавысіў паказчык 2015 года больш як у 2,5 раза і прынёс у казну больш за 65 мільёнаў долараў.

Патэнцыял карысных выкапняў, пераканаdebug геолагі, трэба задзейнічаць актыўней. Ёсць, напрыклад, перспектыва ў сапрапелю, а дакладней, ва ўгнаеннях на яго аснове, якія могуць стаць яшчэ адным артыкулам нашага экспарту.

— Акрамя будаўнічай сыравіны на аснове нашых базальтаў, артыкулам экспарту могуць стаць угнаенні з сапрапелю, — гаворыць Сяргей Мамчык. — Гэта стала зразумела падчас праведзеных візітаў кіраўніка дзяржавы ў такія краіны, як Арабскія Эміраты, Катар, Саудаўская Аравія, дзе ёсць пэўная цікавасць па развіцці земляробства. А ў пустыні неабходнай крыніцай для атрымання ўраджаю з'яўляюцца арганамінеральныя ўгнаенні.

Яшчэ адной крыніцай даходу могуць і павінны стаць інвестыцыйныя праекты па асваенні радовішчаў карысных выкапняў. Напрыклад, кошт толькі праекта па радовішчах калійных соляў ацэньваецца больш як у 3 мільярды долараў. Гаворка ідзе пра асваенне Петрыкаўскага радовішча, новых участкаў Старобінскага.

Даходы могуць прыносіць і адходы, даказаў Інстытут геалогіі НВЦ па геалогіі. Адной з першых ластавак стала выкарыстанне адвалаў, якія ўзнікаюць на кар'ерах па здабычы будаўнічага каменю. Такіх як на Мікашэвіцкім радовішча.

— У 2016 годзе мы атрымалі доследныя ўзоры сілікатных матэрыялаў шматмэтавага прызначэння — керамічныя вырабы для сферы будаўніцтва, мінеральнае валакно, шклокрышталічны матэрыял, — расказала дырэктар інстытута Вольга Бярозка. — Іх якасць не саступае імпартным керамічным вырабам.

Вывучэнне выкарыстання другаснай сыравіны будзе прадоўжана сёлета на радовішчы Дыябазавае. А вынікам, паводле слоў Вольгі Бярозкі, стане падрыхтоўка тэхналагічных рэкамендацый на атрыманне нетрадыцыйнай ды імпартазамяшчальнай сыравіны на аснове другаснай перапрацоўкі.

Вераніка **Арцем'ева**



Беспілотны авіяцыйны комплекс “Буравеснік МБ” — брэнд, вядомы ва ўсім свеце. Ён паспяхова прымяняецца ратавальнікамі ды іншымі сілавымі ведамствамі краіны. Важыць ён 250 кг, працуе на рухавіку ўнутранага згарання і можа аддаляцца ад наземнага пункта кіравання на адлегласць да 300 км

# Дронам зверху бачна шмат

## Да канца года ў Мінску пачнецца масавая вытворчасць квадракопцераў

НАДЗЕЯ ПАНКРАТАВА

Вырабляць будуць устройствы не для забавы, а для сур'ёзных мэт. Адзін від дрона зможа весці высакаякасную здымку ў фармаце Full HD на адлегласці да 10 км і спатрэбіцца розным міністэрствам і ведамствам. А другая мадэль беспілотніка дапаможа канкрэтна аграрыям — апрацоўваць і маніторыць палі. Выпрабаванні дрона пройдуць ужо ўлетку, на рынку ён з'явіцца да канца гэтага года. Наша карэспандэнт даведалася пра падрабязнасці аб навінцы.

Макетны ўзор цяпер праектуюць на прадпрыемстве "Навукова-вытворчы цэнтр шматфункцыянальных беспілотных комплексаў" НАН. Там, дзе ўжо пяць гадоў вырабляюць брэнды, вядомыя ва ўсім свеце, — "Бусел", "Буравеснік", "Дырыжабль".

"Акрамя паставак беспілотнікаў, плануем наладжваць іх вытворчасць на плошчах патэнцыйных заказчыкаў. Пералік краін-пакупнікоў пастаянна пашыраецца. У хуткім часе ў іх ліку можа апынуцца і Эквадор", — расказвае пра перспектывы Аляксандр Шчаўлеў, намеснік дырэктара НВЦ.

Да прыкладу, на іншым кантыненце зацікавіліся мадыфікаванымі авіякомплексамі "Бусел" з радыусам дзеяння да 60 км. На іх можна ўстанавіць абсталяванне для фота-, відэа-, інфрачырвонай або мультыспектральнай здымкі. У нас, дарэчы, яны паспяхова прымяняюцца ратавальнікамі.

Новая ж распрацоўка навукоўцаў, квадракоптеры, аблегчыць работу пагранічнікам, міліцыі, службам аховы жывёльнага і расліннага свету, а таксама аграрыям. Асаблівую лінейку дронаў плануюць выкарыстаць для распылення ўгнаенняў. "Апырскванне палёў з паветра значна паменшыць затраты на гэтыя мэты, апаратура таксама зможа кантраляваць стан сельгасугоддзяў, працэс паспявання культур — гэта дапаможа значна павысіць ураджайнасць", — гаворыць Аляксандр Шчаўлеў. Квадракоптеры здольныя лятаць на вышыні да 1 км. Але ў дадзеным выпадку, каб хімікаты не выпараліся, не разляталіся, а траплялі дакладна ў цэль, апарат зможа лёгка арыентавацца вельмі нізка над зямлёй — ад 1 да 5 метраў.

Дарэчы, да гэтага дроны не прымяняліся ў аграпрамысловым комплексе краіны. Такія функцыі выконвала хіба што аўтатрактарная і малапамерная пілатуемая тэхніка. А за мяжой да "паветранага" метаду ўжо даўно прыглядаюцца. Але справа рухаецца даволі павольна. Таму наша распрацоўка зацікавіць пакупнікоў і на знешнім рынку.

У адрозненне ад папулярных беспілотнікаў, якія лятаюць з хуткасцю 60-120 км/г, у квадракоптераў ёсць відавочныя перавагі. Новая распрацоўка зможа ў прамым сэнсе завісаць над аб'ектам. Такая функцыя да гэтага была толькі ў авіяцыйнага комплексу экалагічнага маніторынгу на базе дырыжабля — яго хуткасць перамяшчэння ад 0 да 40 км/г. Праўда, "грузіць" дадатковую апаратуру, напрыклад, для апырсквання палёў, на яго нельга.

Дыяметр навінкі для высакаякаснага маніторынгу — 1,5 м. Для патрэбаў сельскай гаспадаркі — крыху большы. Розніца і па вазе: 5-8 кг і звыш 25 кг адпаведна. Папулярныя квадракоптеры, якія мы бачым у магазінах, лятаюць на адлегласць да 500 м ад пульта кіравання. Каб імі кіраваць, дрон павінен быць у межах бачнасці чалавека. Наш апарат зможа аддаліцца на значную адлегласць — ад 5 да 10 км. Гэта магчыма дзякуючы поўнай аўтаматыцы комплексу", — тлумачыць суразмоўца.

Так, аператар увесь час будзе знаходзіцца за камп'ютарам. Задасць маршрут, адзначыць пункты пэўных задач. Усё, што "бачыць" квадракоптер, у рэжыме рэальнага часу будзе трансляваецца на маніторы аператара. Той, у выпадку чаго, зможа адкарэкціраваць дзеянні беспілотніка ці задаць каманду на экстранную пасадку. За ўсім працэсам можа назіраць аграном — даваць рэкамендацыі, куды лепш накіраваць апарат.

Пакуль ствараецца макет вырабу, спецыялісты падлічваюць яго кошт. "Цана апарата для высокатэхналагічнага маніторынгу на сусветным рынку вар'іруецца ад 70 да 80 тысяч долараў. Кошт нашых распрацовак мы плануем зрабіць значна ніжэйшы", — анансуе Аляксандр Шчаўлеў.

Мадэль для патрэбаў аграрыяў і зусім абыдзецца прыкладна ў 20 тысяч долараў. Паводле папярэдніх разлікаў, адзін палёт дрона будзе абыходзіцца ў 25-30 долараў. Гэта значна менш, чым выкарыстанне наземнай тэхнікі ці існуючых лятальных апаратаў. Новы комплекс, улічваючы даволі высокі рэсурс, зможа акупіцца ўсяго за адзін сельскагаспадарчы сезон.

Выпрабаванні квадракоптера пройдуць ужо ўлетку, а масавая вытворчасць пачнецца ў канцы гэтага года. Не выключана, што для гэтых мэт штат вытворчага ўчастка НВЦ, які цяпер налічвае 80 чалавек, давядзецца павялічыць. Плануецца, што спецыялісты будуць выпускаць да 30 штук наймаўшых лятальных устройстваў у год.

Дарэчы, у планах навукоўцаў таксама стварыць беспілотны верталёт для перавозкі грузаў і людзей.

Юлія **Парамонава**



БЕЛТА

Падчас кіравання беспілотнікам аператар знаходзіцца за камп'ютарам

# Новая крэдытная гісторыя

## На што беларусы часцей бяруць крэдыты і чаму банкі робяць больш жорсткімі правілы выдачы пазык

Што рабіць, калі хочацца новенькі тэлефон, кватэру, машыну, адпачынак на марскім беразе, а грошай не хапае? Рэклама раіць купіць “мару” ў растэрміноўку ці аформіць крэдыт. Вось толькі беларусы, у адрозненне ад амерыканцаў, еўрапейцаў, японцаў або нават бліжэйшых суседзяў, у пытаннях жыцця ў пазыку аказаліся куды больш стрыманымі. Па статыстыцы, колькасць крэдытаатрымальнікаў у краіне традыцыйна трымаецца на ўзроўні 20-25 працэнтаў. Больш за тое, па запэўніванні банкіраў, колькасць праблемных кліентаў у нас мінімальная. На што нашы грамадзяне часцей за ўсё бяруць пазыку і чаму фінустановы робяць больш жорсткімі правілы выдачы пазык — разбіраемся разам з экспертамі.





***Каля 30 працэнтаў крэдытаатрымальнікаў звяртаюцца па пазыкі 1-2 разы ў год, столькі ж — 1-2 разы ў квартал. Кожны пяты пазычае грошы амаль кожны месяц, кожны шосты — штомесяц***

Нягледзячы на прыкметнае паніжэнне сярэдніх працэнтных ставак па новых крэдытах летась (з 29,3 працэнта гадавых у студзені да 19,4 працэнта ў снежні), для большасці грамадзян яны па-ранейшаму застаюцца вельмі высокімі. Менавіта гэты фактар, згодна з сумесным даследаваннем Нацбанка і Альянсу за фінансавую даступнасць, стаў асноўнай прычынай адмовы ад банкаўскіх пазык: пра яе заявілі 45,7 працэнта рэспандэнтаў. На другім і трэцім месцы — нежаданне нікому быць абавязанымі і недахоп грошай для выплаты па крэдытных абавязацельствах. Разам з тым стабільная колькасць беларусаў па-ранейшаму рэгулярна пазычае грошы ў фінустаноў. Для якіх мэт?

Сёння сярод крэдытаў, даступных на фінансавым рынку краіны, лідзіруе крэдыт на куплю тавараў з растэрміноўкай плацяжу (45,4 працэнта). Доля пазык на бягучыя расходы (спажывецкі крэдыт) перавышае 31 працэнт. За апошнія чатыры гады, па назіранні экспертаў, гэтыя долі на рынку памяняліся: крэдытных прадуктаў на спажывецкія патрэбы стала выдавацца менш, а вось растэрміноўка плацяжу, наадварот, становіцца больш запатрабаванай. Далей па папулярнасці ідуць крэдыты на будаўніцтва жылля, на рамонт, на куплю аўтамабіля.

Нагадаем, цяпер усе кліенты, якія жадаюць аформіць пазыку, могуць пазнаёміцца са сваёй крэдытнай гісторыяй. Такая магчымасць з'явілася паўтара года назад, калі Нацбанк пачаў прымяняць агульную скорынгавую мадэль для ацэнкі крэдытнай гісторыі фізасоб. Бясплатна такую інфармацыю можна атрымаць адзін раз у год па пісьмовай заяве. Начальнік упраўлення "Крэдытны рэгістр" Нацыянальнага банка Віктар Пленкін нагадвае, што ў крэдытным рэгістры знаходзіцца інфармацыя з усіх банкаў, мікрафінансавых арганізацый (МФА), у перспектыве дабавяцца ўсе лізінгавыя кампаніі.

Ацэньваючы вынік паўтарагадовай работы агульнай скорынгавай мадэлі, спецыяліст звяртае ўвагу: 56 працэнтаў крэдытных справаздач, якія Нацбанк прадастаўляў карыстальнікам у снежні мінулага года, ішлі ўжо са скорынгавай ацэнкай (бал ад 0 да 400). Паводле слоў Віктара Пленкіна, гэтыя дадзеныя не толькі цікавыя крэдыторам, але і дазваляюць прааналізаваць рынак:

— Сёння мы бачым: пачынаючы з 2014 года банкі мяняюць сваю палітыку і робяць больш жорсткімі патрабаванні для патэнцыйных крэдытаатрымальнікаў. Цяпер пазыкі выдаюцца кліентам, якія прайшлі найстражэйшы адбор. Калі раней асноўная маса кліентаў была з класам рэйтынгу B2, B3, то цяпер пераважае B1. Эфект ад гэтага праяўляецца праз пэўны перыяд, калі працэнт незвароту па выдадзеных крэдытах зніжаецца, гэта значыць даўгі вяртаюцца больш дысцыплінавана.

Тэндэнцыя зрушэння ў больш высокія класы ідзе з другой паловы 2014 года. Ацэньваючы клас рэйтынгу (з A па F), банкіры абапіраюцца на дакладны крытэрый: па якой колькасці крэдытаў адбылася пратэрміноўка больш за 90 дзён на працягу 12 месяцаў пасля заключэння дагавора. Максімальны паказчык такіх праблемных кліентаў у краіне быў на ўзроўні 4,1 працэнта ў пачатку 2014-га. Цяпер гэтая лічба ніжэйшая і сведчыць аб тым, што беларускія пазычальнікі вельмі дысцыплінаваныя, а рэальная колькасць дэфолтаў па крэдытах фізасоб мінімальная і не пагражае банкаўскай сістэме.

У той жа час праблемныя і неакуратныя кліенты ёсць. Напрыклад, у крэдытнага брокера Procredit.by іх каля 70 працэнтаў. Дырэктар кампаніі Ігар Лушчык гаворыць, што ў асноўным гэта людзі, якім у банку па тых ці іншых прычынах адмовілі ў выдачы крэдытаў, у якіх была або ёсць запазычанасць. Як правіла, грошы часцей за ўсё бяруцца на рамонт жылля, рэфінансаванне старых даўгоў, куплю аўтамабіля або нерухомай маёмасці, а таксама на развіццё бізнесу.

— Калі да нас прыходзіць чалавек, якому банк не выдаў пазыку, гэта не азначае, што кліент "сапсаваны". Прычыны могуць быць зусім розныя: пачынаючы ад неакуратнага ў плане плацяжоў сваяка і заканчваючы недастатковай плацежаздольнасцю. Аднак асноўная маса нашых кліентаў — крэдытапазычальнікі, у якіх былі пратэрміноўкі па звароце даўгоў.

Паводле слоў Ігара Лушчыка, шанцу атрымаць новую пазыку тым, у каго вісіць стары доўг і ёсць канфлікт з банкам, няма. Аднак юрысты могуць распрацаваць "дарожную карту" для даўжнікоў, якая дапамагае вырашыць канфлікт з фінустановай, выправіць крэдытную гісторыю і атрымаць новыя грошы.

А вось у Віктара Пленкіна іншая пазіцыя:

— Калі банк крэдыт не даў, значыць, і не трэба. Па адной простай прычыне: фінустанова адмаўляе не са шкоднасці, яна лічыць грошы і ацэньвае верагоднасць звароту. Далёка не заўсёды кліенты могуць аб'ектыўна разлічыць свае сілы і магчымасці. Калі банк ацаніў вашу крэдытаздольнасць і скорынгавы бал і вырашыў выдаць не дзесяць тысяч рублёў, а, скажам, пяць, то трэба гэта і лічыць магчымым. Дабівацца пазыкі любымі спосабамі не варта. Часцяком пасля адмовы з боку банка чалавек можа звяртацца ў незарэгістраваныя арганізацыі, якія, на жаль, часам працуюць па махлярскіх схемах.

Вольга **Вальчанка**

## Долі рынку ў агульным сегменце паслуг крэдытавання ў рэгіёнах краіны




НАДЗЕЯ ПАНКРАТАВА




УЛАДЗІМІР ШЛАПАК

# Маслам экспарт не сапсуеш

## Паводле дадзеных Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН, Беларусь — адна з самых паспяховых краін у свеце па забеспячэнні харчовай бяспекі

Каб атрымаць высокую ацэнку, беларускім аграрыям давялося добра папрацаваць. І хоць краіна не была пад прадуктовымі санкцыямі, больш жорсткім ворагам вяскоўцаў заўсёды заставаўся клімат. Як гавораць навукоўцы, Беларусь — гэта зона няўстойлівага земляробства. Гэта значыць год на год не прыпадае, і загадзя прагназаваць ураджаі — як варажыць на пальцах. Песімісты заўсёды сцвярджалі, што сельская гаспадарка Беларусі з'яўляецца цяжарам для дзяржаўнага бюджэту і ўкладваць грошы ў АПК — усё роўна, што іх у зямлю закопваць.

### У вёскі заваблівалі жыллём

Пасля распаду СССР і зацяжной турбулентнасці ў эканоміцы Беларусі трэба было неяк паднімаць сельскую гаспадарку. Таму з сярэдзіны 1990-х вёску пачалі падтрымліваць рознымі способамі. Гэта датацыі і льготныя крэдыты для сельгаспрадпрыемстваў. Неаднаразова гэтую палітыку крытыкавалі. На самай жа справе на датацыі даўно падсадзілі ўсю еўрапейскую сельскую гаспадарку. У Германіі на гектар сельгасугоддзяў вылучаюць каля 600 еўрадолараў, а ў Беларусі гэтая лічба ў 2014-м складала прыкладна 100 еўра.

Але якія б грошы ні ўліваліся ў сельскую гаспадарку, без кадраў на зямлі нікуды. “Прэзідэнцкія домікі”

— менавіта так назвалі ў народзе катэджы, што з'явіліся ў аграгарадках у пачатку XXI стагоддзя. Будынкі з усімі камунікацыямі і добраўпарадкаванай тэрыторыяй прымушалі па-іншаму паглядзець на сельскае жыццё і застацца працаваць на зямлі.

— У 1996-2000 гадах мы вырашылі задачу харчовай бяспекі, накармілі свой народ. У 2001-2005 гадах нарасцілі вытворчасць і прарваліся на замежныя рынкі, — успомніць пра тыя часы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

У апошняе дзесяцігоддзе краіна зрабіла стаўку на інавацыі ў АПК. З'явіліся аўтаматызаваныя фермы, сховішчы. Дзякуючы Дзяржпраграме адраджэння і развіцця вёскі было пабудавана амаль паўтары тысячы аграгарадкоў.

Але галоўным вынікам рэформаў на вёсцы стала тое, што краіна не толькі набіла свае засекі, але і надзейна замацавалася на сусветных рынках 63 краін.

## Мора ёсць! Малочнае

Сёння ўдзельная вага сельгасгаліны ў ВУП складае прыкладна 7-8 працэнтаў. Для параўнання — у Еўрасаюзе гэта тры працэнты.

У 2015 годзе краіна заняла трэцяе месца ў свеце па экспарце сметанковага масла. Гэта і ёсць адзін з вынікаў шматгадовай работы. Цяпер наперадзе толькі Еўрасаюз і Новая Зеландыя — сур'ёзныя гульцы на малочным рынку.

Цяпер на кожнага чалавека айчынныя прадпрыемствы выпрацоўваюць 743 кілаграмы малака. Гэта ў тры разы больш за норму спажывання. Лішкі ідуць на знешні рынак — каля 70 працэнтаў выраблямага ў краіне малака. На экспарце як "малочкі", так і іншых відаў харчавання штогод Беларусь зарабляе сотні мільёнаў долараў.

Яшчэ адзін флагман — мясная галіна Беларусі — лічыцца самай перадавой у СНД па аб'ёмах вытворчасці. Перапрацоўкай мяса займаюцца 26 буйных мясакамбінатаў і 450 прадпрыемстваў розных формаў уласнасці.

— Праблему харчовай бяспекі ў колькасным плане мы вырашылі яшчэ падчас рэалізацыі праграмы адраджэння і развіцця вёскі. Цяпер Беларусь цалкам забяспечвае свае патрэбы ў харчаванні. Больш за трыццаць прадуктаў, якія выпрацоўваюцца ў краіне, экспартуюцца. Па сутнасці, гэта плануемы лішак, — гаворыць старшыня Прэзідыума НАН Уладзімір Гусакоў.

## Без хлеба няма абеду

У 2014 годзе ўраджайнасць збожжавых у Беларусі была рэкорднай — 9,1 мільёна тон. Але нездарма гавораць пра Беларусь, што яна — краіна няўстойлівага земляробства: засуха ці праліўныя дажджы, град, і вось на ўраджаі можна ставіць крыж. Стратэгія харчовай бяспекі ў тым і заключаецца, каб палі і расліны апрацоўваліся па самых сучасных тэхналогіях ад пустазелля і шкоднікаў, каб насенны фонд быў не толькі элітным з пункту гледжання ўраджайнасці, але і марозаўстойлівым, устойлівым да перападаў тэмператур. Над гэтым у краіне працуюць некалькі НДІ.

Выкарыстанне новых гатункаў дало свой плён. Краіна становіцца хоць і сціплым, але — экспарцёрам збожжавых. За 2015-2016 "гандлёвы" год, паводле дадзеных ФАО, пастаўкі за мяжу склалі прыкладна паўмільёна тон.

## Санкцыі не перашкодзілі

Еўрасаюз і ЗША ўвялі санкцыі ў дачыненні цэлага шэрага беларускіх кампаній і грамадзян яшчэ ў 2006 годзе. Яны не датычыліся непасрэдна паставак прадуктаў харчавання, але закранаюць інтарэсы буйнога бізнесу, ускладнялі прыток інвестыцый, асваенне новых тэхналогій.

Санкцыі сталі адной з ускосных прычын, якія падштурхнулі развіццё вытворчасці сельгастэхнікі. Сёння краіна выпускае машыны годнай якасці ў такой колькасці, каб сабраць не толькі свой ураджай, але і пастаўляць тэхніку на экспарт.

Васіль **Малашанкаў**

**З Канцэпцыі нацыянальнай харчовай бяспекі Беларусі:**

***"Складанасці на рынку харчавання павялічваюцца. Харчовая праблема хоць і павольна, але ўсё больш набывае рысы харчовай бяспекі, вырашэнне якой патрабуе ўзгодненай палітыкі і сумесных практычных дзеянняў сусветнай супольнасці. Аднак такія дзеянні ні ў сучасных умовах, ні ў перспектыве на глабальным узроўні не праглядаюцца. Таму вырашаць праблему харчавання кожнай краіне, у тым ліку і Беларусі, варта зыходзячы са сваіх магчымасцяў, пераважна на аснове ўласнай вытворчасці пры максімальных гарантыях бяспекі".***

## Даслоўна



**Мікалай Радаман, член Савета Рэспублікі, кіраўнік самай паспяховай у Беларусі сельгаскампаніі "Агракамбінат Сноў":**

*— З запасамі харчавання ў Беларусі няма ніякіх праблем. Пытанне менавіта ў тым, як прадаць тавар, мець добрую дабаўленую вартасць за кошт экспарту. Мы працуем над пашырэннем геаграфіі паставак. Вядома, цяжка канкураваць з Германіяй і Швейцарыяй, дзе для аграрыяў вылучаюцца вялікія датацыі — 600 еўра на гектар раллі. Але мы не скардзімся, а працуем.*



# Адукацыя на адлегласці

## Заняткі з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій зручныя тым, што можна самастойна вызначаць іх графік і месца сустрэч

“Вебінар? А што гэта?” — айчынныя студэнты амаль не знаёмыя з гэтым навамодным “імпартным” тэрмінам. Такая ж паўза звычайна павісае, калі размова заходзіць пра электроннае навучанне. Прытым, што кожны з іх неаднаразова трымаў у руках наўтбукі, планшэты, смартфоны, карыстаўся інтэрнэтам, гэтыя паняцці для іх пакуль, на жаль, за мяжой разумення. Як і, у прынцыпе, само электроннае навучанне, якое часцяком успрымаецца проста як урокі з элементамі мультымедыя. “Так-так, мы выкарыстоўваем электронныя дошкі!” ці “Вядома, мы праводзім на ўроках прэзентацыі нашых работ!” — гэта адны з самых распаўсюджаных адказаў на гэтае пытанне. А размова ж зусім пра другое.

Такую заканамернасць у рамках праекта “Дыдактыка сеткавага ўрока” выявілі другакурсніцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.Танка Вікторыя Верамейчык і Ганна Міхаленка. Амаль месяц дзяўчаты патрацілі на тое, каб апытаць школьнікаў, аднакурснікаў і выкладчыкаў. Пыталі пра іх адносіны да электроннага навучання, як часта яны карыстаюцца інтэрнэтам і з якой мэтай, як былі развітыя інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ў іх школах, як вучні ставяцца да развіцця інфармацыйных тэхналогій і як апошнія могуць паўплываць на будучыню і на ролю настаўніка.

— Калі абмяркоўвалі выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у адукацыі, напрыклад, сеткавыя ўрокі і лекцыі, — расказвае Ганна Міхаленка,

— меркаванні падзяляліся. Хоць, вядома, пераважалі выказванні “за”. Чаму? Ды таму, што заняткі з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій зручныя — можна ж самому вызначаць іх графік, месца сустрэч. Гэтую магчымасць вылучылі амаль 60 працэнтаў апытаных. Былі і іншыя плюсы. Сеткавы ўрок — не проста занятак у запісы, ты можаш бачыць і чуць выкладчыка, а ён бачыць і чуе цябе. Гэта прыйшлося даспадобы амаль 50 працэнтам рэспандэнтаў. Прывабнай знайшлі магчымасць удзелу ў навучанні з любога пункта, у тым ліку з іншага кантынента. Цікавасць да лекцый замежных выкладчыкаў выявілі 26 працэнтаў апытаных. Бо акрамя іншага пры гэтым можна быць у камфортных умовах, напрыклад, на канапе і ў хатнім крэсле.

Мінусаў аказалася куды як менш, але і без іх не абышлося. Напрыклад, маладыя людзі выказвалі і асцярогі, БДПУ, дзе вучацца дзяўчаты, нічога падобнага пакуль няма — магчыма, у перспектыве, спадзяюцца яны.

— На факультэце адкрыўся рэсурсны цэнтр з электроннымі матэрыяламі, — дзеліцца інфармацыяй Вікторыя Верамейчык, — каб у будучыні наладзіць дыстанцыйнае навучанне, з праслухоўваннем лекцый анлайн, правядзеннем канферэнцый.

І ўсё ж студэнтам хацелася б большага. Напрыклад, паслухаць меркаванне іншых людзей, з якімі нельга сустрэцца асабіста, быць у курсе розных новаўвядзенняў. “Для самаразвіцця гэта вельмі карысна”, — перакананыя яны.

У будучыні сацыяльныя педагогі, дзяўчаты спадзяюцца, што анлайн-праграмы ім дапамогуць. Напрыклад, звязвацца з бацькамі школьнікаў, якія не заўсёды могуць прыйсці ў школу для зносінаў з педагогам.

***Да дыстанцыйнага навучання, якое ёсць практычна ў кожнай ВНУ, мы прывыклі. Але гэта — заняткі, як правіла, накіраваныя на аднаго студэнта. Сеткавыя ўрокі разлічаны на вялікую аўдыторыю. І ў Беларусі яны робяць, напэўна, першыя крокі***

што тэхналогіі пазбаўляюць іх жывых зносінаў. А гэта можа паўплываць на сацыялізацыю дзіцяці ў будучыні. Акрамя таго, некаторыя перакананы: завочныя веды могуць быць няпоўнымі, бо няма магчымасці ў любы момант задаць пытанне выкладчыку і атрымаць вычарпальны адказ.

Зрэшты, калі быць дакладнымі, пакуль гэта своеасаблівы погляд у будучыню. Так, да дыстанцыйнага навучання, якое ёсць практычна ў кожнай ВНУ, мы прывыклі. Але гэта — заняткі, як правіла, накіраваныя на аднаго студэнта. Сеткавыя ўрокі разлічаны на вялікую аўдыторыю. І ў Беларусі яны робяць, напэўна, першыя крокі.

У самім БДПУ імя М.Танка па сетцы можна вучыць хіба што фізіку — такія заняткі праводзіць фізіка-матэматычны факультэт ВНУ. На факультэце сацыяльна-педагагічных тэхналогій

— У нашай рабоце такая сувязь — гэта вельмі зручна, — гаворыць Вікторыя Верамейчык. — Я з задавальненнем яе выкарыстоўвала б. Асабліва калі буду працаваць у раёне. Дарэчы, яна дала б магчымасць раіцца з іншымі выкладчыкамі, калегамі-педагогамі, абмяркоўваць спрэчныя пытанні ў рэжыме анлайн.

Аднакурснікі з дзяўчатамі салідарныя: электроннае навучанне дае больш магчымасцяў у адукацыі. І інтэрнэт, лічаць яны, не выкарыстоўваюць у поўнай меры — многія зацыкліліся на забавах.

— Але ж там такі патэнцыял! — здзіўляецца падобнай недальнабачнасці Ганна Міхаленка. — І я ўпэўнена: калі выкарыстоўваць інтэрнэт у сферы адукацыі і развіцца, то ён можа быць больш эфектыўным.

Вера **Антаноўская**

## Дарэчы

**■ Рынак анлайнавых адукацыйных паслуг устойліва расце. Напрыклад, на факультэце падрыхтоўкі настаўнікаў Тэхаскага ўніверсітэта ў Эль Паса (ЗША) каля 50 працэнтаў асноўных навучальных курсаў вядуцца ў анлайн-фармаце. З мэтай пашырэння анлайн-паслуг вядучыя ўніверсітэты свету ствараюць кансорцыумы масавых адкрытых дыстанцыйных курсаў, каб ініцыяваць спецыяльныя праграмы ў падтрымку распрацоўкі і правядзення анлайн-курсаў, а таксама развіцця новых інструментаў для анлайнавых навучальных сістэм. Аднак некаторыя скептыкі заяўляюць, што масавыя адкрытыя дыстанцыйныя курсы не з’яўляюцца панацэяй. У інстытуце Гэлапа, напрыклад, правялі апытанне прэзідэнтаў некалькіх універсітэтаў ЗША, якія ўдзельнічаюць у распаўсюджванні такіх курсаў. Асноўныя яго высновы такія: 54 працэнты ўдзельнікаў некалькі не згодныя ці не ўпэўненыя ў тым, што курсы садзейнічаюць пашырэнню творчых педагагічных стратэгій. Больш за тое, 83 працэнты ўдзельнікаў не згодныя ці не ўпэўненыя ў тым, што яны паляпшаюць паказчыкі навучання ўсіх студэнтаў.**






# Адметнасці добрага ўплыву

## У Беларусі маштабную кампанію супраць шкодных звычак пачалі яшчэ ў 1990-я гады

Да распрацоўкі кампаніі па прапагандзе фізкультуры і спорту ў краіне падключыліся ўсе міністэрствы і ведамствы. Бо адпаведныя раздзелы былі ўключаны ў Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на пяцігодку і Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця краіны, а гэта ўжо дзяржаўная палітыка.

Сутнасць стратэгіі прасоўвання ЗЛЖ у масы — у далучэнні людзей да занятку спортам, адмове ад шкодных звычак, здаровым харчаванні і прафілактычнай медыцыне.

Сёння кожны пяты беларус займаецца фізкультурай. Задача — да 2020 года далучыць да фізкультуры кожнага чацвёртага. Усе ўмовы для гэтага ёсць, у тым ліку тысячы новых і мадэрнізаваных стадыёнаў, хакейных пляцовак, веладарожак, ролерных трас і пляцовак для гульнявых відаў спорту. У Мінску нават абсталявалі пляцоўку для паркура.



За апошнія дваццаць гадоў у Беларусі пабудавана прыкладна два дзясяткі лядовых палацаў. Тысячы аматараў па ўсёй краіне гуляюць у хакей. Самы яркі прыклад — Начная хакейная ліга ці чэмпіянат Мінска па хакеі сярод аматараў. А яшчэ ёсць Аматарская хакейная ліга, турнір “Залатая шайба”, рэспубліканскія спаборніцтвы...

Адрадзілі рабочыя спартакіяды. У кожным раёне праходзяць фестывалі здаровага ладу жыцця. У Мінску нават чэмпіянат па плаванні сярод маржоў праводзіцца. Сёлета ў ім актыўна ўдзельнічалі і расіяне — калегі-маржы з Арла, Іванава ды іншых гарадоў.

Самыя масавыя спартыўныя святы ў Мінску ды іншых гарадах прымеркаваны да Дня Перамогі і да 3 ліпеня — Дня Незалежнасці. У гэтыя дні цэнтр сталіцы ператвараецца ў вялізны стадыён, дзе спартсменаў столькі ж, колькі і гледачоў.

Сёння ў Беларусі — сапраўдны бум сярод аматараў бегу. Кожны год праходзяць дзясяткі прабегаў і кросаў. Папулярны Мінскі міжнародны паўмарафон. У сацсетках створана спецыяльная група followminsk. Яе ўдзельнікі могуць атрымаць кансультацыю ад прафесійных атлетаў. Вынік у наяўнасці: у парках і на школьных стадыёнах па вечарах бегаюць трушком сотні людзей.

З 2009 года мінскія ўлады рэалізуюць праграму “веласіпедызацыі” сталіцы. Гэтым спрабуюць забіць адразу трох зайцаў: далучыць людзей да ЗЛЖ, часткова разгрузіць грамадскі транспарт і палепшыць экалогію горада. Агульная даўжыня адасобленых велатрас у Мінску ўжо каля 250 км, а хутка будзе 600. Тратуар галоўнага праспекта сталіцы цяпер падзелены на пешаходную і веласіпедную часткі.

— Для паездак на работу веласіпед пакуль выкарыстоўваюць каля працэнта мінчан, — гаворыць Юрый Важнік, старшыня праўлення Беларускай асацыяцыі экспертаў і сюрвейераў на транспарце. — Але статыстыка абнадзейвае. За апошнія пяць гадоў веласіпедыстаў у краіне стала ўтрая больш.

Адначасова па ўсіх франтах ідзе наступленне на шкодныя звычкі. Сацапытанні паказваюць: асноўная прычына звышсмяротнасці мужчын працаздольнага ўзросту — нездаровы лад жыцця. Курыць прыкладна трэць дарослага насельніцтва. Самы высокі працэнт — моладзь і людзі сярэдняга ўзросту. Спажыванне алкаголю ў краіне таксама даволі высокае — больш за дзесяць літраў на душу насельніцтва ў год.

У Беларусі забаранілі рэкламу тытунёвых вырабаў. Цыгарэт не ўбачыш нават у магазінах: іх няма на вітрынах, для пакупніка — толькі спіс-пералік.

Ужо некалькі гадоў на вуліцах нельга піць нават піва. Забаронена прадаваць спіртное і цыгарэты праз інтэрнэт-магазіны. МУС нядаўна прапанавала заканадаўча замацаваць норму аб продажы спіртнога толькі грамадзянам, якія дасягнулі 21 года. Апытанні грамадскай думкі паказваюць, што 75 працэнтаў насельніцтва выступае за ўзмацненне жорсткасці антытытунёвай і антыалкагольнай кампаній.

Герман **Маскаленка**



# Тэатр вывучае сябе



Тамара Гаробчанка (з кветкамі) сярод тэатразнаўцаў-выпускнікоў (2013)

**Ці патрэбна сёння тэатральная крытыка? Наколькі прэстыжная прафесія тэатразнаўцы? І што такое тэатразнаўчая навука? Пра гэта наша гутарка з кандыдатам мастацтвазнаўства, тэатральным крытыкам Тамарай Гаробчанка.**

У асяроддзі беларускіх навукоўцаў-тэатразнаўцаў прынята лічыць: тэатральная навука ў Беларусі ўзнікла ў пачатку ХХ стагоддзя ўслед за ўзнікненнем прафесійных дзяржаўных тэатраў. І хоць даследаванні ў галіне тэатральнай творчасці ў той час былі нешматлікія, насілі фрагментарны характар, яны і цяпер дазваляюць зразумець, якім быў тэатр у кантэксце нацыянальнай культуры мінулых гадоў, у эпоху стварэння і пачатку жыцця драматычных і музычных тэатраў у Беларусі, а таксама бурнага развіцця самадзейнай творчасці. Тое юнае нацыянальнае тэатразнаўства захоўвае часта захоплены, эмацыйны аповед пра сцэнічныя адкрыцці ў беларускім тэатры, яго трыумфы і правалы. Шмат у чым яно засноўвалася на больш ранняй тэатральнай публіцыстыцы вядомых беларускіх дзеячаў культуры: Уладзіслава Сыракомлі, Язэпа Дылы, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі. Іх даследаванні народных формаў тэатра, фальклорных дзеяў, драматургіі, аматарскіх спектакляў свайго часу адыгралі вялікую ролю ў станаўленні і развіцці прафесійнага тэатральнага мастацтва.

Асэнсоўваючы гістарычны досвед сусветнай сцэнічнай культуры, яны прапаноўвалі сваё бачанне развіцця тэатра Беларусі з абавязковым выкарыстаннем у драматургіі і яе ўвасабленні найбагацейшай народнай творчасці. Характэрна, што менавіта ў тыя гады ў артыкуле “Наш тэатр” (1913) пісьменнік, фалькларыст, літаратуразнаўца Максім Гарэцкі стварыў унікальную праграму развіцця нацыянальнага драматычнага тэатра, якая актуальная і ў наш час.

Прыярытэтным напрамкам беларускай навукі аб тэатры ў пачатку 20-х гадоў было вывучэнне гісторыі нацыянальнай сцэнічнай культуры.

Яшчэ бывшы школьніцай, я задавалася пытаннем: ну для чаго мне чытаць крытыку пра тую ці іншую літаратурную або тэатральную з’яву? Бо ўсё, што скажуць пра яе тыя хоць і прафесіяналы, не будзе маім меркаваннем. Такія шкалярскія пытанні часам даймалі мяне і ва ўніверсітэце падчас вучобы на філалагічным факультэце, маўляў, я магу выказаць свае адносіны да вывучаемых твораў. І толькі, калі сама папрацавала ў сектары тэатра Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі (цяпер аддзел тэатральнага мастацтва), скончыла там аспірантуру і абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме “Змітрок Бядуля — тэатральны крытык і публіцыст”, зразумела, наколькі важная навука аб тэатры. Бо яна вывучае не толькі яго паходжанне і развіццё, але і месца, і ролю ў грамадскім жыцці. Я таксама зразумела, што тэатразнаўства — адна з элітарных сфер культурнай свядомасці. У адной з палемік аб тэатральнай крытыцы і

тэатразнаўстве прачытала сугучныя маім думкам развагі: тэатразнаўца, здольны зразумець асобу мастака, ацаніць яго талент і значэнне яго творчасці, а таксама зразумець сэнс тэатральнага тэксту, асабліва неабходны культуры. Ён патрэбны, каб працягваць гістарычныя даследаванні, патрэбны тэатральнай педагогіцы, патрэбны драматургу, рэжысёру, акцёру, публіцы, усім, хто здольны існаваць у дыялогу, разважаючы пра драму, спектакль, сцэнаграфію, нараджаючы новыя тэатральныя канцэпцыі і асэнсоўваючы працэсы жыцця. Ён патрэбны як ідэолаг тэатра, як тлумачальнік новага слова ў мастацтве. У ідэале тэатразнавец — гэта асветнік. А яшчэ, па-мойму, гэта чулы чалавек, здольны пранікаць у душу прадмета, гэта значыць спектакля, бачыць новыя грані, якія падсвядома ўвасобіў пастаноўшчык. І тут няма ніякай містыкі. Чуласць — уласцівасць чалавечай прыроды, якая дазваляе, паўтаруся, глыбока пранікаць у сутнасць з'яў, прадметаў. Мне не раз самой даводзілася пераконвацца пасля нейкіх асабістых адкрыццяў, да прыкладу, сэнсу сучаснай п'есы, а потым гутарыць з яе аўтарам. Ды што ж я чула ад яго: ведаеш, я нават пра гэта і не задумваўся, калі пісаў…

Чым больш сэнсавых адкрыццяў, граняў спектакля, выяўленых крытыкам, тым больш спажытку для дальнабачнага тэатральнага практыка, у прыватнасці рэжысёра-пастаноўшчыка. Вядома, не для таго, хто ўяўляе сябе цэнтрам Сусвету ў сваёй прафесіі, а ўмее прыслухацца, натхніцца тым ракурсам, які ўбачыў у яго спектаклі крытык. Безумоўна, яго меркаванне, скажам, пасля прэм'еры, не здольнае аказаць уплыў на спектакль. Зрэшты, крытык і не ставіць перад сабою гэтую задачу: для яго больш важна, каб у будучыні, працуючы над новай п'есай, разумны рэжысёр, магчыма, прыняў яго заўвагі да ведама. Ды мудраму крытыку, які стварае летапіс нацыянальнага тэатра, усё роўна, успомняць ці не ўспомняць пра яго асабістае бачанне спектакля.

Ад Тамары Гаробчанка аднойчы пачула: разумны рэжысёр добразычліва кантактуе з тэатральным крытыкам, абмяркоўвае з ім яго задумы.

Добра памятаю выезды тэатральных крытыкаў ды тэатразнаўцаў у рэгіянальныя тэатры Беларусі, падчас якіх прагледжваўся іх рэпертуар, пасля чаго запрашалася ўся трупа на абмеркаванне. Сама была ўдзельніцай некалькіх такіх выездаў. Я таксама добра памятаю, як радаваліся, да прыкладу, акцёры Тэатра імя Якуба Коласа: іх убачылі, пра іх гаварылі. І нават не вельмі прыемная крытыка ў адрас некаторых, была карыснай для іх.

Паколькі мая работа ў аддзеле тэатра доўжылася параўнальна нядоўгі час і абароненая дысертацыя — гэта толькі заяўка на тое, што магу стаць даследчыкам тэатральных з'яў, я не маю права асэнсоўваць з пункту гледжання навукоўца-тэатразнаўцы гістарычны досвед тэатразнаўства Беларусі. Таму і звяртаюся па дапамогу да прафесіянала, які ахвотна згадзіўся мне дапамагчы. Дарэчы, Тамара Гаробчанка — аўтар раздзелаў "тэатразнаўства", "тэатральная крытыка" не толькі ў двухтомнай энцыклапедыі "Тэатральная Беларусь", але і многіх раздзелаў "Гісторыі беларускага тэатра" ў 3-х тамах, а таксама манаграфій пра вядучых майстраў беларускай сцэны.

***— Тамара Яўгенаўна! Вы самі тэатральны крытык ці больш навуковец-тэатразнаўца?***

— Хутчэй, і тое, і другое. Зыходзячы з савецкай традыцыі, гэта была адна і тая ж прафесія. Ды і я так працягваю думаць. Тэатральны крытык ён і ёсць тэатразнаўца, які піша і пра гісторыю тэатра, і пра дзень тэатра сённяшняга. Тэатральная крытыка сама па сабе нішто, калі яна не закранае гісторыю, не закранае праблемы сучаснага тэатра. І гэтую ўнікальную прафесію, якая нарадзілася яшчэ ў XIX стагоддзі і якая не з'яўляецца масавай, трэба захоўваць. Сцэнічная пастаноўка ідзе ў рэальным часе і не пакідае матэрыяльных слядоў. Таму, калі тэатральныя крытыкі не напішуць пра спектакль, ён знікне і назаўжды будзе страчаны для гісторыі.

***— Але ж яшчэ ёсць і тэатральная журналістыка…***

— Гэта ж датычыцца і тэатральнай журналістыкі, хоць яны істотна адрозніваюцца: тэатральная журналістыка — гэта эмацыйны водгук, а крытыка — аналіз. Тое, што пішуць і гавораць пра тэатр журналісты, не ў крыўду ім будзе сказана, часта павярхоўны погляд. Так, вядома, журналісцкі водгук на старонках СМІ зафіксуе і факт нараджэння спектакля, і пачуцці журналіста. І нейкія асацыяцыі аўтара дапамогуць скласці меркаванне пра пастаноўку. Але ці адновіць журналіст вобразную структуру спектакля так, каб праз гады можна было зразумець яго стылістыку і сэнсавае напаўненне. У журналісцкіх артыкулах рэдка можна сустрэць расшыфроўку кодаў, закладзеных рэжысёрам, сцэнографам, акцёрамі. Ёсць, вядома, і таленавітыя журналісты, якія спрабуюць прак-

***Ні крытыка, ні тэатразнаўства не знікнуць. Хіба можа знікнуць тэатр? Стала быць, і крытыка з тэатразнаўствам не знікнуць. Проста стануць іншымі. Бо крытыка мастацтва — адна з найстаражытных прафесій, існуючая з часоў Арыстоцеля. І нікуды тэатрам ад яе не дзецца. Былі б тэатразнаўцы і крытыкі асобамі, якія ведаюць цяперашні жывы тэатральны працэс, усведамляюць непарыўную повязь мінулага і сучаснага, помняць пра лепшыя сцэнічныя традыцыі***

тыкам растлумачыць сэнс спектакля і нешта пакінуць для гісторыі. Ёсць блогеры. Як вы разумееце, і блогеры бываюць розныя. Мне падабаецца, як працуе ваш калега Валянцін Пепяляеў. Думае асацыятыўна. Чытаць яго цікава. Аўтарская яго калонка "Раб рампы" ў "СБ. Беларусь сегодня" — своеасаблівыя міні-рэцэнзіі на спектаклі, дзе сустракаецца і дастойны аналіз пастановак. Яго калонка зарыентуе прыхільнікаў тэатральнага мастацтва. Сёння, наколькі я разумею, гледачы, асабліва маладыя, проста так у тэатр не ходзяць. Яны спачатку прачытаюць у інтэрнэце водгукі на спектаклі, а ўжо потым набудуць білеты. Але, на жаль, у наш час на старонках газет амаль не сустрэнеш моцных разгорнутых рэцэнзій на спектаклі. Вось часопіс "Мастацтва" час ад часу іх публікуе, дарэчы, раней на яго старонках, здаралася, даваліся два процілеглыя па ацэнцы водгукі на адзін і той жа спектакль. Газета "Культура" больш інфармуе аб прэм'ерах. Але сёння няма палемічных публікацый, праблемных аналітычных матэрыялаў, зніклі агляды тэатральных сезонаў, рэдкія партрэты акцёраў, усё больш чытаеш інтэрв'ю з імі… Пазітыўны прыклад — артыкулы Ірыны Завадскай пра творцаў, якія пайшлі з жыцця, у рубрыцы "Памяць".

***— Я памятаю час, як пад рэцэнзіі ў газетах адводзіліся цэлыя "падвалы". І як сама пісала для газеты "Чырвоная змена" рэцэнзію на спектакль Тэатра імя Якуба Коласа "Парог" Аляксея Дударава…***

— І гэта рабілі тэатральныя аглядальнікі, якія былі амаль у кожнай газеце. Да прыкладу, штотыднёвік "Літаратура і мастацтва" даваў рэцэнзію на спектакль у кожным нумары. Гэта было ў часы, калі там працаваў загадчыкам аддзела культуры Барыс Бур'ян, паважаны мною прафесіянал. Можна, вядома, калі хочаш настальгіраваць па мінулым, але, мякка кажучы, было б недарэчна не разумець, што сённяшні дзень — не ўчарашні. Час сціснуўся, калі хочаце. Жыццё настолькі імклівае, што кліпавасць — паўсюль. Гэта рэальнасць. Іншыя рытмы, іншае ўспрыманне падзей, з'яў, іншая журналістыка. Зразумела, што кліпавасць кліпавасці не роўная. Ёсць свае ў ёй плюсы і мінусы. Мяняецца вобразная мова спектакляў, выразныя сродкі іншыя, ускладняецца шматузроўневае рэжысёрскае кадзіраванне, дамінуе гульня сэнсаў…Адпаведна і тэатральная крытыка павінна ўмець распазнаваць новыя ідэі і раскадзіраваць іх для гледача. Мне падабаецца, як гэта робіць у сваіх публікацыях аксакал тэатральнай крытыкі Таццяна Арлова. Ёміста, сцісла, заўсёды цікава.

***— Падаецца, у Тэатры беларускай драматургіі чыталіся бясплатныя лекцыі вядомых тэатральных крытыкаў у так званай "Школе ТЕАРТа", якую адкрываў у дні восеньскага фестывалю Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў "АРТ Карпарэйшн" і білетны аператар Bycard.by?***

— Так, я чула ад маіх аспірантаў пра гэтую адукацыйную праграму для мінчан, нацэленую на тое, як глядзець і разумець сучасны тэатр. Яны пазітыўна адлесліся да лекцый старшага выкладчыка БДУ і тэатральнага крытыка Людмілы Грамыка. Яна расказвала пра тэатральны працэс за апошнія 25 гадоў. Гэта добра, што ў яе выступленні гаварылася і пра метафарычны тэатр Валерыя Раеўскага і Барыса Герлавана, і пра тэатральную эстэтыку Мікалая Пінігіна, цяперашняга мастацкага кіраўніка Тэатра імя Янкі Купалы, блізкую нашаму нацыянальнаму менталітэту.

***— Але вернемся да тэатразнаўства. Раскажыце пра складнікі тэатральнага працэсу, якія з'яўляюцца прадметам вывучэння тэатразнаўства.***

— Камунікатыўны ланцужок тэатральнага працэсу — гэта драматургія, сцэнічнае мастацтва, глядач, тэатральная крытыка і тэатразнаўства. Кожная з гэтых асноўных частак з'яўляецца адпаведным раздзелам навукі аб тэатры, якія ў сваю чаргу маюць асобныя структурныя падраздзелы. Гэта агульная тэорыя і гісторыя тэатра, тэатральная крытыка, сацыялогія тэатра, тэорыя драмы, рэжысёрскае і акцёрскае мастацтва, псіхалогія і фізіялогія творчасці і ўспрымання гледачоў, тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва, музычнае афармленне спектакляў, тэатральная педагогіка, тэхніка сцэны, эканоміка і арганізацыя тэатральнай справы… Акрамя таго, адзначу, што тэатразнаўства звязана і з філасофіяй, сацыялогіяй, эстэтыкай, псіхалогіяй, фалькларыстыкай, літаратуразнаўствам ды іншымі сумежнымі навукамі.

***— З чаго пачыналася беларускае тэатразнаўства як навука?***

— З сістэматычнага вывучэння гісторыі, тэорыі і сучаснага стану тэатральнага мастацтва. У 1957 годзе ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі арганізаваўся сектар тэатра і кіно. Як толькі ён сфарміраваўся, перад супрацоўнікамі была пастаўлена задача збору матэрыялаў для будучых даследаванняў. На іх аснове даследаванні і пачаліся. А ў 1977-м "кіношнікі" аддзяліліся. І мы называліся ўжо сектарам тэатра. З 1986-га — гэта ўжо аддзел тэатра. А ў 1995-м яго перайменавалі ў аддзел тэатральнага мастацтва. Там працавалі буйныя асобы. Яны абаранялі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі, у розныя гады ўзначальвалі аддзел, а то і пераходзілі на службу ў іншыя арганізацыі. Напрыклад, Рычард Смольскі, доктар мастацтвазнаўства, вучыўся ў нашай вочнай аспірантуры, абараніў кандыдацкую. Цяпер ён доктар мастацтвазнаўства, прафесар. З 1988 года загадваў аддзелам тэатральнага мастацтва і адначасова быў рэктарам Акадэміі мастацтваў. Там і працуе ў якасці навуковага супрацоўніка.

***— А ці былі ў Беларусі больш раннія спробы асэнсаваць тэатральныя падзеі?***




ІВАН ЖДАНОВІЧ

— Першыя спробы тэарэтычнага асэнсавання тэатра зроблены яшчэ ў 17-18 стагоддзях. Пра гэта можна даведацца з майго раздзела ў энцыклапедыі. Назаву толькі трактат Мацея Казіміра Сарбеўскага "Пра трагедыю і камедыю, або Сенека і Тэрэнцый". Ён быў створаны на аснове курса яго лекцый для Полацкага езуіцкага калегіума. Гэтая работа — тэарэтычнае абгрунтаванне паэтыкі школьнага тэатра, у якім былі дадзены практычныя рэкамендацыі, як ставіць спектаклі, прычым з малюнкамі і чарцяжамі сцэнічнага абсталявання. А самыя першыя звесткі пра паратэатральную культуру і пра спектаклі Нясвіжскага тэатра Уршулі Радзівіл 1720-1761 года былі запісаны ў дзённіку князя Міхала Казіміра Радзівіла, ваяводы віленскага, гетмана Вялікага Княства Літоўскага. Вось такія мы былі прасунутыя ўжо ў той далёкі час. У XIX стагоддзі выйшаў шэраг публікацый аб жыцці асобных гарадоў, дзе зафіксаваны факты тэатральнага жыцця Мінска, Віцебска, Гродна, дадзена апісанне тэатральных будынкаў, прыводзіцца рэпертуар і склад трупы гастралюючых тэатраў. Што датычыцца крытыкі, то найбольш яркімі асобамі гэтага перыяду былі вядомы этнограф і фалькларыст Павел Шпілеўскі і грамадскі дзеяч Іван Гольц-Мілер (бацька). Закранаючы пытанні акцёрскага выканальніцкага майстэрства, галоўную ўвагу ў сваіх публікацыях яны надавалі асветніцкай місіі тэатра і прапаноўвалі зрабіць яго даступным для народнага гледача. Значная і публіцыстыка Змітрака Бядулі, пісьменніка, драматурга, тэатральнага крытыка перыяду "Нашай Нівы" 1912-1915 гг., а таксама яго больш позняя тэатральныя рэцэнзіі. Услед за Максімам Гарэцкім, Бядуля заклікаў ствараць п'есы на тэму беларускага Адраджэння. Навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне сцэнічнага мастацтва займалася тэатральная падсекцыя Інстытута беларускай культуры (1922-1928). На яе пасяджэннях рабіліся навуковыя даклады, абмяркоўваліся спектаклі і рэпертуар тэатраў, дзейнасць беларускай і яўрэйскай студый у Маскве.




***— Вы былі ў ліку тых, хто трапіў у першы інстытуцкі набор па спецыяльнасці "тэатральная крытыка"? І як часта ў нашы дні ажыццяўляецца набор?***

— Тэатральная крытыка як вучэбны прадмет у Беларусі быў уведзены ў навучальны працэс у 1962 годзе, калі тэатральна-мастацкі інстытут упершыню ажыццявіў набор студэнтаў па гэтай спецыяльнасці. Я была ў іх ліку. Так што развіццё гэтага прадмета адбывалася на маіх вачах. Сёння перыядычна набіраюцца не толькі крытыкі і тэатразнаўцы, але і ўведзена новая спецыяльнасць — "арганізацыя і кіраванне тэатральнай справай".

***— Што скажаце пра сваіх калег-тэатразнаўцаў?***

— Гэта ўніверсалы сваёй справы. Яны адначасова былі крытыкамі, навукоўцамі і педагогамі. Сёння такіх адзінкі. Са старэйшага пакалення я магу назваць дактароў навук Рычарда Смольскага, Таццяну Арлову, Вадзіма Салеева. Нехта з тэатразнаўцаў, атрымаўшы адукацыю, ідзе ў тэатр — у літаратурную частку ці аддзел маркетынгу, нехта — у прэс-сакратары, на тэлебачанне ці ў журналістыку. Многія мае калегі пайшлі з жыцця. Не стала Уладзіміра Няфёда, члена-карэспандэнта Акадэміі навук, доктара мастацтвазнаўства, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі, які трыццаць гадоў загадваў аддзелам тэатра (1957-1987 гг.). Гэта глыба ў тэатразнаўстве. З ім можна было шмат у чым не згаджацца: такім заўзятым абаронцам маральных ідэй і стварэння вобраза станоўчага героя на сцэне ён быў. Уладзімір Іванавіч шмат чаго карыснага зрабіў. Ён з ліку заснавальнікаў Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута і Беларускага тэатральнага таварыства. На працягу сваёй навуковай і грамадскай дзейнасці ён пісаў уласныя кнігі пра тэатр, ёсць сярод іх і падручнік, адрасаваны студэнтам творчых ВНУ, а таксама ўзначальваў наш аўтарскі калектыў, калі стваралася трохтомная "Гісторыя беларускага тэатра".

Таксама не стала і Анатоля Сабалеўскага, доктара мастацтвазнаўства, прафесара, які ў свой час рэктарстваваў у Акадэміі мастацтваў на працягу пяці гадоў. Ён — карыфей тэатральнай навукі. Напэўна, адзін з нямногіх, хто так глыбока ведаў гісторыю тэатра. Ён аўтар і іншых шматлікіх кніг, у якіх даследуецца драматургія, акцёрскае мастацтва, міжнацыянальныя тэатральныя сувязі... Анатоль Вікенцьевіч быў ініцыятарам і навуковым рэдактарам двух выпускаў кніг "Хрэстаматыі беларускага тэатра" ў двух і трох тамах. Як і гэтая ўнікальная праца, на ўсёй постсавецкай прасторы не мае аналагаў і энцыклапедыя "Тэатральная Беларусь" у двух тамах. Каардынацыя работы па зборы матэрыялаў, іх сістэматызацыі і навуковыя каментарыі — гэта ўсё заслуга Сабалеўскага. З яго іменем звязана і з'яўленне адзінага ў краіне часопіса "Тэатральная творчасць". Ён выдаваўся з 1992 па 1998 год і цалкам быў прысвечаны драматургіі, прафесійнаму і самадзейнаму сцэнічнаму мастацтву. Зрэшты, я магу шмат гаварыць пра Сабалеўскага, бо ён быў маім навуковым кіраўніком. Спачатку дыплома, потым кандыдацкай. І даніна памяці гэтаму крэатыўнаму навукоўцу, здольнаму эмацыйна захапляцца тэатральнай творчасцю — асобная, добрая тэма для гутаркі. Зрэшты, як і размова пра многіх маіх калег, якія займаліся рознымі напрамкамі тэатральнага мастацтва, з якімі я працавала ў аддзеле тэатра на працягу многіх гадоў. Нас усіх звязвала не толькі прафесія, але і сяброўства. Гэта доктар мастацтвазнаўства, прафесар Гурый Барышаў, кандыдаты мастацтвазнаўства Юра Пашкін, Міша Калодзінскі, Сяргей Пятровіч. Светлая ім памяць.


Першы выпуск тэатральных крытыкаў (г. Мінск, 1967)

***— Першы том трохтомнай “Гісторыі беларускага тэатра” выйшаў у 1983 годзе, а праз некалькі гадоў і астатнія тамы. У чым асаблівасць гэтай навуковай працы?***

— Так, першае выданне такога роду сярод мастацтвазнаўчых навук было падзеяй у культурным жыцці Беларусі, у айчынным мастацтвазнаўстве. Вучоным тэатразнаўцам удалося дасканала прааналізаваць і выявіць месца ды значэнне сцэнічнага мастацтва ў сістэме духоўнай культуры беларускага народа. Наш аўтарскі калектыў даследаваў і навукова абгрунтаваў нацыянальную асаблівасць, шматграннасць формаў і мастацкіх стыляў прафесійнага беларускага тэатра, унікальнага па эстэтычнай платформе, глыбока дэмакратычнага ў сваёй сэнсавай сутнасці. Гісторыя беларускага тэатра — гэта і шырокая панарама народных вытокаў беларускага тэатра, скамарохаў, народнай драмы, батлейкі, школьнага і прыгоннага тэатраў, самадзейнага і першых расткоў прафесійнага тэатра. Гэта і абагульняючы досвед вядучых нацыянальных калектываў — Тэатра імя Янкі Купалы, Тэатра імя Якуба Коласа, драматычнай трупы Уладзіслава Галубка. У полі зроку навукоўцаў і дзейнасць ТЮГа, рускага, польскага, яўрэйскага калектываў, тэатраў рабочай моладзі, абласных і калгасна-саўгасных тэатраў, а таксама тэатральнае жыццё Заходняй Беларусі.

Упершыню ў беларускім тэатразнаўстве ў “Гісторыі…” так дасканала разглядаюцца поліэтнічныя тэатральныя культуры, іх унікальнае і карыснае для нацыянальнага сцэнічнага мастацтва ўзаемадзеянне і ўзаемаабагачэнне.

***— Чула пра пэўную ідэалагізацыю ў “Гісторыі…”.***

— Што ёсць, то ёсць. Але гэта было абумоўлена супярэчнасцямі грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця краіны ў савецкі перыяд. Гэты ж папрок можна зрабіць усім гуманітарным выданням таго перыяду. Відавочна таму ў нашым інстытуце пачалася работа над шматтомным даследаваннем “Беларусы”, кожная кніга якога была прысвечана пэўнай галіне творчасці. Апошні трынаццаты том уяўляе з сябе комплекснае даследаванне тэатральнага мастацтва Беларусі ад вытокаў да 2010 года. Асаблівасцю гэтага выдання з’яўляецца тое, што аўтары шмат у чым пераасэнсавалі ранейшую ацэнку шэрага мастацкіх з’яў. Яшчэ прыклад. Кандыдат мастацтвазнаўства Людміла Клімовіч цяпер працуе над праграмай і навучальным дапаможнікам па прадмеце “Тэатральная крытыка”.

***— Чым сёння займаюцца тэатразнаўцы ў аддзеле тэатральнага мастацтва?***

— З 2010 года яго ўзначальвае Вераніка Ярмалінская, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт. Апошнія фундаментальныя выданні аддзела, як я ўжо сказала, гэта трынаццаты том “Тэатральнае мастацтва”. У 2014-м сумесна з аддзелам кіно выдадзена калектыўная манаграфія “Сучасныя тэатральныя і экранныя мастацтвы: традыцыі і наватарства”. Тэатразнаўчая частка прысвечана новым навуковым даследаванням сучаснага тэатразнаўства, у прыватнасці разглядаецца дзіцячая драматургія, сучасная рэжысура, яе тэорыя і практыка. У планах аддзела да 100-годдзя прафесійнага тэатра — падрыхтоўка фундаментальнага выдання “Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы ў XX-XXI стст.”.

***— Што скажаце пра цяперашнюю тэатральную крытыку і тэатразнаўства ў цэлым? Ці запатрабавана гэтая прафесія ў Беларусі?***

— А куды мы дзенемся… Жыццё прапануе новыя формы. Тэатразнаўцы, тэатральныя крытыкі асвойваюць іх, шукаюць іншыя шляхі кантакту з публікай, з тэатрамі. Праз інтэрнэт, радыё, тэлебачанне… Так, актыўна супрацоўнічаюць з масмедыя маладыя крытыкі Крысціна Смольская, Ксенія Дубоўская, Аляксей Стрэльнікаў. Хто шукае сваё месца ў жыцці, у тых усё ў парадку. І старажылы запатрабаваны, калі ўлавілі дух часу. Пра дыферэнцыяцыю тэатральнай крытыкі і тэатразнаўства ўжо гаварыла… Прафесія цяпер трансфармуецца. Так, газетная крытыка часоў маёй маладосці даўно ўжо страціла свой аўтарытэт. Што з таго? Цяпер блогеры ўраўноўваюцца з аўтарытэтнымі крытыкамі. Але я думаю, нічога страшнага ў гэтым няма. Ні крытыка, ні тэатразнаўства не знікнуць. Хіба можа знікнуць тэатр? Стала быць, і крытыка з тэатразнаўствам не знікнуць. Проста стануць іншымі. Бо крытыка мастацтва — адна з найстаражытных прафесій, існуючая з часоў Арыстоцеля. І нікуды тэатрам ад яе не дзецца. Былі б тэатразнаўцы і крытыкі асобамі, якія ведаюць цяперашні жывы тэатральны працэс, усведамляюць непарыўную повязь мінулага і сучаснага, помняць пра лепшыя сцэнічныя традыцыі.

Гутарыла Валянціна **Ждановіч**

# Праз кнігі цікава адкрываецца свет

**Міжнароднае радыё "Беларусь" праводзіць фотаконкурс, прымеркаваны да 500-годдзя беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання**

Арганізуючы конкурс творчых фотаработ "Мая кніга для ўсяго свету", беларускія журналісты спрабуюць паказаць ролю кнігі ў жыцці сучаснага чалавека і разнастайнасць сусветнай літаратурнай палітры, а таксама спрыяць знаёмству з гісторыяй і культурай Беларусі.

"500-годдзе выдання Францыскам Скарынам Псалтыра будзе шырока адзначацца сусветнай культурнай грамадскасцю. Гэта адна з самых важных дат беларускай культуры і частка сусветнай кніжнай гісторыі. Удзел у конкурсе дае магчымасць слухачам радыё з розных краін распавесці пра свае любімыя кнігі і даведацца аб традыцыях кнігадрукавання ў іншых кутках планеты, распавесці пра свае літаратурныя перавагі, кнігі, якія паўплывалі на стаўленне да жыцця або звязаныя з важнымі ўспамінамі", — адзначае галоўны дырэктар міжнароднага радыё "Беларусь" Навум Гальпяровіч.

Для ўдзелу ў конкурсе трэба да 30 красавіка даслаць на электронную пошту booksgoglobal@gmail.com фота з выявай сваёй любімай кнігі і тэкставы каментарый. Здымак можа быць у форме сэлфі або ў любым іншым фармаце, бо, як адзначаюць арганізатары, пры выбары пераможцаў будзе вітацца арыгінальнасць і крэатыўнасць удзельнікаў, у тым ліку і як фатографаў.

Далей конкурсныя фатаграфіі з'явяцца на сайце радыё "Беларусь" www.radiobelarus.tvr.by у спецыяльным раздзеле #booksgoglobal, дзе за іх можна будзе галасаваць. Удзельнікі, якія набралі найбольшую колькасць галасоў ад інтэрнэт-карыстальнікаў і прафесійнага журы, атрымаюць прызы. Падвядзенне вынікаў творчага спаборніцтва пройдзе сёлета ў маі.

Падрабязна з умовамі конкурсу "Мая кніга для ўсяго свету" можна азнаёміцца на афіцыйным сайце міжнароднага радыё "Беларусь".

Павел **Лазовік**







Удзельнікі конкурсу: Яраслаў Янджэйчак (Польша) з кнігай "Новая зямля" Якуба Коласа, Мітул Кансал (Індыя) з кнігай уласных вершаў, Махмуд Гамзаві (Егіпет)

# Казку пра Скарыну напісалі... у дванаццаць рук

## Выдавецкі дом “Звязда” да юбілейнай даты выпусціў кнігу для дзяцей “У гасцях у Францыска Скарыны” Евы Нэмм

**З а таямнічым псеўданімам хаваецца цэлая сям’я: пісьменніца Алена Стэльмах, яе дочкі Вікторыя і Маргарыта, а таксама ўнучкі — Эмілія, Марыя і Надзея. У інтэрв’ю аўтары расказалі, як прыдумлялі казку.**

### Па сюжэтах старажытных легенд

***— Чароўную гісторыю пра Францыска Скарыну рыхтавалі спецыяльна да юбілею?***

**Вікторыя:** Гэта супадзенне. Спачатку пра першадрукара ніхто і не думаў. Неяк з дзецьмі ездзілі ў вёску Станькава пад Мінскам. Дзяўчынкі засумавалі, папрасілі расказаць што-небудзь цікавае. Прыйшлося прыдумаць гісторыю пра прыгоды героя Алоўка ў розных краінах і эпохах, дадаўшы сюжэты беларускіх легенд. Маці, даведаўшыся, натхнілася і прапанавала разам напісаць кнігу.

**Алена:** Тады і ўзнік Скарына. Дзяўчынкі вельмі цікавіліся гісторыяй першадрукара. Здзіўляліся: “Няўжо да гэтага ніводнай кнігі не існавала? Нават самай маленькай?” І мы дружненька вырашылі: трэба абавязкова расказаць усім дзецям пра гэтую легендарную фігуру. І адправілі герояў кнігі ў яго друкарню.

***— Ва ўсіх герояў ёсць прататыпы?***

**Алена:** Граф Эмерык і яго маёнтак, дзе разгортваецца сюжэт, — гэта вобраз, спісаны з даволі вядомага графа Эмерыка фон Гутэн-Чапскага, які валодаў Станькаўскім маёнткам у XIX стагоддзі. Любы чытач, апынуўшыся ў гэтым унікальным беларускім мястэчку, пазнае і апісваемы намі скарбчык, і альтанку на беразе возера, і дрэвы, якія растуць каранямі ўверх, і ліпу, дзе ў казцы жыве варона Карыла. Так, магчыма, і яе саму!



Чароўныя гісторыі сям’я з Мінска прыдумляе... на кухні за чаем. Злева направа: Маргарыта, Эмілія, Алена, Надзея, Вікторыя, Марыя

**Марыя:** Персанажаў прыдумлялі ўсе разам. Калі была маленькая, вельмі любіла малочны пудынг — называла яго “пундзікам”, таму што не выгаворвала. Такое ж імя атрымаў і кактус на акенцы, які пазней перасяліўся ў казку.

**Эмілія:** Труска ў кнізе таксама з рэальнага жыцця. Гэта наша хатняя любіміца Ружачка.

**Маргарыта:** Часта пытаюць, як узнікла смешнае імя сяброўкі Альжбэты — Яіцка. Усе разам ехалі ў машыне. Было горача, душна. І каб павесяліцца, чыталі наадварот рэкламныя шыльды. На адным са стэндаў убачылі слова “акцыя”: шыварат-навыварат атрымалася “яіцка”. Так міленька вырашылі назваць і кніжную гераіню.

***— Усё-такі ў дзяцей фантазія развіта значна лепш, чым у дарослых!***

**Алена:** Менавіта. І калі справа пачынала стопарыцца, гэта азначала адно: збірай, бабуля, унучкам пачастункі ды імчыся ў госці. Юныя суаўтары з лішкам паддавалі творчага матэрыялу. На перникі не квапіліся, з парога пыталі: “Ну якія раздзелы прывезла?” Цягнулі ў свой пакой, усаджвалі ў крэсла і патрабавалі чытаць. А потым разам пачыналі штурхаць герояў на новыя прыгоды.

## Усе імёны ў адным псеўданіме

***— Працаваць у жаночым калектыве звычайна няпроста. Здараліся рознагалоссі?***

**Алена:** Хіба што ў арганізацыі сумеснага здымка — таго самага, які красуецца на вокладцы кнігі. Паненкі праявілі характар. Перабралі ўсю кватэру, пакуль вызначаліся з месцам для здымкі. Бітую гадзіну, штурхаючы адна адну, круціліся каля люстэрка: прымяралі ўборы, прычэсваліся. І без слёз не абышлося.

***— Каму прыйшла ідэя ўзяць псеўданім?***

**Алена:** Рэдактары падганялі: кніга гатовая ў друк, чытачы чакаюць, назавіце хутчэй аўтара. У бліжэйшыя выхадныя аб’явілі агульны збор. На кухні пілі чаёк, ініцыятыўная Эмілька вылучыла версію: “Давайце маё імя паставім. Гэта ж я сказала, што кніга павінна быць поўная чараўніцтва”. Варыянт не ўхвалілі. Узнікла другая ідэя: “Тады няхай аўтарам будзе Віка. Гэта яна вырашыла перанесці дзеянне ў мінулае”. Таксама нешта не тое. У выніку ўзялі чысты ліст паперы і напісалі: Алена (па-руску Елена), Вікторыя, Надзея, Эмілія, Марыя, Маргарыта. Атрымалася абрэвіятура Ева НЭММ. Імгненна адобрылі: ды гэта ж сапраўды мы! Прычым літара “а” тут зусім не збоку прыпёку. Бацьку ўнучак завуць Андрэй. Ён цярпліва возіць нас на прэзентацыі, цягае рэквізіт. Без мужчынскай падмогі нам, шасцярым дамам, было б цяжка!




## Урывак з кнігі

*— Няўжо гэта Францыск Скарына?! Ушчыпніце мяне! — шапнула Гузіку Юзіку ўражаная ўбачаным незачэпатруска Ружачка.*

*— Ба, ды ў нас госці! — узрадаваўся незнаёмцам першадрукар. — Адкуль, спадары, будзеце? — спалохаў гучным голасам і без таго ашаломленых прышэльцаў.*

*— Мы з XXI стагоддзя, — смялей за іншых у дадзенай сітуацыі апынуўся Аловак.*

*— Далекавата ж вы забраліся! Пяцьсот гадоў паміж намі розніцы, — цяпер ужо здзівіўся мудры Скарына. І з непрыхаванай цікавасцю стаў гасцям з будучыні задаваць розныя пытанні:*

*— І як там у вас? Ці ёсць друкарні? Ці выдаюцца кнігі? Ці чытаюць іх?*

*— У нас няма чалавека, які не ведаў бы граматы, — напышлівы кактус Пундзік працягваў трымаць марку вучонага перад самім Скарынам. — Кніг за гэты час выдадзена столькі, што чалавеку і жыцця не хопіць, каб іх прачытаць.*

*У галаве Францыска Скарыны з цяжкасцю ўкладвалася, як яго цярністы шлях першадрукара праб’е сабе шырокую дарогу да асветы. Яго акрыліла тое, што праз стагоддзі кніга — скарбніца ведаў — стане даступная кожнаму. Сваім лепшым сябрам назавуць кнігу дзеці. Значыць, усе яго старанні не марныя.*

## Пра што кніга

Дзеянне кнігі адбываецца ў Станькаўскім маёнтку графа Эмерыка. Яго дачка Альжбэта разам з сяброўкай Яіцкай, садоўнікам Алоўкам, труской Ружачкай, варонай Карылай і кактусам Пундзікам падарожнічаюць у часе з дапамогай чароўнай шкатулкі. Аднойчы вясёлая кампанія аказваецца ў пачатку XVI стагоддзя — у друкарні Францыска Скарыны…

## Азбукі з Пецярбурга на ўсіх не хапіла

Для юных чытачоў сабралі казкі на любы густ.

Ля стэнда выдавецтваў Пецярбурга дзеці тоўпіліся каля маляўнічага альбома “Казачная азбука”. Кожная літара — сапраўдны твор мастацтва, у якой зашыфравана руская казка: Л — “Лісічка-сястрычка”, Х — “Хаўрошачка”, Ц — “Царэўна-жаба”. Вымалёўвала чароўныя літары знакамітая мастачка Таццяна Маўрына. Жадаючых набыць шэдэўр аказалася так многа, што асобнікаў на ўсіх не хапіла.

Маленькія чытачы былі ў захапленні ад тэатралізаванага прадстаўлення беларускай пісьменніцы Алены Масла. Аўтар знаёміла дзятву са сваёй казкай “Мяне завуць Лахнэска” пра прыгоды дыназаўрыка, які пасяліўся ў беларускай сажалцы.

Хлопцы і дзяўчаты старэйшыя спяшаліся на сустрэчу з вядомымі пісьменнікамі Андрэем Жвалеўскім і Яўгеніяй Пастэрнак — многія ўжо паспелі прачытаць іх апошнюю кнігу “Пакуль я на краі” і прыйшлі падзяліцца з аўтарамі ўражаннямі.

Некаторыя паклоннікі прыехалі ў Мінск непасрэдна з Масквы.

У перапынках паміж прэзентацыямі дзятва са здзіўленнем разглядала драўляны друкаваны станок. Узнавіў яго па старажытных чарцяжах і гравюрах (без адзінага цвіка!) гісторык Уладзімір Ліхадзедаў. Кожны жадаючы мог пабыць у ролі першадрукара і “надрукаваць” старонку са скарынаўскай Біблііі.

Ірына **Мустафіна**



БЕЛТА





# Дарогі вядуць у Оршу



## Старажытнаму гораду амаль дзесяць стагоддзяў. Ён стаіць на Дняпры, у які ўпадае рака Оршыца.

### Убачыць усходнія вароты Беларусі

Орша — буйны транспартны вузел напрамкаў Расія — Еўропа — Украіна. Не дзіўна, што па дарозе на Маскву ў Айчынную вайну 1812 года тут кватараваў Напалеон. Камендантам горада тады ён прызначыў Мары-Анры Бейля, у будучыні — гэта вялікі пісьменнік Стэндаль.

Чыгуначны вакзал у Оршы адкрылі ў 1871 годзе. Будынак занесены ў Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Каля станцыі — два помнікі "чыгуначнай" тэматыкі. Герою Савецкага Саюза, падпольшчыку, камандзіру партызанскай брыгады Канстанціну Заслонаву. Некалькі гадоў да вайны быў начальнікам мясцовага паравознага дэпо. Другі — легендарнаму савецкаму паравозу П-36.

## Зазірнуць да езуітаў

Езуіцкі калегіум у 1612 годзе заснаваў канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега. У манастырскай школе грамаце вучылі дзяцей, не зважаючы на паходжанне. Праз 230 гадоў будынкі калегіі аддалі пад гарадскую турму. "Астрог" закрылі толькі ў 1990 годзе.

Сёння архітэктурны помнік у стылі барока адноўлены. Акрамя знешняга аблічча, яму вярнулі і першапачатковае прызначэнне — быць культурным і адукацыйным цэнтрам. Цяпер у ім папулярнае сярод гараджан і турыстаў кафэ, дзіцячая бібліятэка, музейны комплекс, мастацкая галерэя і Дом рамёстваў. Тут турысты "завісаюць" надоўга: дзе яшчэ можна купіць такія эксклюзіўныя рэчы з ільну па цэнах вытворцы. У Оршы працуе ледзь не самы буйны ў свеце льнокамбінат!

## Пакруціць кола вадзянога млына

Будынак з чырвонай цэглы прыцягвае ўвагу адразу. Гэта псеўдаготыка з элементамі псеўдарускага стылю. Млын стаіць на штучным канале. У свой час быў вельмі магутны — з вадзяным рухавіком 50 конскіх сіл. Цяпер тут этнаграфічны музей "Млын".

Сярод экспанатаў — вырабы з керамікі, прадметы побыту, лён, прылады працы пачатку XIX стагоддзя.

Праз дарогу — старажытнае гарадзішча, помнік археалогіі XI стагоддзя. З гэтага месца пачаліся жыццё ды гісторыя горада. Яго любяць усе, асабліва фатографы і мастакі.

## Пачытаць буквар

Орша — горад манастыроў і цэркваў. Любімая гараджанамі — Ільінская царква, якой ужо пяцьсот гадоў. Тут захоўваецца і галоўная святыня — Аршанская ікона Божай Маці. Паводле падання, яна цудоўным чынам з'явілася пры заснаванні Куцеінскай лаўры. У ёй у XVII стагоддзі быў адзін з цэнтраў беларускага кнігадрукавання.

Самая вядомая кніга — "Буквар" Спірыдона Собаля. Адсюль ён і распаўсюдзіўся па ўсім свеце. У гонар яго нядаўна ўсталявалі помнік — тытульны ліст унікальнай кнігі ў мармуры.

Оршу праславіў не толькі Спірыдон Собаль. Сярод ураджэнцаў горада — шматразовы чэмпіён свету па канькабежным спорце Ігар Жалязоўскі ды класік беларускай літаратуры Уладзімір Караткевіч. На беразе Дняпра, на месцы згарэлага дома, дзе нарадзіўся пісьменнік, цяпер стаіць помнік.

## Успомніць легендарную "кацюшу"

У гісторыю Вялікай Айчыннай вайны Орша ўвайшла як горад, дзе 14 ліпеня 1941 года першым залпам пра сябе заявіў гвардзейскі рэактыўны мінамёт з пяшчотным жаночым іменем "кацюша". Батарэя капітана Флёрава накрыла некалькі нямецкіх чыгуначных саставаў, якія ішлі на Маскву.

Праз 25 гадоў з'явіўся мемарыяльны комплекс "За нашу Савецкую Радзіму!" у гонар легендарнай гарматы.

Вольга **Кручанкова**



Помнік "кацюшы", якая зрабіла свой першы залп па ворагу

ВІТАЛІЙ ГІЛЬ




БЕЛТА



# Сапраўдны рэнесанс жанру

**Фартэпіянны дуэт — ансамбль з найбольш цікавых і ў сваім родзе ўнікальны. Бо рэдкі выпадак, калі ўдваіх іграюць музыканты адной спецыяльнасці. І, мабыць, адзіны — калі двое маюць магчымасць музіцыраваць за адным інструментам.**



Сумеснай творчасці салістаў Беларускай дзяржаўнай філармоніі Наталлі Котавай і Валерыя Баравікова ўжо амаль 20 гадоў. Яны — вядучы канцэртуючы дуэт піяністаў краіны, які добра вядомы і за яе межамі. З мэтрамі і падзвіжнікамі ўнікальнага жанру мы гутарым пра асаблівасці ігры ў чатыры рукі.

***— Дуэт музыкантаў — гэта яшчэ і сваяцтва душ, тонкае ўзаемадзеянне.***

**Наталля:** Як правіла, у навучальных установах піяністаў рыхтуюць як салістаў, індывідуалаў, а тут даводзіцца дзяліць папалам і музыку, якую іграем, і ўвагу публікі. Гэта складана, але і прыемна, таму што такія творчыя зносіны, супрацоўніцтва з калегамі вельмі цікавыя. У дуэце, як, напэўна, і ў любым ансамблі, акрамя сыгранасці, ёсць вельмі важны момант — як разумеюць адзін аднаго ўдзельнікі і ці разумеюць наогул. У дуэце, як і ў сям'і: сумеснае даўгалецце тады, калі пара глядзіць у адзін бок, у адным кірунку.

**Валерый:** Вельмі важна не ісці тупа на голы прынцып, маўляў, ты нічога не разумееш, а своечасова партнёру саступіць. Можа, ён і сам зразумее потым, што памыляўся. А можа, і ты будзеш мець магчымасць пераканацца, што дарма на сваім настойваў. Павага, паразуменне і прафесійныя, і чыста чалавечыя проста неабходныя. Інакш усё немінуча будзе чутна ў музыцы і дуэта не атрымаецца. Нават калі абое салісты — выдатныя выканаўцы.

***— Наталля прыйшла ў дуэт выпускніцай кансерваторыі, калі Валерый быў ужо даволі вопытным салістам. Агульную мову знайшлі адразу?***

**Валерый:** Так. І, ведаючы многія іншыя дуэты, — гэта рэдкі выпадак. Па першым часе мы занадта шмат саступалі адзін аднаму, і правільна, што так рабілі. Трэба было вычакаць нейкі час, каб абаім праявіцца і зразумець, наколькі мы зможам суіснаваць у музыцы.

**Наталля:** Фартэпіянны дуэт у філармоніі існуе з 1980 года. Валерый Баравікоў — адзін з яго заснавальнікаў і нязменны ўдзельнік,


У дуэце піяністы Наталля Котава і Валерый Баравікоў каля 20 гадоў

а яго транскрыпцыі для двух фартэпіяна атрымалі высокую ацэнку выканаўцаў і кампазітараў у многіх краінах свету. Таму, калі я ў 1998-м прыйшла ў гэты маленькі, але ўсё ж калектыў, то проста, расхінуўшы вочы і вушы, прагна ўпітвала ўсё новае. Нейкага адрыньвання або непрымання не было ніводнага дня. Канфліктных сітуацый у нас і цяпер не бывае. Інакш мы столькі часу не ігралі б разам.

***— Няўжо ніколі пра густы не спрачаецеся і разбораў палётаў не бывае?***

**Валерый:** Вядома, нейкія прафесійныя пытанні вырашаем, але ніколі не пераходзім межы выхаванасці. Дый гэта не спрэчкі, а, хутчэй, сумесны пошук патрэбнага рашэння. Пасля канцэртаў — абменьваемся ўражаннямі, але без разборак. Кожны ведае, што і як адбывалася на сцэне — чаго ўжо душу трывожыць пасля? Што пройдзена, то пройдзена — бяром на заметку і ідзём далей.

***— Разам вы практычна штодзень — на рэпетыцыях, канцэртах, выязных выступленнях. Дамашнія не раўнуюць?***

**Наталля:** Гэта ж наша праца, з разуменнем ставяцца. У нас і дуэт неканфліктны, і дамашнія — таксама.

***— Вы выступаеце ў філармачнічных залах, іграючы на двух канцэртных раялях, але ведаю, што частыя госці вы і ў невялікіх гарадах, а там на сцэне можа быць адно старэнькае піяніна.***

**Наталля:** Сапраўды, мы шмат ездзім па краіне і часта менавіта так бывае. Вядома, два раялі — для музыкантаў вальней, камфортней, а для публікі эфектней. За адным фартэпіяна не заўсёды зручна, але можна выдатна іграць у чатыры рукі. Прыходзіцца часам іграць і на інструментах не лепшай якасці. Але мы абсалютна не цураемся гэтага. Бо галоўнае — сустрэча і размова з гледачамі. Асветніцтва — частка нашай працы. Наша мэта — захапіць музыкай і зрабіць так, каб далучэнне да яе было цікавым. Для гэтага мы заўсёды карэкціруем свае праграмы ў залежнасці ад таго, хто сядзіць у зале — дзеці, моладзь або дарослыя. І вельмі прыемна, што знаходзім водгук, сустракаюць нашы выступленні, як правіла, захоплена.

**Валерый:** Дарэчы, жанр фартэпіяннага дуэта сёння надзвычай папулярны. Напэўна, няма музычнай школы, дзе не было б аднаго або двух такіх ансамбляў, іграюць і педагогі, і дзеці. Дый канцэртуючых дуэтаў становіцца больш. Заўважаны сапраўдны рэнесанс жанру.

Ірына **Свірко**

# Кантыненты пад купалам цырка

**Мінскаму міжнароднаму фестывалю цыркавога мастацтва быць: ён пройдзе ў верасні ў беларускай сталіцы**

— Вырашылі пайсці па прынцыпе Алімпійскіх гульняў: у нас будуць прадстаўлены ўсе кантыненты, — расказаў мастацкі кіраўнік Белдзяржцырка Вітаўтас Грыгалюнас. — Ужо вядзём перагаворы з рознымі краінамі. Прыемна, што многія пахвальна адзываюцца пра нашу арэну і з радасцю прымаюць запрашэнні.

Хто будзе прадстаўляць нашу краіну на фестывалі, пакуль не вырашана. Сярод артыстаў аб'яўлены конкурс, які і адкажа на гэтае пытанне. "Выступіць дастойнейшы", — упэўнена кіраўніцтва, бо беларусам давядзецца паўстаць перад вачыма міжнароднага журы. Увайсці ў яго склад ужо пагадзіліся некалькі легендарных артыстаў з сусветнай вядомасцю. Будзе і грамадскае журы, якое складаецца з высокіх чыноўнікаў і проста вядомых людзей, іх місія — паглядзець на шоу вачыма неспрактыкаванага гледача. Дарэчы, прыз сімпатый гледачоў таксама будзе. Сваё меркаванне выкажа і дзіцячае журы. Золата, срэбра і бронза будуць асобна раздадзены сольным выканаўцам і артыстам, якія выконваюць групавыя практыкаванні.

На днях жа ў Белдзяржцырку пачалася новая праграма "Шоу гіганцкіх фантанаў. Дзіўны горад".





# Творы, якія ўражваюць не толькі сваім выглядам

**Абсалютна не будзе перабольшаннем сцвярджэнне аб тым, што ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі ёсць што паглядзець сапраўдным знатакам — і ў пастаяннай экспазіцыі, і на рэгулярна праводзімых выставах, калі ўвазе наведвальнікаў прадстаўляюцца лепшыя работы з музейных запаснікаў. Вось і ў нашым цыкле публікацый мы імкнёмся расказаць пра сапраўдныя шэдэўры беларускага і сусветнага выяўленчага мастацтва, убачаныя ў галоўным музеі краіны. Сёння — працяг цыкла, пачатак якому быў пакладзены ў папярэднім нумары нашага часопіса.**

Толькі ў пэўнай ступені захаваем храналогію творчасці — нам больш значным будзе сам прадмет агляду і яго прадстаўленне ў музеі сёння.

Джульета беларускага Сярэднявечча. Так называлі адну з самых вядомых і загадкавых жанчын Барбару Радзівіл, чый каларытны партрэт адкрывае выставу “Радзівілы: лёс краіны і роду” ў Нацыянальным мастацкім музеі. Усяго ўнікальная экспазіцыя налічвае каля ста экспанатаў, якія раскрываюць гісторыю роду знакамітых каралёў без кароны: жывапісныя і графічныя партрэты, мініяцюры, медалі, мастацкія тканіны. Такі падарунак зрабіў музею Мацей Радзівіл. Выставу ў Мінску ён растлумачыў імкненнем нагадаць беларусам іх гісторыю. У праекце прадстаўлена галерэя вобразаў вядомых дзеячаў: Барбара Радзівіл — каралева Польшчы і яе бацька — Юрый Радзівіл, Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка — заснавальнік Нясвіжскай рэзідэнцыі, яго брат Юрый — кардынал, кракаўскі епіскап, і іншыя. Безумоўная каштоўнасць калекцыі ў тым, што некаторыя партрэтныя вобразы, магчыма, захаваліся ў адзіным асобніку. У экспазіцыі прадстаўлены і сапраўдныя рэліквіі. Напрыклад, слуцкі пояс даўжынёй амаль чатыры метры і дэкаратыўная тканіна “маката”, зробленая на слуцкай радзівілаўскай мануфактуры. А карціна “Паляванне ў Нясвіжы з удзелам кронпрынца Вільгельма” з тых, што асацыююцца ў Мацея з дзяцінствам:

— У бабуліным доме заўсёды збіралася шмат гасцей. І ў мяне была магчымасць мець зносіны з людзьмі, якія нарадзіліся ў XIX стагоддзі. Дзякуючы ім я стаў цікавіцца гісторыяй не толькі свайго роду, але і іншых.



*Усяго унікальная экспазіцыя “Радзівілы: лёсы краіны і роду” налічвае каля ста экспанатаў, якія раскрываюць гісторыю роду знакамітых каралёў без кароны*



Юрый Пэн. “Домік з козачкай”

Сёння Мацей Радзівіл імкнецца захапіць гэтым дзяцей — у яго іх пяцёра. У распараджэнні князя некалькі сотняў фатаграфій партрэтаў Радзівілаў з Беларусі, Украіны, Літвы. Мацей Радзівіл расказаў, што плануе выдаць сямейны альбом, дзе кожнае фота будзе суправаджацца кароткімі біяграфічнымі звесткамі.

Пэўны этап у развіцці выяўленчага мастацтва Беларусі звязаны з адкрыццём у горадзе Віцебску ў 1897 годзе першай прыватнай школы жывапісу Юрыя Пэна (1854-1937), ураджэнца Літвы, выпускніка Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў. Школа Пэна праіснавала 20 гадоў і дала асновы першапачатковай мастацкай адукацыі шматлікім мастакам, такім як Саламон Юдовін, Міхаіл Лейтман, Хаім Ліўшыц і Марк Шагал. Многія працы Юрыя Пэна напоўнены вялікай колькасцю канкрэтных бытавых прымет. Так, нягледзячы на нейкі фантасмагарычны характар “Доміка з козачкай”, прадстаўленага ў пастаяннай экспазіцыі ў Нацыянальным мастацкім музеі, цалкам пазнаецца рэальны матыў кутка ўскраіны Віцебска з яго закінутымі драўлянымі домікамі, перададзенымі на кардоне пры дапамозе прыёмаў дэфармацыі і ўтрыравання, дапоўнены вобразамі жывёл-атрыбутаў беларускага гарадка таго часу.

Лічыцца, што гэты твор створаны не без уздзеяння эстэтыкі і паэтыкі Марка Шагала, аднаго з самых яркіх вучняў майстра. Гэта як бы “варыяцыя на тэму Шагала”, але з большай прыземленасцю, вялікай колькасцю канкрэтных бытавых прымет яўрэйскага і беларускага жыцця, што ўласціва менавіта Пэну — побач з “домікам з козачкай” стаіць “домік са свінкай”.

У зборы музея ёсць працы так званых караваджыстаў — паслядоўнікаў вялікага італьянскага мастака Мікеланджэла Мерэзі да Караваджа, у творчасці якога галоўным становіцца чалавек, ахоплены зямнымі страсцямі, поўны ўнутранага драматызму. Найбольш яркі прыклад — карціна венецыянскага мастака Антоніа Дзанкі “Выкрыццё Адысея”, напісаная на сюжэт міфалагічнага падання, якое расказвае пра грэчаскага цара вострава Ітака Адысея. Аказваецца, Адысей хацеў ухіліцца ад удзелу ў Траянскай вайне, не жадаючы пакідаць свой дом і сына Тэлемаха, які толькі што нарадзіўся. Ён прыкінуўся вар’ятам: у прысутнасці грэчаскіх правадыроў, якія прыехалі прызваць яго на вайну, стаў араць поле і засяваць яго соллю. Паламед, разгадаўшы гэтую хітрасць, паклаў у разору перад плугам маленькага Тэлемаха. Адысею прыйшлося спыніцца, прызнаца ў падмане і паехаць на доўгія гады на вайну. Мастак выкарыстоўвае характэрныя для караваджызму стылістычныя прыёмы: рэзкі кантраст глыбокага чорнага ценю і яркага светлавога струменя, які накіроўваецца знізу і як бы выхоплівае з цемры твары (так званы эфект “склепавага асвятлення”), узмацняючы драматычную напружанасць падзей; узятыя буйным планам фігуры, ушчыльную набліжаныя да гледача



Антоніа Дзанкі. "Выкрыццё Адысея"



Ганна Разіна Лішэўска. "Партрэт Міхала Казіміра Агінскага" (1755)

і напісаныя з усёй пластычнасцю, матэрыяльнасцю. Варта адзначыць і ўласцівы караваджызму бытавы характар вобразаў — персанажаў міфалагічнага падання, спецыфічную "мужыкаватасць" тыпажоў.

А вось Яўген Лансерэ — адзін са значных скульптараў Расіі другой паловы XIX стагоддзя, які працаваў у рэалістычным напрамку. Стварыў шэраг кампазіцый як у дробнай пластыцы, так і ў формах, блізкіх да манументальных, якія адрозніваюцца адданасцю натуры, увагай да дэталяў, філіграннасцю аздаблення. У музеі ёсць шматфігурная кампазіцыя "Данскія казакі-фуражыры", створаная майстрам у 1878 годзе. Як відаць, падставай да з'яўлення дадзенай скульптуры стаў адзін з эпізодаў руска-турэцкай вайны — пераход рускіх войскаў праз раку Дунай у 1877 годзе, за якім была вайсковая аперацыя, што перашкодзіла туркам захапіць Чарнагорыю.

Сучаснік скульптара, рускі мастацкі крытык Уладзімір Стасаў бачыць адлюстраваную жывапісную сцэну як эпізод аднаго вялікага аповеду: данскія казакі-фуражыры, "нагружаныя ўсялякай здабычай, вядома, якая дасталася з дапамогай бізуноў, шабель і кулакоў, самі цяпер ціхамірна поясь сваіх коней, са сваімі ціхімі, лагоднымі, спакойнымі, паўкалмыцкімі тварамі". Несумненна, перад намі адзін з лепшых твораў Яўгена Лансерэ, у якім усе дэталі і штрыхі, перададзеныя з дакументальнай дакладнасцю, падпарадкаваны адзінаму мастацкаму вобразу, які падкупляе сваёй паэтычнасцю і праўдай.

У сярэдзіне XVIII стагоддзя Дрэздэн стаў значным мастацкім цэнтрам Еўропы. На чале Акадэміі мастацтваў у гэты час стаяў вядомы французскі мастак Луі Сільвестр. Побач з ім працавалі таленавітыя мясцовыя мастакі, якія пісалі партрэты польскай і саксонскай знаці. Да ліку такіх мастакоў належыць і папулярная ў гэты час дрэздэнская мастачка Ганна Разіна Лішэўска.

Кампазітар і мецэнат, стваральнік опернага тэатра і капэлы ў Слоніме, першы будаўнік Агінскага канала, чалавек, імя якога непарыўна звязана з культурай Беларусі, Міхал Казімір Агінскі (1730-1800) прадстаўлены ў Нацыянальным мастацкім музеі на партрэце як палкаводзец — ён займаў пасады генерала міліцыі літоўскай, быў палкоўнікам каралеўскім і ваяводам віленскім. Вялікія памеры палатна, тэатральнасць і дэкаратыўнасць кампазіцыі, урачыстасць і велічнасць паставы як мага лепш адпавядаюць зместу партрэта — праслаўленню ваеннай доблесці партрэтуемага.

У канцы XIX стагоддзя ў многіх беларускіх гарадах з'явіліся культурна-асветніцкія таварыствы, якія па-іншаму называліся таварыствамі аматараў выяўленчага мастацтва і музыкі. Іх мэтай стала збліжэнне мясцовых дзеячаў літаратуры і мастацтва, а таксама распаўсюджванне адукацыі і мастацтва сярод



Яўген Лансерэ. "Данскія казакі-фуражыры"



Фердынанд Рушчыц. “Ля касцёла” (1899)



У музейным асяроддзі. Ля фрагмента слуцкага пояса

насельніцтва. У развіцці мастацкай адукацыі ўдзел прымалі выпускнікі Санкт-Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў. Напрыклад, у Мінску выкладаў малюнак Ермакоў, у якога першыя ўрокі атрымлівае Фердынанд Рушчыц — яркі пейзажыст рубяжа стагоддзяў.

У 1902 годзе, быўшы ў зеніце славы і прызнання ў Расіі, Рушчыц раптам парывае з Пецярбургам. Ужо даўно ён адчувае сваю ўзрослую адчужанасць у асяроддзі піцерскай арыстакратычнай эліты і часта задумваецца пра сваё месца ў жыцці як мастака. У дзённіку ён напіша: “Я выпрабаваў сябе, я доўга пазіраў крытычным поглядам на тое, што было наша, і нарэшце палюбіў наша мінулае, нашу айчыну. Я адчуў сябе яе сынам і зведваю ў дачыненні да яе пачуццё абавязку”. І ўжо ў наступным годзе ён вярнуўся на радзіму. Пасля работы ў Варшаве ён становіцца першым дэканам факультэта мастацтваў у зноў адкрытым Віленскім універсітэце і працуе там з 1919 па 1932 год.

Асновай творчага натхнення для мастака была яго родная зямля — маёнтак Багданава і яго наваколлі. На пейзажы “Ля касцёла” 1899 года якраз адлюстраваны касцёл і званіца ў вёсцы Багданава, якая належала Рушчыцам. Да гэтага матыву мастак звяртаўся не раз. Праца завяршае ранні перыяд у творчасці  Рушчыца. Тут ужо адчуваецца яго імкненне да манументальнасці: мастак выбірае нізкі далягляд і нізкі пункт погляду, і атрымліваецца, што наш погляд накіраваны знізу ўверх — гэта дае манументальнасць. Прастора ў карціне свядома пабудавана так, каб наш погляд не мог засяродзіцца на дзеянні перад касцёлам. Заціснутыя паміж званіцай і касцёлам, не выпушчаныя ў прастору за касцёльным дваром, мы шукаем кропку спакою, і знаходзім яго ў небе. Кампазіцыя і колеравае вырашэнне карціны створаны так, каб дамінантай пейзажа стала ярка-сіняе вясновае неба, па якім плывуць нізкія белыя кучавыя аблокі. Менавіта яны задаюць рытм і рух пейзажу, становяцца акцэнтам, месцам прыцягнення. Экспрэсіўная манера жывапісу, трактоўка матыву аблокаў, па духу і па манеры набліжаюць гэты пейзаж да экспрэсіяністычнага напрамку ў жывапісе.

У экспазіцыі знаходзяцца ўзоры мануфактурнай вытворчасці Беларусі XVIII стагоддзя — фрагменты знакамітых слуцкіх паясоў. На жаль, Нацыянальны мастацкі музей не мае суцэльных твораў. У вітрынах прадстаўлены два фрагменты розных паясоў і два арнаты — каталіцкае адзенне, дзе ў цэнтральную частку ўшыты паясы. Слуцкія паясы прызнаныя ва ўсім свеце як нацыянальная рэліквія беларускага народа. Па-майстэрску вытканыя шэдэўры ручнога ткацтва ствараліся на працягу сярэдзіны XVIII — першай паловы XIX стагоддзя.

Паясы былі важнай часткай мужчынскага касцюма, служылі сімвалам узроўню ўлады і багацця яго ўладальніка.

У XVII-XVIII стагоддзях шаўковыя паясы з залатымі і срэбнымі ніткамі становяцца моднай дэталлю касцюма вышэйшага і сярэдняга саслоўя як у Еўропе, так і ў Расіі. Узорнымі лічылі вырабы майстроў з Асманскай імперыі, Персіі, Ірана, Кітая. Прывазныя паясы былі рэдкія і дарагія, таму ўзнікла неабходнасць стварэння мясцовых мануфактур — “персіярняў” — па вытворчасці такіх рэчаў.

Высокі ўзровень майстэрства беларускіх ткачоў стаў рашаючым для князя Міхала Казіміра Радзівіла пры выбары асноўнага месца вытворчасці паясоў. У 1758 годзе ён запрасіў з горада Станіслава (Украіна) ткача Яна Маджарскага для работы спачатку на Нясвіжскай, а пасля — Слуцкай мануфактуры. Майстар родам са Стамбула, перанёс у Рэч Паспалітую ўсходнюю традыцыю вырабу шаўковых паясоў і навучаў свайму мастацтву мясцовых ткачоў. Паясы рабілі ў выглядзе палотнішча даўжынёй ад двух да пяці метраў. У залежнасці ад колькасці металічных нітак, паясы дзяліліся на літыя, напаўлітыя і простыя.

У пастаяннай экспазіцыі знаходзіцца фрагмент пояса з вытканай назвай горада (у градзе Слуцку) і іменем уладальніка мануфактуры ў той перыяд — Леа Маджарскага. У яго каларыстычнай гаме пераважаюць тонкія адценні жамчужнага колеру, бледна-ружовыя, бэжавыя, блакітнаватыя тоны.

Развіты мастацкі густ, прыроднае пачуццё колеру, кампазіцыйная гармонія слуцкіх паясоў ставяць іх у адзін шэраг з найвышэйшымі дасягненнямі сусветнай мастацкай культуры.


Ля карціны М. Савіцкага "Партызанская Мадонна Мінская"

Міхаіл Савіцкі — значная і легендарная фігура ў беларускім мастацтве. Вядомасць і папулярнасць да мастака прыйшлі ў 1960-я гады і былі звязаны з новым поглядам на ваенную тэму ў выяўленчым мастацтве. Сам удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, пасля цяжкіх выпрабаванняў (абарона Севастопаля і палон у канцлагерах) Савіцкі выбірае прафесію мастака, вучыцца ў Мінскім мастацкім вучылішчы і Маскоўскім інстытуце імя Сурыкава. Тэма вайны ў яго творчасці становіцца цэнтральнай, перш за ўсё ён імкнецца паказаць і расказаць у сваіх працах пра жахі вайны, пра тыя нечалавечыя выпрабаванні, якія выпалі на долю людзей у перыяд Другой сусветнай вайны. Яго працы "Партызаны" і "Віцебскія вароты" паказваюць рэальныя падзеі вайны ў алегарычным вырашэнні, дзе галоўныя героі — звычайныя людзі, якія прымаюць рашэнні і спрабуюць выжыць у суровых ваенных умовах. "Віцебскія вароты" — гэта своеасаблівае Ладажскае возера на тэрыторыі Беларусі, сцежка жыцця на акупаванай тэрыторыі, якую ахоўвала брыгада партызан Бацькі Міная. Бежанцы — жанчыны з дзецьмі, старыя, параненыя воіны — адыхо-дзяць ад зарыва вайны.

У карціне "Партызанская Мадонна Мінская" мастак звяртаецца да вечнага сімвала жыцця — мацярынства. У аснове кампазіцыі ляжыць вядомая карціна эпохі Адраджэння Рафаэля "Сікстынская мадонна", толькі замест біблейскіх персанажаў мастак адлюстроўвае простых людзей, сведак чумы XX стагоддзя — фашызму. У сваёй творчасці Савіцкі распрацаваў новую канцэпцыю гуманізму — гуманізм чалавека, які перажыў вайну, які добра разумее цану чалавечага жыцця і ўсведамляе, якая тонкая грань разбурэння свету. Гэта становіцца асноўным маніфестам мастака: ніколі нельга забываць пра самую страшную катастрофу чалавецтва — вайну, якой заўсёды супрацьпастаўляецца жыццё...

Да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве (1955 год) Валянцін Волкаў (1881-1964) скончыў вялікую карціну, якая стала "візітнай карткай" мастака — "Мінск 3 ліпеня 1944 года". Вядома, што яшчэ ў сакавіку 1945 года Волкаў заключыў пагадненне на стварэнне палатна для фае залы пасяджэнняў Дома Саветаў, што шмат у чым абумовіла памеры і фармат твора. Мастак працаваў над карцінай каля 10 гадоў, стварыў больш за 220 падрыхтоўчых малюнкаў, 11 эскізаў кампазіцыі, каля 50 эцюдаў.

Для твора пазіравалі суседзі майстра, салдаты Беларускай ваеннай акругі, сваякі (у тым ліку жонка Валянціна Волкава і яго сын Анатоль, таксама мастак). Кожная дзеючая асоба надзелена выразнай характарыстыкай і адпавядае агульнай мэце. На палатне паказаны адзін з эпізодаў вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, заснаваны на ўражаннях жывапісца — Волкаў сам бачыў, як жыхары горада сустракалі савецкія войскі. Пры стварэнні карціны ён надаў гэтай падзеі рысы трыумфальнасці, адлюстраваў сучасную яму падзею, выкарыстоўваючы прыёмы класічнага жывапісу, што невыпадкова для выхаванца пецярбургскай акадэмічнай школы. Кампазіцыя палатна пабудавана на аснове класічнага прынцыпу ўрастання малых трохвугольнікаў у асноўны трохвугольнік, у які ўпісваецца ўсё дзеянне.

Мастак дакладна перадаў адчуванне шчасця, якім былі ахоплены жыхары Мінска ў тую сонечную ліпеньскую раніцу, вітаючы салдат-вызваліцеляў. Карціна "Мінск 3 ліпеня 1944 года" — гэта адзін з самых дасканалых твораў Валянціна Волкава. Работа займае асаблівае месца ў мастацтве Беларусі, з'яўляючыся своеасаблівай эмблемай Перамогі і радасці вызвалення роднага горада і краіны.

Веніямін **Міхееў**


"Мінск 3 ліпеня 1944 года" В. Волкава не можа не ўражваць


БЕЛТА

Слуцкі пояс